**МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ І ХАРЧАВАННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**Установа адукацыі «БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АГРАРНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ»**

**Кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін**

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ І ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

**Вучэбна-метадычны комплекс**

**Мінск, 2016**

УДК
ББК
Г

Рэкамендавана навукова-метадычным саветам аграмеханічнага факультэта БДАТУ (пратакол № 1 ад 22.09.2016)

Аўтарскі калектыў:
загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Я.А. Грэбень; старшы выкладчык С.В. Мяньчэня; старшы выкладчык І.В. Падзерава, старшы выкладчык Н.У. Супрон; старшы выкладчык А.Г. Трубчык

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Плавінскі М.А.
кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага Інстытута Вышэйшай Школы

БДАТУ, 2016

**ЗМЕСТ**

**Раздзел 1. Беларусь: краіна і людзі.**

**1.1. Беларускі этнас: гісторыя фарміравання і сучасны стан** (Мяньчэня С.В.)

1.1.1. Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў.
1.1.2. Фарміраванне беларускай народнасці. паходжанне назвы “Белая Русь”.
1.1.3. Умовы фарміравання беларускай нацыі.
1.1.4. Сучасны стан і перспектывы развіцця беларускага грамадства.

**1.2. Беларусь: геаграфічнае становішча і прыродныя каштоўнасці** (Мяньчэня С.В., Падзерава І.В.)

1.2.1. Геаграфічнае становішча Беларусі.
1.2.2. Помнікі прыроды і прыродныя рэсурсы Беларусі.
1.2.3. Ахова прыроды: заканадаўства, тэорыя і практыка.

**1.3. Менталітэт беларусаў і беларуская мова як духоўна-культурная каштоўнасць** (Трубчык А.Г.)

1.3.1. Асноўныя рысы нацыянальнага характару і менталітэту беларусаў.
1.3.2. Гістарычны шлях беларускай мовы.
1.3.3. Беларуская мова ва ўмовах глабалізацыйных працэсаў.

**1.4. Гістарычная памяць і роля асобы ў гісторыі** (Мяньчэня С.В., Трубчык А.Г.)

1.4.1. Роля гістарычнай памяці ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці.
1.4.2. Славутыя імёны Беларусі.

**Раздзел 2. Сістэма светапогляду, жыццёвых арыенціраў і маральных каштоўнасцей беларускага грамадства**

**2.1. Сістэма светапогляду, жыццёвых арыенціраў і маральных каштоўнасцей беларускага грамадства** (Мяньчэня С.В., Супрон Н.У.)

2.1.1. Асаблівасці дахрысціянскага і хрысціянскага сярэднявечнага светапогляду.
2.1.2. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі перыяду Адраджэння і Рэфармацыі.
2.1.3. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі перыяду Контррэфармацыі і Асветніцтва.

2.1.4. Асноўныя накірункі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі сярэдзіны XIX – XX стагоддзяў
2.1.5. Сістэма маральных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства.

## Раздзел 3. Умовы фарміравання і захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі

**3.1. Гісторыка-культурныя каштоўнасці Беларусі** (Мяньчэня С.В.)

3.1.1. Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі.
3.1.2. Праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

**3.2. Роля этнаканфесійнага фактара ў фарміраванні гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа** (Грэбень Я.А.)

3.2.1. Уплыў рэлігіі на духоўнае і культурнае развіццё беларускага народа.
3.2.2. Міжэтнічныя адносіны ў Беларусі і праблема захаванення нацыянальнай ідэнтычнасці.

**3.3. Беларуская культура ў сусветным кантэксце** (Трубчык А.Г.)

3.3.1. Беларускае замежжа.
3.3.2. Уклад беларусаў у сусветную культуру.

# Раздзел 1. Беларусь: краіна і людзі

## 1.1. Беларускі этнас: гісторыя фарміравання і сучасны стан

### 1.1.1. Асноўныя канцэпцыі паходжання беларусаў

У гістарычнай навуцы дзеля вызначэння народа, як устойлівай супольнасці ўжываецца тэрмін “этнас”.

Этнас – устойлівая супольнасць людзей, якая гістарычна склалася на пэўнай тэрыторыі і характарызуецца агульнасцю мовы, культуры, побыту, рысаў псіхікі і самасвядомасці, адлюстраванай у адзінай назве і ўяўленнях пра агульнасць паходжання.

Галоўнай умовай існавання любога этнасу з`яўляецца тэрыторыя яго пражывання. Этнічная тэрыторыя – гэта тэрыторыя кампактнага рассялення пэўнага народа, з якой цесна звязаны яго этнагенез і этнічная гісторыя. Этнічная тэрыторыя характарызуецца значнай устойлівасцю на працягу многіх стагоддзяў, але пры гэтым практычна ніколі не супадае з тэрыторыяй палітычнай (дзяржаўнай).

Кампанентам этнічнай сістэмы з`яўляецца культура, якую прынята падзяляць на матэрыяльную і духоўную. Матэрыяльная культура – аб`екты, створаныя чалавекам, якія матэрыяльна існуюць у прасторы ў пэўны часовы прамежак (прылады працы, жытло і гаспадарчыя пабудовы, зброя, адзенне, упрыгожанні, а таксама культурныя расліны і ахатненыя жывѐлы).

Духоўная культура – прадукт дзейнасці калектыўнай (індывідуальнай) свядомасці і розуму: рэлігія (вераванні); мастацтва; веды. Кожны з раздзелаў адыгрываў сваю ролю на пэўным этапе гістарычнага развіцця.

У фармаванні любой этнічнай культуры надзвычай важную ролю адыгрывае мова этнасу, якая, перш за ўсѐ, спрыяе пачуццю групавой ідэнтычнасці. Агульная мова падтрымлівае высокі ўзровень кансалідацыі этнічнай супольнасці, у першую чаргу, дзякуючы ўзаемаразуменню. Мова ўвасабляе агульныя веды людзей пра свае традыцыі, у ёй матэрыялізуецца гістарычная памяць народа. І нарэшце, мова – гэта складаная знакавая сістэма, з дапамогай якой адбываецца перадача інфармацыі, якая захоўвае калектыўны вопыт этнасу.

У выпадку частковай ці поўнай моўнай асіміляцыі народа (беларусы, ірландцы), этнічная культура губляе не толькі свой непаўторны каларыт, але і страчвае значныя магчымасці для творчай самарэалізацыі.

Важнейшым кампанентам этнічнай сістэмы з`яўляецца этнічная самасвядомасць – усведамленне людзьмі сваёй прыналежнасці да пэўнага этнасу. У шэрагу выпадкаў, калі моўная ідэнтычнасць народа парушана, менавіта этнічная самасвядомасць пачынае адыгрываць галоўную этнавызначальную ролю. На розных гістарычных стадыях развіцця беларусаў этнічная самасвядомасць выяўлялася неаднолькава. Да прыкладу, у эпоху феадалізму прадстаўнікі розных саслоўяў усведамлялі сваю прыналежнасць па-рознаму. Этнічная свядомасць пануючых класаў часта замянялася

саслоўнай самасвядомасцю (шляхецкі народ), у простага люду – лакальна-тэрытарыяльнай (палешукі), зямляцкай (палачане, тураўцы), канфесіянальнай — людзі — рускай (праваслаўнай) ці — польскай (каталіцкай) веры). Агульнабеларускай этнічная самасвядомасць становіцца толькі ў другой палове XIX – пачатку XX стст. і практычна супадае з часам складвання беларускай нацыі, пра што сведчыць пашырэнне на ўсю тэрыторыю краіны этноніма беларусы.

Вызначаюць наступныя формы этнонімаў. Эндаэтнонім – саманазва народа; яна характарызуецца найбольшай гістарычнай устойлівасцю і трываласцю. Экзаэтнонім – назва, дадзеная народу іншымі, як правіла суседнімі этнасамі, якая можа абсалютна не супадаць з саманазвай канкрэтнага этнасу.

Палітонім – назва народаў паводле іх дзяржаўна-палітычнай прыналежнасці («ліцвін» – выхадзец з Вялікага княства Літоўскага; «маскаль» – прадстаўнік Маскоўскага княства і г.д.). На сучасным этапе вельмі часта супадае з этнонімам (жыхар Беларусі – беларус).

Псеўдаэтнонім складваецца на падставе этнічных стэрэатыпаў – суб’ектыўных, максімальна абагульненых, эмацыйна афарбаваных вобразаў, якія сведчаць аб асаблівасцях знешняга выгляду, маўлення, ці кулінарных густах пэўнага народа.

Кожны этнас праходзіць некалькі стадыяў развіцця, якія адрозніваюцца ступенню і прынцыпамі адзінства людзей. Агульнапрынятымі стадыямі развіцця народа з’яўляюцца: племя, народнасць, нацыя.

Племя – першая этнічная супольнасць у гісторыі чалавецтва, узнікшая ў першабытную эпоху (эпоху развітага родавага грамадства). Спачатку складалася з некалькіх родаў і груп, і валодала найбольшай устойлівасцю, максімальным адзінствам мовы і культуры.

Народнасць – першая этнічная супольнасць класавага грамадства, якая ўзнікла на аснове змешвання і зліцця розных плямѐнаў, аб’яднаных не толькі па кроўна-сваяцкіх прыкметах, але і па тэрытарыяльна-суседскіх. У працэсе складвання народнасці вялікую ролю адыгрывалі адзіная дзяржаўнасць, этнагенетычная роднасць насельніцтва, што спрыяла фарміраванню агульнай этнічнай тэрыторыі, мовы, самасвядомасці, пэўнага культурнага і эканамічнага адзінства.

На Беларусі працэс фарміравання народнасці пачаўся ў канцы I тыс.н.э. з пераходам славяна-балцкага насельніцтва ад першабытнаабшчыннага ладу да феадальных адносін і быў звязаны з этнакансалідацыйнымі працэсамі ў Полацкім княстве, насельніцтва якога характарызавалася агульнай этнічнай самасвядомасцю (этнонім палачане), моўным адзінствам, падабенствам культуры.

Нацыя – на сённяшні дзень вышэйшая форма этнічнай супольнасці людзей, гістарычна склаўшаяся на базе зліцця ранніх форм родных ці не родных этнічных супольнасцяў (плямён, народнасцяў). Кожная нацыя абавязкова мае ўласны механізм трансляцыі этнакультурнай інфармацыі. Ён уключае народную асвету, мастацкую культуру і сродкі масавай інфармацыі,

якія выкарыстоўваюць уніфікаваны сродак зносін – навукова апрацаваную, кадыфікаваную літаратурную мову. Уздзеянне нацыянальнага камунікатыўнага механізму прыводзіць да распаўсюджвання агульнаэтнічнай нацыянальнай самасвядомасці, якая арыентуе сваіх носьбітаў пераважна на культурныя каштоўнасці сваёй нацыі. Характэрнай рысай нацыі з'яўляецца наяўнасць дзяржаўнасці, ці руху накіраванага на яе стварэнне. Згодна з дзяржаўным прынцыпам вызначаецца тэрмін тытульная нацыя – нацыя, якая мае дзяржаўнасць, што носіць яе імя. Напрыклад, тытульнай нацыяй Беларусі з'яўляюцца беларусы.

Праблема паходжання народа і распрацоўка адпаведнай канцэпцыі з'яўляецца асновай нацыі, адказвае за яе ўзаемаадносіны і сувязі з іншымі народамі. У канцы XVIII – пач. XIX стст. узніклі дзве канцэнцыі, якія адмаўлялі самастойнае існаванне беларускага этнаса. Ідэолагі "вялікапольскай" канцэпцыі лічылі беларусаў часткай польскага этнасу, а беларускую мову – дыялектам польскай. У адказ ім прыхільнікі "вялікарускай" канцэпцыі называлі беларусаў часткай рускага народу, які доўгі час знаходзіўся пад уплывам палякаў, з гэтай прычыны і мясцовая "руская мова" назапасіла значную колькасць паланізмаў. Адмаўлялася самастойнасць беларускага этнаса і прыхільнікамі "заходнерускай" канцэпцыі, якія выступалі з тэзісам аб трыадзінстве рускага народа. Рускі этнас, на думку заходнерусістаў, складаецца з вялікарусаў (уласна рускіх), заходнерусаў (беларусаў) і маларосаў (украінцаў). Частка ідэолагаў заходнерусізму прызнавала асобную беларускую мову і культуру, аднак лічыла, што з цягам часу гэтыя асаблівасці павінны знікнуць.

У канцы XIX ст. фарміруюцца племянныя канцэпцыі паходжання беларусаў, якія ўжо не ставяць пад сумнеў самастойнасць беларусаў як асобнай этнічнай супольнасці. М. Пагодзін і В. Ластоўскі лічылі продкамі беларусаў крывічоў. Аднак крывічы займалі толькі частку этнічнай тэрыторыі Беларусі. Крывічы, дрыгавічы і радзімічы адыгралі велізарную ролю ў айчыннай гісторыі. Па гэтаму некаторыя вучоныя (Я. Карскі, У. Пічэта, М. Доўнар-Запольскі, М. Грынблат) нават лічылі, што яны былі непасрэднымі продкамі беларускага народа. У прыватнасці, М Грынблат звяртае ўвагу на традыцыйныя земляробчыя прылады і асаблівасці гаворак у розных рэгіёнах Беларусі. На яго думку, саха з перакладной паліцай і "аканне" першапачаткова былі характэрны для крывічоў, а палеская саха і дыфтонгі ўо, іе на поўдні з'яўляліся элементамі культуры і мовы дрыгавічоў.

Акрамя **крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкай**, існуюць і іншыя канцэпцыі паходжання беларусаў. Згодна з **фінскай** канцэпцыяй (яе аўтар І. Ласкоў), продкамі беларускага народа былі славяне і фіны. У якасці доказу ён спасылаецца на тое, што некаторыя назвы беларускіх рэчак і азёр, напрыклад Дзвіна, Мардва, Свір, фінскага паходжання. Прыхільнікі **балцкай** канцэпцыі (В. Сядоў, Г. Штыхаў) лічаць, што продкамі беларусаў з'яўляюцца славяне і балты. Яны спасылаюцца на назвы беларускіх рэчак і азёр балцкага паходжання (Арэса, Клёва, Рэста і інш.), сцвярджаюць, што пра балтаў як продкаў беларусаў сведчаць некаторыя элементы традыцыйнай беларускай

культуры і мовы (культ вужа, жаночы галаўны ўбор намітка, цвёрды гук “р” і інш.). Тыя, хто прытрымлваецца **старажытнарускай** канцэпцыі паходжання беларускага народа (Я. Карнейчык і інш.), сцвярджаюць, што продкам беларусаў была адна з частак так званай старажытнарускай народнасці. Вялікае значэнне яны надаюць існаванню ў мінулым старажытнай дзяржавы Русі, а потым яе распаду, а таксама назве старажытнарускай усходнеславянскай мовы (рускай) і элементам старажытнай культуры (напрыклад, былінам).

Найбольш абгрунтаванай і падцверджанай шматлікім этнаграфічным, археалагічным, антрапалагічным, лінгвістычным матэрыялам, пісьмовымі крыніцамі з’яўляецца канцэпцыя **М.Ф. Піліпенкі**, які лічыць, што асноўнымі продкамі сучасных беларусаў былі групы насельніцтва, якія жылі ў нашым краі пасля таго, як зніклі крывічы, дрыгавічы і радзімічы. Імі сталі перш за ўсё насельнікі басейнаў рэк Дняпра і Заходняй Дзвіны і старажытныя палешукі, якія знаходзіліся ў Папрыпяцці. Першыя сфарміраваліся ў выніку трансфармацыі крывічоў, вяцічаў і паўночнай часткі радзімічаў, а другія – дрыгавічоў, драўлян і паўднёвых радзімічаў.

Старажытныя палешукі і днепра-дзвінцы мелі агульную назву “русіны”. Яны адрозніваліся ад крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў новымі рысамі культуры і мовы. У жыхароў падзвіна-дняпроўскага рэгіёна была пашырана саха з перакладной паліцай, гумны прамавугольнай формы. У іх гаворцы ўзнікла “аканне” (вымаўленне галоснага гука “о” не пад націскам як “а”), а таксама “дзеканне” (зычны гук “д” сталі вымаўляць мякчэй). Характэрнымі рысамі культуры старажытных палешукоў з’яўляліся палеская саха, многавугольныя гумны, развітая фрома каравайнага абраду, зімовае навагодняе свята Каляды. У гаворцы старажытных палешукоў гукі “р” і “ч” пачалі вымаўляцца цвёрда.

У фарміраванні культуры і мовы старажытнага насельніцтва беларускіх зямель пераважалі эвалюцыйныя працэсы. Фанетыка беларускай мовы ўзнікла шляхам злучэння некаторых рыс гутарковай мовы папрыпяцкага насельніцтва, з аднаго боку, і падзвінскага – з другога. Яно спачатку адбылося ў цэнтральным рэгіёне – панёманскіх і падняпроўскіх землях, а потым праз цэнтральны рэгіён пашырылася далей у паўднёвыя і паўночныя часткі краю. З поўдня (Папрыпяцця) на поўнач (Падзвінне) распаўсюдзіліся цвёрдыя “р” і “ч”, а з поўначы на поўдзень – мяккі “д” (“дзеканне”), а таксама “аканне”. Узаемапранікненню культурных і моўных з’яў садзейнічалі таксама перасяленні як і неўсходнеславянскіх груп: заходнеславянскага (польскага), балцкага, цюркскага (татарскага) насельніцтва.

### 1.1.2. Фарміраванне беларускай народнасці. Паходжанне назвы “Белая Русь”

Этнагенез беларусаў цесна звязаны з палітычнай гісторыяй края. Ён адбываўся як у час існавання старажытных княстваў – Полацкага і Тураўскага, так і ў перыяд утварэння новай дзяржавы – Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага.

Розныя меркаванні існуюць у сучаснай навуковай літаратуры і наконт паходжання назвы “Белая Русь”. Ніводнае з іх не мае пераканаўчай перавагі. Сёння можна вызначыць больш-менш акрэслена толькі яе палітычна-геаграфічны змест, у якім не падлягае сумненню гістарычная сувязь паміж тэрмінамі – “Русь” і “Белая Русь”. Даследчыкі розных часоў звязвалі гэты тэрмін з мноствам снега, ільняным адзеннем белага колеру, белявымі валасамі. Некаторыя атаесамляюць тэрмін “белы” з незалежнасцю, якую беларускія землі здолелі захаваць у выніку мангола-татарскага нашэсця, ці з хрысціянскай верай, супрацьпастаўляючы яе “чорнай” – язычніцкай. Але больш даставернай з навуковага погляду з’яўляецца суаднясенне тэрміну “белы” з усходнім накірункам. Адначасова з тэрмінам “Белая Русь” існавалі “Чырвоная” (Кіеўская зямля і Галіцка-Валынскае княства) і “Чорная” (звязваецца з тэрыторыяй Гродзеншчыны і Берасцейшчыны). Такім чынам, верагодна тэрмін “Белая Русь” першапачаткова датычыўся усходняй часткі Русі.

У большасці польскіх і заходнееўрапейскіх крыніц XIV – сярэдзіны XVI ст. паняцце “Белая Русь” атаясамліваецца з тэрыторыяй, якая ахоплівае галоўным чынам Паўночна-Усходнюю (Уладзіміра-Суздальскае княства) ці Паўночна-Заходнюю Русь (Наўгародска-Пскоўскія землі і інш.). У рускіх летапісах XV ст. “Белая Русь” таксама нярэдка звязваецца з тэрыторыяй “Вялікай Маскоўскай Русі”. З сярэдзіны XVI ст. у крыніцах усё больш выразна прасочваюцца ўяўленні аб Белай Русі як адасобленай уласна беларускай ці беларуска-ўкраінскай і часткова рускай тэрыторыі. Першае згадванне назвы “Белая Русь” самімі беларусамі ў дачыненні да этнічнай тэрыторыі беларусаў дакументальна зафіксавана ў 1592 г.

Фарміраванне беларускага этнасу пачалося ў канцы XIII ст. і завяршылася ў асноўным у XVI ст. На працягу гэтага часу пераважна ў межах сучаснай Беларусі пастутова складваліся і замацоўваліся эканамічныя, культурныя, моўныя і іншыя асаблівасці тагачаснага насельніцтва, якое склала беларускі этнас. У дадзены перыяд паступова фарміравалася і этнічная тэрыторыя беларусаў. Знешнія абрысы этнічнай тэрыторыі беларусаў у асноўным сфарміраваліся ўжо ў XIV – XV стст. Этнічная мяжа паміж этнаграфічнымі Літвой і Беларуссю, якая ўсталявалася яшчэ да XIII ст. прыкладна па лініі Мерач – Ашмяны – воз. Свір, у наступныя тры стагоддзі амаль не змянілася. У поліэтнічнай сталіцы ВКЛ – Вільні, беларусы складалі значную частку гараджан.

Пасля Крэўскай уніі 1385 г. у асноўным усталявалася заходняя мяжа Беларусі з Польшчай. Але тут таксама меўся вельмі спецыфічны рэгіён поліэтнічнага насельніцтва (беларусы, палякі, літоўцы, яцвягі, украінцы) – заходняе Падляшша, якое прымыкала да Гарадзенскай і Берасцейскай зямель. Дзяржаўныя граніцы Кароны і ВКЛ у Падляшшы не былі дакладна акрэслены да Люблінскай уніі 1569 г.

Паўднёвы рэгіён Беларусі – Палессе – быў геаграфічна размежаваны з Украінай па басейну ракі Прыпяць з яе паўднёвымі прытокамі.

Найбольш зменлівымі ў XIV – XVI стст. былі ўсходнія межы ВКЛ. Тут у перыяд максімальнага пашырэння ВКЛ у яго уваходзілі бранскія, смаленскія і некаторыя іншыя землі. Таму насельніцтва гэтых княстваў было часова ўцягнута ў этнічныя працэсы, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі.

Важнейшай палітычнай умовай для фарміравання беларускага этнасу з'явілася знаходжанне зямель Беларусі ў складзе ВКЛ і ўдзел беларусаў у яго развіцці. Спачатку, у канцы XIII – XIV ст., значную ролю ў кансалідацыі беларускага этнасу адыграла пэўная самастойнасць (аўтаномія) у рамках ВКЛ Полацкага, Віцебскага і іншых княстваў на ўсходзе Беларусі. З узмацненнем цэнтралізацыі ВКЛ у часы Вітаўта (пачатак XV ст.) гэтыя фактары страцілі сваё былое значэнне. Цяпер галоўным у дадзеным працэсе стала тое, што ВКЛ ператварылася ў адну з самых магутных дзяржаў Еўропы, якая магла забяспечыць неабходныя ўмовы для развіцця ўсіх этнічных супольнасцей ВКЛ, у тым ліку і для беларускага этнасу. У некаторых землях ВКЛ часам зараджаліся сепаратысцкія тэндэнцыі, звычайна абумоўленыя асобнымі інтарэсамі мясцовых феадалаў, асабліва тых, хто быў звязаны роднасцю з правячай дынастыяй. Але такія праявы сепаратызму мелі месца больш у пачатковы перыяд ВКЛ і ў далейшым з узмацненнем цэнтральнай улады сталі рэдкай з'явай.

Галоўнай умовай існавання і жыццядзейнасці любога народа з'яўляецца яго здольнасць да ўзнаўлення матэрыяльных каштоўнасцей і самога народанасельніцтва, якое магчыма толькі пры прагрэсіўным развіцці гаспадаркі і паступальным удасканаленні сацыяльных адносін у грамадстве. Менавіта прагрэс у сельскай гаспадарцы і рамястве ў беларускіх землях у XIV – XVI стст. стаў той эканамічнай асновай, на якой адбывалася фарміраванне беларускага этнасу.

У XIV – XVI стст. на тэрыторыі Беларусі назіралася паступовае разбурэнне натуральнага характару сельскай гаспадаркі. Яна ўсё больш уцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны, паміж вёскай і горадам устанаўліваліся больш шырокія гандлёвыя сувязі. Вакол буйных гарадоў складваліся рынкі, на якіх адбываўся гандаль таварамі сельскай і рамеснай вытворчасці не толькі бліжэйшых, але і значна аддаленых раёнаў Беларусі. У XV – XVI стст. у Беларусі прыкметна пашырылася сетка сухапутных дарог, якія садзейнічалі паляпшэнню гандлёвых кантактаў паміж землямі Беларусі. У выніку на аснове грамадскага падзелу працы паміж горадам і вёскай, пашырэння цесных сувязей паміж імі, а таксама рознымі

рэгіёнамі Беларусі паступова складваліся агульныя рысы гаспадарчаq дзейнасці беларускага насельніцтва.

Адначасова адбывалася складванне саслоўна-класавай структуры беларускага грамадства. Да сярэдзіны XVI ст. усе асноўныя класы і саслоўі (феадалы – шляхта, духавенства, гараджане – мяшчане, сялянства) беларускага этнасу дасягнулі ўзроўню сталага феадальнага грамадства. Правы шляхецкага саслоўя знайшлі афармленне ў Статутах ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг., мяшчан – у магдэбургскіх граматах на самакіраванне гарадоў.

Працэс фарміравання этнічнай самасвядомасці беларусаў быў складаным і больш доўгім па часе, чым складванне агульных тэрытарыяльных, эканамічных, культурных рыс беларускага этнасу. Усведамленне сваёй адметнасці ад іншых усходнеславянскіх народаў у беларусаў расцягнулася на некалькі стагоддзяў.

Асноўнай саманазвай насельніцтва Беларусі ў XIII – XVIII стст. з’яўляўся тэрмін: “русін”, “рускі люд”, “рускі народ”. “Бібліяй Рускай” назваў свае выданні Францыск Скарына, прызначаючы іх для ўсіх беларусаў. Разам з тым для беларусаў у той час была характэрна і так званая мясцовая (“зямляцкая”) самасвядомасць (“палачанін”, “віцяблянін”, “магілёвец” і г.д.). Асаблівасцю ў фарміраванні этнічнай самасвядомасці беларусаў было тое, што сялянства і значная частка мяшчанства, дробнай шляхты, духавенства больш моцна, чым феадальная знаць, трымалася сваіх каранёў у культуры, побыце, у сферы царкоўна-рэлігійных традыцый.

Нарэшце, самасвядомасць менавіта гэтай часткі насельніцтва Беларусі дазволіла захаваць беларускі этнас у часы цяжкіх выпрабаванняў другой паловы XVII – XVIII ст., калі ўзмацніўся працэс паланізацыі беларусаў.

У сучаснай гістарычнай літаратуры сустракаюцца меркаванні, што беларусы, асабліва заходніх раёнаў Беларусі, часам называлі сябе “ліцвінамі” ў этнічным сэнсе. Але вельмі часта сябе называлі “ліцвінамі” тыя, хто па розных прычынах знаходзіўся за мяжой (у сэнсе “жыхар Вялікага княства Літоўскага”). З другой паловы XVI ст. “ліцвінамі” нярэдка называлі ўсю шляхту Беларусі і Літвы, незалежна ад яе этнічнага паходжання. Памылковым з’яўляецца сцвярджэнне, што быццам насельніцтва Беларусі пачало называць сябе «беларусамі» ледзве не з XIII – XIV стст. У сапраўднасці, толькі з XVI ст. у некаторых мясцовых крыніцах сустракаецца назва вельмі блізкая да сучаснай – “беларусцы” (у некаторых дакументах можна сустрэць назву – “ліцвіны-беларусцы”.) Такім чынам, можна сцвярджаць, што назва “беларусцы” мела тэрытарыяльны або канфесійны характар. Фарміраванне беларускага этнасу ў XIV – XVI стст. выявілася таксама ў складванні своеасаблівага характару, псіхічнага складу, ментальнасці беларусаў.

Такім чынам, па сукупнасці асноўных этнавызначальных адзнак (этнічная тэрыторыя, гаспадарчы ўклад, своеасаблівая культура, мова, асаблівасці характару, псіхічнага складу) можна пераканаўча гаварыць аб тым, што на працягу XIV – XVI стст. на землях Беларусі склалася

новая супольнасць людзей – беларускі народ. У гэты ж час пэўную сталасць набыла этнічная самасвядомасць беларусаў, хаця дадзены працэс яшчэ не быў завершаны. За той перыяд, што Беларусь знаходзілася ў складзе ВКЛ, беларускі народ прайшоў значны шлях у сваім пастурпальным развіцці. Для тагачаснага беларускага грамадства былі характэрны даволі развітая гаспадарка, выразна акрэслены падзел на класы-саслоўі, своеасаблівая і багатая культура.

Але далейшае этнічнае развіццё беларусаў у XVII – сярэдзіне XVIII стст. праходзіла ўжо ў іншых і вельмі складаных сацыяльна-палітычных, эканамічных і культурных умовах новага дзяржаўнага ўтварэння – Рэчы Паспалітай. У гэты перыяд, адзначаны шматлікімі войнамі, эпідэміямі і іншымі ўзрушэннямі, магчымасці развіцця беларускага этнасу былі ў значнай ступені абмежаваны. У гісторыі ВКЛ дадзены перыяд характарызуецца нарастаючымі праявамі крызісу дзяржаўна-палітычнага ладу, абвастрэннем сацыяльна-саслоўных адносін, адступленнямі ад талерантнасці ў царкоўна-рэлігійнай палітыцы, амаль поўным выцясненнем беларускай мовы і пісьменнасці з асноўных сфер палітычнага і дзяржаўнага справаводства. Тым не менш, нягледзячы на ўсё гэта, беларускі народ (найперш сяляне, мяшчане, частка шляхты і духавенства) здолеў выстаяць і захаваць свае асноўныя этнічныя рысы (мову, культуру, рэлігійныя традыцыі і г. д.).

### 1.1.3. Умовы фарміравання беларускай нацыі

Працэс фарміравання беларускай нацыі вызначыўся асаблівасцямі і характарам сацыяльна-эканамічнага развіцця, палітыкай расійскага ўрада, традыцыйнымі рысамі нацыянальна-культурнага развіцця і іншымі фактарамі. Праз шэраг складаных этапаў у сваёй эвалюцыі этнагенез беларусаў у XIX ст. і на пачатку XX ст. паскорыўся і выйшаў на стадыю фарміравання нацыі. Існаванне нацыі адзначалася наяўнасцю наступных рыс: агульнасцю тэрыторыі і эканамічнага жыцця, супольных рыс нацыянальнага характару, культуры і літаратурнай мовы.

Асноўная тэрыторыя беларусаў уваходзіла ў межы пяці губерняў – Віленскай, Гродзенскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай. Колькасць насельніцтва, паводле першага ўсерасійскага перапісу 1897 г., у сучасных межах Беларусі складала 6 млн. 387 тыс. чалавек. Удзельная вага прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці перавышала 73 %. Каля 90 % прадстаўнікоў беларускага этнасу жылі ў сельскай мясцовасці. Каля 40 – 50 % гарадскога і мястэчковага насельніцтва складалі яўрэі (гэта з’яўлялася вынікам існавання ў 10 заходніх губернях мяжы яўрэйскай аселасці), 20 % гараджан былі рускімі. Беларусы сярод гарадскога насельніцтва складалі 17,1 %.

Паскарэнне пасля рэформы 1861 г. тэмпаў эканамічнага развіцця, пашырэнне капіталістычнага прадпрымальніцтва ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, развіццё гандлю і шляхоў зносін, інтэнсіўнае чыгуначнае

будаўніцтва спрыялі стварэнню на тэрыторыі Беларусі адзінага эканамічнага рэгіёну і станаўленню беларускай нацыі.

Значнай перашкодай на шляху фарміравання беларускай нацыі пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. стала афіцыйная ідэалогія заходнерусізму. **Заходнерусізм** – канцэпцыя адмаўлення гістарычнасці беларусаў як самастойнай і самабытнай этнічнай адзінкі, атаясамленне іх з вялікарускім этнасам, была распрацавана ў сярэдзіне XIX ст. праваслаўнымі дзеячамі І. Сямашкай, М. Каяловічам. Галоўны ідэолаг гэтага руху – Міхаіл Каяловіч. Сярод праваслаўных папулярнай была ідэя заходнерусізму, вельмі блізкая да царскай дактрыны расійскага народа, які складалі “велікарусы” (рускія), “маларосы” (украінцы) і “заходнерусы” (беларусы). Паводле Каяловіча, палякамі лічыліся ўсе каталікі, што жылі на Беларусі. Не дапускаў Каяловіч магчымасці ўзнікнення нацыянальнай катэгорыі беларусаў-каталікоў. Тыя беларусы якія перайшлі ў каталіцтва, самі адракліся ад сваёй нацыянальнасці і сталі палякамі. Заходнерусізм меў пэўны ўплыў на творчасць беларускіх вучоных, дзеячаў культуры з рускамоўнага навуковага і культурнага асяроддзя.

Заходнерусізм паспрыяў таму, што каталіцкія эліты перасталі думаць пра Беларусь ў катэгорыях традыцыі Рэчы Паспалітай, і тым самым стаў прычынай адарвання беларускай ідэі ад псіхалагічна-культурнага польскага кантэксту. Такім чынам, насуперак неспрыяльным умовам фарміраванне беларускай нацыі ў агульных рысах завяршылася да пачатку XX ст. Напрыканцы XIX ст. з’явілася новае пакаленне беларускай інтэлігенцыі, нацыянальная свядомасць якога склалася пераважна не ў выніку працяглых роздумаў, а праз выхаванне.

Станаўленне буржуазнага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX стст. мела ў Беларусі шэраг спецыфічных рыс. Забарона яўрэям сяліцца па-за межамі гарадоў і мястэчак, эканамічная слабасць гарадоў, немагчымасць знайсці ў іх працу для шматлікіх беззямельных і малазямельных сялян, стрымліванне разлажэння памешчыкага землеўладання адмоўна адбілася на ўтварэнні класаў буржуазнага грамадства, дэфармавала склад гарадскога насельніцтва і ў канчатковым выніку стрымлівала фарміраванне беларускай нацыі. Пры гэтым беларуская нацыянальная буржуазія знаходзілася на стадыі станаўлення і ўяўляла найбольш слабую праслойку мясцовай шматнацыянальнай буржуазіі. Асноўныя капіталы краю знаходзіліся ў руках рускіх і апалячаных памешчыкаў, яўрэйскіх банкіраў, купцоў і прамыслоўцаў. Беларуская аграрная буржуазія, будучы падзеленая па канфесійнай прыкмеце (каталікі і праваслаўныя) не ўсвядамляла свайго нацыянальнага адзінства і абыякава ставілася да праблемаў беларускага нацыянальнага руху. Наогул канфесійны падзел на каталікаў і праваслаўных адмоўна адбіўся на фарміраванні беларускай нацыі. Слабасць нацыянальнай эканамічнай эліты (буржуазіі і дваранства), а таксама рэпрэсіі з боку расійскага ўраду (высылкі з тэрыторыі Беларусі недабранадзейных), адсутнасць вышэйшых навучальных устаноў і г.д. сталі прычынай нешматлікасці і павольнага фарміравання нацыянальнай

інтэлігенцыі. Эліта беларускага грамадства фактычна не дарасла да асэнсавання сваіх асобных ад расійскай рэчаіснасці ці польскай ідэі дзяржаўна-палітычных ідэалаў. Адной з асаблівасцяў беларускай інтэлігенцыі была страта пераемнасці паміж рознымі яе пакаленнямі, з-за прычын перш за ўсё палітычнага характару. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы (паланізацыя і русіфікацыя) ужо ў першай палове XIX ст. з'явілася кола інтэлігентаў, якім быў уласцівы "краёвы". па сутнасці беларускі, патрыятызм. Гэта былі прафесары Віленскага ўніверсітэта І. Анацэвіч, М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Лабойкі, а таксама філаматы – Я. Чачот, Т. Зан і інш. У сярэдзіне XIX ст. адчувальным становіцца ўплыў беларускай ліберальнай думкі, прадстаўленай гурткамі А. Кіркора, В. Дуніна-Марцінкевіча, А. Вярыгі-Дарэўскага. Творчасць і погляды гэтага кола інтэлігенцыі не заўсёды мелі акрэслены нацыянальны змест, але аб'ектыўна садзейнічалі развіццю нацыянальнай культуры і нацыянальнай самасвядомасці. У 60-я гг. XIX ст. сфарміравалася адносна невялікая група, для якой было абсалютна зразумелым уяўленне, што Беларусь мае ўсе ўмовы для самастойнага развіцця. Лідэрам гэтай групы быў К. Каліноўскі. Таксама вялікае значэнне для фарміраання нацыянальнай самасвядомасці была дзейнасць шматлікіх збіральнікаў і даследчыкаў беларускага фальклору, лінгвістаў, этнографаў, гісторыкаў. У другой палове XIX ст. з'явіліся грунтоўныя працы І. Насовіча, М. Нікіфароўскага, Е. Раманава. Асаблівае значэнне мела трохтомнае даследаванне Я. Карскага "Беларусы".

У апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. тэрмін "Беларусь" замацаваўся за ўсёй этнічнай тэрыторыяй беларусаў. Аднак саманазва беларусаў не набыла яшчэ выразнага агульнанацыянальнага зместу. Адначасова з гэтай саманазвай ужываліся канфесіянізмы "рускія" і "палякі" адпаведна падзелу на праваслаўных і католікаў. Частка насельніцтва працягвала называць сябе "тутэйшымі". Тым не менш, паводле дадзеных перапісу 1897 г. аб роднай мове, 51,8 % агульнай колькасці прадстаўнікоў спадчыннага дваранства прызнавалі сябе беларусамі. З ліку асабістых дваран (у асноўным чыноўнікі) 25,9 % назвалі сваёй роднай мовай беларускую. Роднай прызнавалі беларускую мову 20 % урачоў, 60 % настаўнікаў і г.д. Сялянства і пралетарыят пераважна складаліся з карэннага беларускага насельніцтва.

У XIX – пачатку XX стст. працягнулася станаўленне новай беларускай літаратурнай мовы. Яе фарміраванне пераважна адбывалася ў жанрах мастацкай літаратуры і публіцыстыкі.

Працэс развіцця нацыі праявіўся ў нацыянальным руху. Беларускі нацыянальны рух развіваўся паміж спрэчкамі польскіх і расійскіх шавіністаў за панаванне на тэрыторыі краю. Глыбокія якасныя змены ў нацыянальным руху адбыліся ў час рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Са з'яўленнем беларускамоўнага друку (газеты "Наша доля" і "Наша ніва"), пашырэннем прафесійных, грамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў (Беларускі настаўніцкі саюз, Беларускі музычна-драматычны гурток і г.д.), заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі розныя формы і кірункі беларускага нацыянальнага руху.

Нягледзячы на неспрыяльныя дзяржаўна-палітычныя ўмовы, спецыфічную этна-сацыяльную сітуацыю, фарміраванне беларускай нацыі на пачатку XX ст. у агульных рысах завяршылася.

### 1.1.4. Сучасны стан і перспектывы развіцця беларускага грамадства

XX стагоддзе стала часам выпрабавання для беларускай нацыі. З аднаго боку беларусы здолелі ажыццявіць ідэю нацыянальнай дзяржаўнасці. Першыя крокі ў гэтым накірунку былі пакладзены I Усебеларускім з’ездам (1917 г.), што прыввяло да абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі (1918 г.), а затым і беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. З 1991 г. Рэспубліка Беларусь становіцца самастойным суб’ектам палітыкі. Аднак гэтаму папярэднічалі катаклізмы Першай і Другой сусветных войн, савецкіх палітычных рэпрэсій 1930 – 1940-х гг., якія значна паўплывалі не толькі на колькасны склад насельніцтва Беларусі, але і на яго сацыяльны і нацыянальны склад. Гэтыя падзеі адбіліся і на ўзроўні этнічнай самасвядомасці беларусаў.

З 1994 г., калі насельніцтва краіны дасягнула 10 млн 24 тыс. чал., у Беларусі адзначаецца выміраньне жыхароў (дэпапуляцыя). За гэты час насельніцтва паменшылася на 786,4 тыс. Гэта раўнасільна таму, што Беларусь страціла два абласныя цэнтры краіны — Гомеля і Брэста, і вярнулася да узроўня 1978 г. Пры гэтым доля сельскага насельніцтва скарацілася на 644 тысячы (–21 %), а колькасць гарадскога насельніцтва працягвала расці. Доля гараджанаў у агульнай колькасьці насельніцтва ўзрасла з 69 % да 74 %. Далейшы рост гэтага дызбаланса пагражае і эканамічнаму развіццю краіны – пад пагрозай забяспечанасць кадрамі агра-прамысловага комплексу і эканамічная бяспека краіны.

Грамадзяне Беларусі да гэтага часу не разглядаюць незалежнасць краіны, як адну з найважнейшых каштоўнасцяў. Але ў той жа час 83,7 % насельніцтва краіны называюць сябе беларусамі (перапіс 2009 г.). З 1999 да 2009 г. болей чым на 20 пунктаў (з 73 % да 53 %) знізілася доля жыхароў, чыя родная мова была беларускай, і на 14 пунктаў (з 37 % да 23 %) стала менш беларускамоўных. Разам з гэтым назіраецца пэўны нацыянальны нігілізм, калі праблемы нацыянальна-культурнага адраджэння сталі разглядацца як другасныя і неабавязковыя ў параўнанні з праблемамі пераадолення сацыяльна-эканамічнага крызіса.

Аднак апошнім часам інтарэс да нацыянальнай культуры, асабліва сярод маладога пакалення, пачаў расці. Гэта дазваляе меркаваць, што фіналісцкі сцэнарый развіцця беларускай нацыі (паступовае яе знікненне праз знікненне такіх кампанентаў этнічнай сістэмы як мова, культура і самасвядомасць) з’яўляецца перабольшаннем. Станаўленне і ўмацаванне інстытутаў незалежнай беларускай дзяржавы, уваходжанне ў актыўнае грамадска-палітычнае і культурнае жыццѐ краіны маладых пакаленняў беларусаў, якія абралі ў якасці светапоглядных прыярытэтаў агульнадэмакратычныя і нацыянальныя каштоўнасці, гарантуе ў будучым

сапраўднае адраджэнне і паступальнае прагрэсіўнае развіццё беларускай нацыянальнай супольнасці.

## 1.2. Беларусь: геаграфічнае становішча і прыродныя каштоўнасці

### 1.2.1. Геаграфічнае становішча Беларусі

Рэспубліка Беларусь размешчана ва ўсходняй частцы Еўропы. На Захадзе з ёй мяжуе Польшча, на паўночным захадзе – Літва, на поўначы – Латвія, на паўночным усходзе і ўсходзе – Расія, на поўдні – Украіна. Беларусь складаецца з шасці абласцей: Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай. Сталіца Беларусі – горад Мінск, які з'яўляецца найбуйнейшым палітычным, эканамічным, навуковым і культурным цэнтрам рэспублікі. Тэрыторыя Беларусі складае 207,6 тыс. км$^2$. Працягласць з захаду на ўсход – 650 км, з поўначы на поўдзень – 560 км. Паводле памеру тэрыторыі Беларусь большая, чым, напрыклад, Бельгія, Партугалія, Нідэрланды, Чэхія, Грэцыя, Аўстрыя.

Клімат Беларусі – умерана-кантынентальны, з мяккай і вільготнай зімой, цёплым летам, сырой восенню. Сярэдняя тэмпература студзеня ад -4°С да -8°С, ліпеня ад +17°С да +19°С. Кліматычныя ўмовы спрыяльныя для вырошчвання асноўных зерневых культур, гародніны, пладовых дрэваў і кустоў і асабліва для культывацыі бульбы і льну.

Рэльеф Беларусі пераважна раўнінна-пагоркавы. Сярэдняя вышыня над узроўнем мора – 160 м. Вышэйшая кропка Беларусі – гара Дзяржынская (да 1958 г. – гара Святая) – 345 м; ніжэйшая – даліна ракі Нёман на поўнач ад Гродна – 90 м над узроўнем мора. 45 % тэрыторыі займаюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі, 36 % – лясы. Найбольш лясістай мясцовасцю з’яўляюцца Расонскі (Віцебская вобласць) і Лельчыцкі (Гомельская вобласць) раёны. Плошча лясоў тут складае 67 % і 66,5 % адпаведна. Найменш лесу на тэрыторыі Нясвіжскага раёна (Мінская вобласць) – 11,4 %.

Беларусь багатая на паверхневыя воды, у краіне налічваецца каля 20800 рэк. Большасць рэк невялікія, 42 ракі маюць даўжыню ад 100 да 500 км. Гушчыня рачной сеткі складае прыкладна 40 км/км$^2$, на паўночным усходзе Беларусі 60 км/км$^2$. Самыя працяглыя і мнагаводныя рэкі Дняпро, Заходняя Дзвіна, Нёман, Прыпяць. Рачную сетку дапаўняюць штучныя каналы: Агінскі, Аўгустоўскі, Бярэзінская водная сістэма, Дняпроўска-Бугскі.

Беларусь часта называюць "сінявокай" з-за вялікай колькасці азёр: іх у Беларусі налічваецца каля 11 тыс. Агульная іх плошча каля 2 тыс. км$^2$, агульны аб'ём вады каля 6 км$^3$. Азёр плошчай больш за 10 км$^2$ налічваецца 20. Самае вялікае па плошчы возера Нарач (79,6 км$^2$), самае глыбокае — Доўгае возера (глыбіня 53,7 м). Да найбольшых належаць азёры Асвейскае (52,8 км$^2$), Чырвонае (40,8 км$^2$), Лукомскае (37,7 км$^2$), Дрывяты (36,1 км$^2$) і інш. Найбольш азёр на поўначы краіны — у Беларускім Паазер'і і на поўдні — у Беларускім Палессі. У асобных раёнах (Браслаўскі, Ушацкі) пад азёрамі да 10 % тэрыторыі. Многія азёры ўтвараюць групы, у іх ліку Ушацкая група

азёр, якая ўключае каля 40 азёр, сістэма Браслаўскіх азёр (больш за 50) і інш. Катлавіны азёр найчасцей ледавіковага (пераважна на поўначы), рачнога, карставага паходжання. Азёры паўночнай часткі краіны звычайна размешчаны ў межах марэнных узвышшаў і раўнін. У большасці яны маюць добра выражаныя берагі, стромкія, высокія схілы. Самыя буйныя азёры Беларускага Палесся ляжаць у плоскіх забалочаных паніжэннях і акружаныя тарфянымі балотамі.

Сярод штучных азёр найбольшае Вілейскае вадасховішча – 73,6 км².

Тэрыторыя краіны багатая на балоты. Вялікая колькасць балот знаходзіцца на Палессі. Але самым вялікім па плошчы з’яўляецца балота Ельня (Міёрскі раён, Віцебская вобласць) – 25,7 тыс. га.

Колькасць відаў раслін дасягае 12 000. У лясах Беларусі растуць у асноўным каштоўныя пароды дрэў: сасна, елка, дуб, бяроза, асіна, вольха. Больш за 200 відаў раслін ахоўваецца дзяржавай.

Жывёльны свет Беларусі налічвае 457 відаў пазваночных (у тым ліку 73 віды млекакормячых, 290 відаў птушак, прыблізна 60 відаў рыб). Важнае гаспадарчае значэнне маюць промыслава – паляўнічыя віды жывёл – лісіца, куніца, заяц, выдра, тхор, гарнастай, а таксама лось і дзік. Больш за 180 відаў жывёл ахоўваецца дзяржавай.

### 1.2.2. Помнікі прыроды і прыродныя рэсурсы Беларусі

Тэрыторыя Беларусі мае пэўны запас карысных выкапняў.

У Беларусі радовішчы нафты вядомы на Прыпяцкім прагіне, галоўным чынам у Гомельскай вобласці. Першае прамысловае радовішча адкрыта ў Рэчыцкім раёне ў 1964 г. Сярэдняя штогадовая здабыча нафты ў Беларусі складае зараз 1,7 млн т., што складае 10 % ад патрэбнай колькасці.

Паклады бурага вуглю выяўлены ў Прыпяцкім прагіне і Брэсцкай упадзіне, у асноўным на тэрыторыі Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Вядомы Брынёўскае, Жыткавіцкае і Тонежскае радовішчы. Агульныя геалагічныя запасы — больш за 1 млрд т, разведаныя — больш за 150 млн т. Якасць іх невысокая, распрацоўка пакуль не вядзецца, але гаспадарчае выкарыстанне магчымае нават у блізкай перспектыве.

Паклады гаручых сланцаў выяўлены ў Прыпяцкім прагіне, у асноўным на тэрыторыі Гомельскай і Мінскай абласцей. Агульныя прагнозныя запасы — да 8 млрд т. Глыбіня залягання 50 – 600 м, магутнасць пласта 0,5 – 3 м. Папярэдне разведана Тураўскае радовішча гаручых сланцаў. Гэтыя гаручыя сланцы патрабуюць пры выкарыстанні папярэдняй тэрмічнай апрацоўкі, здабыча не вядзецца.

Вядомы шматлікія паклады торфу з захаванымі геалагічнымі запасамі 4,3 млрд т. Узрост 4 – 12 тыс. гадоў (трапляецца і торф больш старажытных эпох). Торф выкарыстоўваецца як паліва, для вытворчасці арганічных і арганамінеральных угнаенняў, біястымулятараў, кармавых дражджэй, фільтраў, сарбентаў, фарбавальнікаў драўніны, тарфянога воску, лекавых сродкаў, прадуктаў бытавой хіміі і інш. Значная плошча тарфяных

радовішчаў асушана і выкарыстоўваецца ў якасці меліяраваных глебаў. Па падліках навукоўцаў на тэрыторыі Беларусі знаходзіцца каля 10 % сусветнага запасу торфа.

Выяўлены Аколаўскае радовішча жалезных руд (Стаўбцоўскі раён) і Навасёлкаўскае радовішча жалезных руд (Карэліцкі раён), але іх здабыча не вядзецца.

Паклады каменнай солі вядомы на Прыпяцкім прагіне. Мазырскае радовішча ў Гомельскай вобласці распрацоўваецца. Са здабытай сыравіны вырабляюць кухонную соль у горадзе Мазыр.

Паклады калійных солей сканцэнтраваны ў паўночнай частцы Прыпяцкага прагіну: Старобінскае радовішча ў Мінскай вобласці і Петрыкаўскае радовішча ў Гомельскай вобласці. Агульныя запасы калійных солей ацэньваюцца ў 6,5 млрд т. Старобінскае радовішча распрацоўваецца вытворчым аб'яднаннем «Беларуськалій». Калійная соль — асноўная сыравіна, з якой атрымліваюць калійныя ўгнаенні, металічны калій і яго злучэнні. Вытворчасць калійных угнаенняў вядзецца ў горадзе Салігорск.

Фасфарыты на тэрыторыі Беларусі былі знойдзены ў другой палове XIX ст. у раёне Мсціслава, Чавусаў і Быхава. У 1930-х гг. у Магілёўскай вобласці дзейнічалі 3 невялікіх прадпрыемствы па вытворчасці фасфарытавай мукі з мясцовай сыравіны. На гэтай тэрыторыі, у межах Сожскага фасфараноснага басейна, фасфарыты прымеркаваны да тоўшчы кварцава-глаўканітавых пяскоў мелавога перыяду. Папярэдне разведаны 2 радовішчы — Мсціслаўскае і Лабковіцкае. Другі, менш даследаваны, фасфараносны басейн Беларусі — Прыпяцкі, у Брэсцкай вобласці.

У заходняй частцы Палесся знойдзены залежы бурштыну, што знаходзяцца на глыбіні 15 – 80 м. У Беларусі вучоныя выявілі толькі адзін від бурштыну — суцыяніт. Праведзеныя экспертызы даказалі: па якасці беларускі бурштын не саступае знакамітаму балтыйскаму.

Помнікі прыроды — унікальныя неаднаўляемыя прыродныя аб'екты, каштоўныя ў навуковых, культурна-пазнавальных і аздараўляльных адносінах, якія з'яўляюцца ўсенародным здабыткам і ахоўваюцца дзяржавай.

У 1972 г. падпісана Міжнародная канвенцыя па ахове помнікаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны. Каштоўныя прыродныя аб'екты і комплексы аб'яўляюцца помнікамі прыроды з прычыны іх нязначнай плошчы ці адасобленасці, што не дае магчымасці стварыць запаведнік або заказнік, ці бясшкодна перавесці помнік прыроды ў штучныя ўмовы. У шырокім сэнсе да помнікаў прыроды часам адносяць таксама запаведнікі, заказнікі, нацыянальныя паркі, якія ўяўляюць сабой эталонныя ці ўнікальныя прыродныя ўтварэнні.

У Беларусі першыя спісы помнікаў прыроды былі зацверджаны ў 1923 г. і 1926 г. У 1963 г. прынята пастанова аб ахове помнікаў прыроды. Вылучаюць помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Па паходжанні выдзяляюцца: батанічныя помнікі прыроды, геалагічныя помнікі прыроды і гідралагічныя помнікі прыроды. Для кожнага помніка прыроды складаецца спецыяльны пашпарт, вызначаецца рэжым яго

ўтрымання і меры аховы. На 2000 г. ў краіне існавалі 303 помнікі прыроды рэспубліканскага значэння, у тым ліку 116 батанічных, 182 геалагічных і 5 гідралагічных.

Батанічныя помнікі прыроды — аб'екты расліннасці і флоры, якія маюць навуковую, культурна-пазнавальную, гістарычную, эстэтычную каштоўнасць і ахоўваюцца дзяржавай. У Беларусі каля 180 батанічных помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння: старадаўнія паркі — Бальценіцкі і Вердаміцкі, Вялікамажэйкаўскі (Шчучынскі раён), Гомельскі, Мірскі, Нясвіжскі, Радзівілімонтаўскі (Клецкі раён) і інш.; каштоўныя ўчасткі лесу — Барысаўскае лесанасаджэнне, Барэцкая (Івацэвіцкі раён), Вепрынская (Чэрыкаўскі раён) і Шолкавіцкая (Чарнейкаўская; Рэчыцкі раён) дубровы і інш.; насаджэнні інтрадукаваных дрэў і кустоў — Вінклераўскі (Нясвіжскі раён) і Ліноўскі (Пружанскі раён) хвойнікі, Моўчадскае насаджэнне лістоўніцы еўрапейскай (Баранавіцкі раён) і інш.; раслінныя згуртаванні на межах арэалаў, у месцах, аддаленых ад асноўнай вобласці свайго пашырэння, — Бёрдаўскае лесанасаджэнне (Клічаўскі раён), Добрушскія і Маларыцкія ельнікі і інш., а таксама з рэдкімі, рэліктавымі і тымі, якія знікаюць, відамі раслін — Вятчынскае месца росту рададэндрану жоўтага (Жыткавіцкі раён), Восаўскае і Церабежскае насаджэнні карэльскай бярозы (Івацэвіцкі раён) і інш.; дрэвы мясцовых парод (асабліва вылучаюцца ўзростам, памерамі, прыгажосцю ці звязаныя з гістарычнымі падзеямі) і ўнікальныя дрэвы-інтрадуцэнты (больш за 50).

Геалагічныя помнікі прыроды – аб’екты геалогіі – узвышшы, асобныя пагоркі, валуны і іх скапленні, месцы агалення зямной кары. Геалагічнымі помнікамі рэспубліканскага значэння з’яўляюцца:

– Вялікі камень, Чортаў камень — геалагічны помнік прыроды, самы вялікі валун Беларусі. За 500 метраў на захад ад вёскі Горкі Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці, за 400 метраў ад аўтадарогі Шуміліна-Бешанковічы.

– Лысая гара — помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Знаходзіцца на адлегласці 4 кіламетраў на паўднёвы захад ад Паставаў. Мае плошчу 0,04 км² і вышыню 155 метраў над узроўнем мора. Абмежавана на захадзе і поўначы поймай ракі Спорыцы, на ўсходзе – лагчынай, на поўдні – шашой Паставы–Лынтупы. Гара Лысая ўяўляе сабой адасобленае адносна невялікае ўзвышша, якое ўтварылася ў час апошняга зледзянення. Гэта тыповы марэнны ўзгорак, які мае ўнікальную правільную форму з пукатай вяршыняй і роўнымі павольнымі схіламі пры параўнальна невялікіх памерах (200х60 м) і адноснай вышынёй 15 м.

– Добрушскае геалагічнае агаленне — помнік прыроды рэспубліканскага значэння (1963 г), каля горада Добруш Гомельскай вобласці. Плошча 6000 м², ахоўная зона вакол 10000 м². Прымеркавана да ўступу карэннага берага ракі Іпуць, дзе агаляюцца слаі кварцава-глаўканітавых пяскоў харкаўскай світы палеагену, што намножыліся 65-30 млн.гадоў назад у старажытным моры.

Гідралагічныя помнікі прыроды – водныя аб’екты, пераважна крыніцы, часам вадаёмы і балоты, каналы. Большасць гідралагічных аб’ектаў маюць мясцовае значэнне. Так, Ракаўская крыніца — гідралагічны помнік прыроды мясцовага значэння, размешчана на ўсходняй ускраіне вёскі Ракаў, каля шашы Ракаў — Кучкуны, што злучае населены пункт з аўтамагістраллю Мінск-Гродна, у месцы, якое мясцовыя жыхары называюць «У Крыжы». Ахоўны статус нададзены 16 кастрычніка 2008 г.

### 1.2.3. Ахова прыроды: заканадаўства, тэорыя і практыка

Ахова прыроды – гэта комплексная сістэма міжнародных, дзяржаўных і грамадскіх мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне, рацыянальнае выкарыстанне і ўзнаўленне прыродных рэсурсаў, у тым ліку на захаванне краявіднай разнастайнасці (генафонду) флоры і фауны Зямлі, а таксама яе нетраў, водных рэсурсаў, атмасфернага паветра і, адпаведна, на захаванне прыродных умоў развіцця чалавечага грамадства

У мэтах аховы прыроды ажыццяўляюцца наступныя мерапрыемствы:

– стварэнне запаведных тэрыторый;

– рэгламентацыя выкарыстання прыродных рэсурсаў;

– абарона прыроднага асяроддзя (водаахоўнай мерапрыемствы, рэкультывацыя земляў, рэгуляванне паверхневага сцёку, скарачэнне аб'ёму сцёкавых вод і ачыстку г.д.);

– незалежная экалагічная экспертыза праектаў і ацэнка ўплыву гаспадарчай дзейнасці на навакольнае асяроддзе;

– маніторынг стану прыроднага асяроддзя (ад рэгіянальнага да глабальнага маніторынгу біясферы).

Прыродаахоўныя тэрыторыі, у залежнасці ад мэтавага прызначэння, асаблівасцяў ахоўнага рэжыму і памераў падпадзяляюцца на запаведнікі, нацыянальныя паркі, заказнікі, рэзерваты, помнікі культуры і іншыя запаведныя тэрыторыі. Агульная плошча запаведных тэрыторый свету складае больш за 5 % паверхні сушы. Найбольш распаўсюджанымі ў свеце з'яўляюцца нацыянальныя паркі, запаведнікі і заказнікі.

Нацыянальныя паркі – найбольш распаўсюджаная форма прыродаахоўных тэрыторый, для якіх характэрна масавы допуск наведвальнікаў на некаторую частку тэрыторыі. Гаспадарчая дзейнасць забаронена.

Запаведнікі – гэта ўчасткі сушы або акваторый, назаўжды выведзены з гаспадарчага выкарыстання, іх асноўнае прызначэнне – служыць эталонамі прыроды. Гаспадарчая дзейнасць дазволена для падтрымання прыроднага баланса.

Заказнікі – гэта асабліваахоўваемыя тэрыторыі, на якіх узяты пад ахову асобныя віды жывёльнага і расліннага свету. Гаспадарчае дзейнасць, якая не закранае існаванне гэтых відаў, дазволена.

У Беларусі на 2016 г. існуе 4 нацыянальныя паркі, 2 запаведнікі і звыш 480 заказнікаў.

Старэйшай ахоўваемай тэрыторыяй Беларусі з’яўляецца Белавежская пушча. Нацыянальны парк “Белавежская пушча” размешчаны ў басейне Заходняга Буга. Рэльеф тут спадзіста-ўзгорысты, раўнінныя ўчасткі чаргуюцца з асобнымі ўзвышшамі і паніжэннямі. У 1992 г. ЮНЭСКА надала Белавежскай пушчы статус сусветнай спадчыны чалавецтва. Адміністрацыйна-гаспадарчым і навуковым цэнтрам нацыянальнага парку з'яўляецца вёска Камянюкі Камянецкага раёна.

Нацыянальны парк “Браслаўскія азёры” служыць абароне ўнікальных прыродных комплексаў ад гаспадарчай дзейнасці чалавека, зберажэнню іх для будучых пакаленняў. Ён быў створаны ў жніўні 1995 г. Ядром стала Браслаўская група азёр. У склад парка ўвайшла паўднёвая частка Браслаўскага раёна са значнымі балотнымі і ляснымі масівамі. Агульная плошча нацыянальнага парку складае 71,5 тыс. га. З поўначы на поўдзень ён цягнецца на 56 км, пры шырыні ад 7 да 29 км. Каля 17% яго тэрыторыі займаюць азёры, лясы складаюць 46 % паверхні. У межах Нацыяльнага парку знаходзіцца шэраг цікавых помнікаў прыроды. Гэта асобныя ярка выражаныя ледніковыя формы рэльефу, вялікія валуны, астравы на азёрах, біягрупы рэдкіх дрэў. Ёсць шматлікія помнікі гісторыі і культуры: гарадзішчы розных эпох, курганныя захаванні, культавыя пабудовы.

Нацыянальны парк “Нарачанскі” знаходзіцца пераважна ў Мядзельскім раёне (96 % плошчы), а таксама часткова на тэрыторыі Вілейскага (2 % плошчы), Пастаўскага  (1,7 % плошчы) і Смаргонскага (0,3 % плошчы) раёнаў. Створаны ў 1999 г. з мэтай захавання прыроднага комплексу Нарачанскай групы азёр, Балдуцкай групы азёр, Вішнеўскага возера, азёр Вялікія Швакшты і Свір і для больш эфектыўнага выкарыстання рэкрэацыйных магчымасцей прыродных рэсурсаў. Працягласць Нацыянальнага парку з поўначы на поўдзень складае 34 км, з усходу на захад — 59 км. Адміністрацыя парку знаходзіцца ў курортным пасёлку Нарач Мядзельскага раёну Мінскай вобласці. Агульная плошча Нацыянальнага парку складае 97,3 тыс. га (0,973 тыс. км²). 66,8 тыс. га (68,7 %) гэтых земляў (у асноўным, лясы і вадаёмы) перададзеныя ў склад парку.

Нацыянальны парк “Прыпяцкі” размешчаны ў Гомельскай вобласці за 350 км на ўсход ад Брэста і за 250 км на поўдзень ад Мінска, на поўдзень ад шашы Брэст – Бранск. На сённяшні дзень плошча нацыянальнага парку складае 188485 га. Паўднёвая частка яго прадстаўлена адмыслова ахоўнай прыроднай тэрыторыяй плошчай 85841 га. Адміністрацыя нацыянальнага парка знаходзіцца ў Тураве. Нацыянальны парк размешчаны ў затапляемай пойме басейна Прыпяці на тэрыторыі Жыткавіцкага, Лельчыцкага і Петрыкаўскага раёнаў. Мясцовасць характарызуе высокая забалочанасць, у перыяд паводак можа залівацца да 70 % тэрыторыі нацыянальнага парку.

Бярэзінскі біясферны запаведнік — беларускі дзяржаўны запаведнік, створаны ў 1925 г., вялікі комплекс хваёвых лясоў, якія перамяжаюцца з верхавымі і нізіннымі балотамі і поймамі рэк. Прыродныя ўмовы запаведніка характарызуюцца некранутым абліччам лясоў і вялікіх сфагнавых балот. Тут захаваліся ўнікальныя ў Еўропе балотныя масівы, агульная плошча якіх

складае 50700 гектараў. У паўночнай і цэнтральнай, больш узвышаных частках запаведніка, пераважаюць пераходныя і верхавыя балоты, сярод якіх размешчаны пакрытыя хваёвым лесам мінеральныя астравы. У паўднёвай частцы запаведніка знаходзяцца буйныя масівы нізінных балот (у тым ліку і ўся пойма Бярэзіны). У Бярэзінскім запаведніку праведзена дыферынцыяцыя тэрыторыі на ўчасткі з розным рэжымам аховы. Усяго створана 6 зон: абсалютна запаведная, буферная, эксперыментальна-гаспадарчая, экскурсійная, ахоўная і гідралагічная. Абсалютна запаведная зона складае 47,2 % ад агульнай плошчы запаведніка. Гаспадарчая дзейнасць (сельская гаспадарка) дазволена ў эксперыментальна-гаспадарчай зоне (7000 гектараў). Вакол запаведніка праходзіць ахоўная зона шырынёй 2 км, якая належыць лясгасам, калгасам і саўгасам. У гэтай зоне забаронены тыя віды гаспадарчай дзейнасці, якія могуць аказаць адмоўны ўплыў на прыродныя комплексы запаведніка. У гідралагічнай зоне, якая працягнулася вакол запаведніка кальцом шырынёй 5 км, забаронены пошукавыя і меліярацыйныя работы.

Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік — адзіны запаведнік падобнага тыпу ў свеце, самы буйны ў Беларусі. Запаведнік быў арганізаваны ў 1988 г. на тэрыторыі беларускага сектара зоны адчужэння (трыццацікіламетровай зоны) агульнай плошчай 1313 км². Ён размясціўся на тэрыторыі найбольш пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС раёнаў — Брагінскага, Нараўлянскага і Хойніцкага. На тэрыторыі запаведніка праводзяць даследванні радыяцыйнага ўплыву, дзейнічае некалькі навуковых станцый. Акрамя таго, пасля адсялення людзей тэрыторыя пачала займацца дзікімі жывёламі, колькасць і разнастайнасць якіх з кожным годам павялічваецца.

Заказнікі падзяляюцца ландшафтныя і біялагічныя. У Беларусі 52 біялагічных заказніка агульнай плошчай 412,5 тыс. га, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на батанічныя і заалагічныя заказнікі. У розных зонах рэспублікі створаны заказнікі-журавіннікі пераважна на вярховых балотах (каля 20) і заказнікі лекавых раслін (каля 10). Прыкладам ландшафтнага заказніка з’яўляецца Ельня – унікальнае верхавое балота ў Міёрскім і Шаркаўшчынскім раёнах Віцебскай вобласці.

Буда-Кашалёўскі біялагічны заказнік — заказнік у цэнтры Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці (Беларусь). Плошча 13 575 га. Яго тэрыторыя ахоплівае рэдкія захаваныя лясныя масівы ў марэнна-зандравым ландшафце, спрыяльным для сельскагаспадарчага асваення і таму амаль цалкам разаранага. Створаны 13 красавіка 1988 г. для захавання рэштакавых фрагментаў каштоўных дуброў з рэдкімі відамі ахоўных раслін, занесеных ў Чырвоную кнігу Беларусі, якія маюць вялікае навуковае, культурнае і эстэтычнае значэнне. На тэрыторыі заказніка забараняюцца пасьба скаціны, парушэнне глебавага покрыва, правядзенне меліярацыйных і іншых прац, якія выклікаюць змену натуральнага ландшафта і воднага рэжыму, рух механізаванага транспарта па-за дарогамі, не звязаны з вядзеннем лясной гаспадаркі, выкарыстанне ядахімікатаў, а на тэрыторыі асабліва ахоўных

участкаў лесу з абмежаваным рэжымам лесакарыстання — правядзенне рубак, паляванне.

## 1.3. Менталітэт беларусаў і беларуская мова як духоўна-культурная каштоўнасць

### 1.3.1. Асноўныя рысы нацыянальнага характару і менталітэту беларусаў

Гістарычны лёс Беларусі склаўся такім чынам, што на працягу яе шматвяковага развіцця неаднойчы былі як перыяды росквіту беларускай дзяржаўнасці і культуры, так і працяглыя перыяды грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага заняпаду. Аднак нават у самых неспрыяльных варунках, калі, здавалася, народ не зможа выжыць, захаваць самабытнасць, беларусы ўсё ж ніколі поўнасцю не страчвалі свайго непаўторнага нацыянальнага аблічча і адмысловага нацыянальнага характару.

Пры вызначэнні ўнутранага свету чалавека і народа выкарыстоўваюцца паняцці “менталітэт”, “ментальнасць” і “нацыянальны характар”.

**Менталітэт, ментальнасць** (ад лац. mens розум, мысленне), своеасаблівы спосаб мыслення, склад розуму асобнага чалавека або якой-небудзь супольнасці людзей. Фарміруецца пад уплывам асаблівасцей гістарычнага шляху краіны, народных традыцый, звычаяў і абрадаў, мовы, прыродна-кліматычных умоў. Менталітэт разглядаецца як агульныя рысы ўсяго народа, тады як тэрмін “ментальнасць” адносіцца да асобных людзей і пэўных сацыяльных ці узроставых груп грамадства.

**Нацыянальны характар** можна вызначыць як своеасаблівую сукупнасць розных псіхалагічных рысаў і якасцей, уласцівых большасці прадстаунікоў пэўнай нацыянальнай супольнасці. Асаблівасці нацыянальнага характару прама ці ўскосна адлюстроўваюцца ў найбольш распаўсюджаных рысах паводзінаў, пачуццяў і перажыванняў пераважнай часткі людзей, якія адносяцца да аднаго народа. Нацыянальны характар з’яўляецца ўстойлівым, стабільным, яго надзвычай цяжка (а часам і немагчыма) змяніць адміністратыунымі мерамі альбо гвалтоўнымі дзеяннямі. Але, нягледзячы на падобную ўстойлівасць, нацыянальны характар усе ж можа паступова мяняцца, падвяргацца штучным уплывам і разнастайным дэфармацыям.

Можна вылучыць наступныя фактары, якія паўплывалі на фарміраванне нацыянальнага характару і менталітэту беларусаў:

**1. Фактар этнагенезу.** Вытокі складвання адмысловага характару нашых продкаў зыходзяць з тых старажытных часоў, калі у другой палове I тыс. н.э. землі Беларусі пачалі актыўна засяляць славянскія плямёны, якія з цягам часу амаль поўнасцю асімілявалі мясцовае насельніцтва балцкага паходжання. Менавіта таму ў асобных псіхалагічных рысах (напрыклад, стрыманасць, вынослівасць і г.д.) беларусы нагадвалі балтаў, найперш літоўцаў. Зразумела, што паколькі аснову беларускага этнасу склалі ўсе ж славянскія плямёны, то і падабенства нацыянальнага характару беларусаў

найбольш звязана з асобнымі славянскімі народамі, у першую чаргу з украінскім. Тыповымі славянскімі рысамі у характары беларусаў можна лічыць іх памяркоўнасць, гасціннасць, гуманнасць, а таксама пэўную нерашучасць, недастатковыя актыўнасць.

**2. Рэлігійны фактар.** На складванне характару беларусаў істотна паўплывала і своеасаблівае мірнае суіснаванне на нашых землях на працягу некалькіх стагоддзяў (найперш маюцца на увазе X–XIII стст.) язычніцтва і хрысціянства. Старажытнае язычніцтва за працяглы час яго існавання “выхоўвала” ў людзей такія рысы, як некаторы амаралізм, непасрэднасць выказвання эмоцый і пачуццяў, “адкрытасць” знешняму свету, абвостранае адчуванне непарыўнай еднасці з прыродай. Пашырэнне з II тыс. н.э. хрысціянства з яго маральнымі запаведзямі спрыяла выпрацоўцы ў беларусаў такіх станоўчых якасцей, як гуманнасць, мяккасардэчнасць, паважлівасць у адносінах да блізкага, да старых, дзяцей, памяркоўнасць і г.д.

**3. Прыродна-геаграфічны фактар.** Унікальныя асаблівасці прыроды нашай зямлі прыкметна паўплывалі на складванне адмысловага нацыянальнага характару беларусаў. Так, прырода Беларусі вызначаецца разнастайнасцю, неаднароднасцю ландшафтаў, кліматычных умоў, глебаў, што дазваляе гаварыць пра розніцу, непадобнасць прыродных умоў на поўначы і поўдні, на захадзе і ўсходзе краіны. Менавіта прырода накладвала значны адбітак на спецыфіку гаспадарчай дзейнасці, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў, а праз гэта і на станаўленне іх нацыянальнага характару. Паколькі Беларусь мае пераважна раўнінны і нізінны рэльеф, то і да беларусаў можна ў поўнай меры аднесці выснову псіхолагаў аб тым, што жыхарам раўнінных тэрыторый, як правіла, уласцівы спакойны, разважлівы характар. Акрамя таго, беларуская прырода пазбаўлена рэзкіх пераходаў ад аднаго рэльефу да другога (звычайна раўніны плаўна пераходзяць ва ўзвышшы і наадварот), што прадвызначыла фармаванне чалавека з такім жа “акруглым”, ураўнаважаным характарам. Таму, ў адрозненне ад многіх горскіх народаў, беларусы менш энергічныя, больш спакойныя і разважлівыя.

Варта адзначыць, што жыхары паўднёвых і паўночных раёнаў Беларусі маюць некалькі адрозныя характары, што не ў апошнюю чаргу абумоўлена і рознасцю прыродных умоў у гэтых мясцовасцях. Калі, напрыклад, беларусы з паўночна-усходніх зямель (тут у асноўным узгоркавы рэльеф) больш падобныя да расійцаў, то тыя, хто жыве на Палессі з яго раўнінамі, нізінамі і мноствам лясоў, балот, стаяць бліжэй да ўкраінцаў і здаюцца занадта меланхалічнымі, апатычнымі і, мабыць, менш рашучымі, актыўнымі, чым жыхары поўначы Беларусі.

**4. Геапалітычны фактар.** Беларусь мае дастаткова зручнае геапалітычнае становішча, бо знаходзіцца на своеасаблівым скрыжаванні ўсіх шляхоў паміж чатырма бакамі свету. З аднаго пункту гледжання, гэта, безумоўна, спрыяла пашырэнню міжнароднага гандлю, узаемапранікненню розных этнакультурных, рэлігійных, навуковых традыцый і г.д. Аднак, з другога боку, такое ўнікальнае, надзвычай прывабнае становішча Беларусі

нярэдка з’яўлялася і прычынай многіх трагічных падзей, складаных выпрабаванняў. У выніку беларускія землі спрадвеку былі жаданай стратэгічнай мэтай, сферай уплыву для больш агрэсіўных суседзяў, служылі арэнай кровапралітных войнаў паміж імі. Такая працяглая, зацятая барацьба, адчайная абарона сваёй чалавечай годнасці і незалежнасці, а таксама іншы раз жыццё ва ўмовах эпідэмій і голаду (які суправаджаў розныя войны) паступова выпрацоўвалі ў беларусаў незвычайную вынослівасць, мужнасць і цярплівасць.

**5. Генетычны фактар.** Вучоныя небеспадстаўна лічаць, што любы народ мае такі набор генаў, які з’яўляецца найбольш прыдатным да яго, бо менавіта гэты набор забяспечвае жыццяздольнасць і выжыванне народу ў натуральных умовах яго існавання. Якраз уплыў “генаў этнічнасці” ў значнай ступені прадвызначае адрозненні ў характары прадстаўнікоў тых ці іншых нацый. Найлепшым чынам “агульнанацыянальная генетычная праграма” захоўваецца ў асяродку сельскіх папуляцый, якія ва ўсе часы складалі аснову беларускага этнасу і былі галоўнымі захавальнікамі, носьбітамі старажытных традыцый, звычаяў, мовы і, нарэшце, нацыяналага характару, ментальнасці. У абставінах паступовага скарачэння колькасці сельскага і ўзрастання гарадскога насельніцтва ў беларусаў разбураўся іх адметны генафонд, у які ўліваліся новыя, не уласцівыя ім гены пераважна ад поліэтнічнага насельніцтва гарадоў і мястэчак. У выніку сталася так, што ў беларусаў традыцыйны генны “набор” захаваўся найперш у вёсцы, дзе ў мясцовых жыхароў, як кажуць, “у крыві” закладзены доўгацярплівасць, кансерватыўнасць, памяркоўнасць, вынослівасць і шэраг іншых станоўчых і адмоўных якасцей.

**6. Гістарычныя фактары.** Уплыў на нацыянальны характар беларусаў аказвалі, напрыклад, такія асаблівасціі гістарычнага развіцця, як працяглая адсутнасць у мінулым (XVIII – XX стст.) сваёй нацыянальнай дзяржаўнасці, амаль несупынныя працэсы дэнацыяналізацыі (спачатку паланізацыі, а пазней і русіфікацыі), а ў савецкі перыяд – ідэалогія і практыка “контрбеларусізацыі” і штучнай асіміляцыі беларусаў у 1930 – 1980-я гг. Негатыўныя наступствы падобнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі, яе народа прыкметна адчуваюцца і ў наш час, хаця яны ўсё ж паступова, марудна пераадольваюцца.

Паколькі кожны нацыянальны характар уяўляе складаную сукупнасць разнастайных (нярэдка супрацьлеглых) псіхалагічных якасцей, то дзеля лепшага ўспрымання можна ўсе рысы псіхалогіі беларусаў умоўна падзяліць на дзве асноуныя групы – станоўчыя, або дадатныя, і адмоўныя, або негатыўныя. Такі падзел з’яўляецца ў значнай меры суб’ектыўным, аднак ён дае магчымасць больш яскрава і дасціпна апісаць тыповыя рысы любога нацыянальнага характару.

**Станоўчай рысай** беларускага характару можна небеспадстаўна лічыць адсутнасць у ім агрэсіўнасці, ваяўнічага нацыяналізму і месіянскай свядомасці. Тыповы беларус у адрозненне, скажам, ад расійца, які заўсёды легка ўпадаў у крайнасць, даходзіў да мяжы магчымага, звычайна вызначаўся

стрыманасцю, спакойным норавам. Падобная пазбаўленасць крайнасцей у выяўленні пачуццяў, эмоцый і думак, своеасаблівая цэнтрычнасць характару беларусаў адлюстравалася і ў асобных фальклорных творах. Напрыклад, у народных песнях, вершах, казках перажыванні дзеючых асоб найчасцей як бы ўраўнаважаны, прыгладжаны і нярэдка сумяшчаюць адначасова радасць і смутак (тыловым прыкладам могуць служыць вясельныя песні).

Пад непасрэдным уплывам хрысціянства з яго вядомымі культамі і запаведзямі сярод беларусаў з цягам часу выпрацоўваліся такія маральна-духоуныя якасці, як мяккасардэчнасць, гуманнасць і спачуванне блізкаму (эмпатыя). Аб складзе душы беларусаў можа даць некаторае ўяуленне і іх схільнасць да светлых колераў у сваім адзенні, хатняй абстаноўцы і г.д., а, як вядома, сімволіка белага колеру азначае маральную чысціню, прыгажосць і праведнасць жыцця. Схільнасць беларусаў да міласэрнасці, добразычлівасці адлюстравалася і ў многіх народных прыказках і прымаўках: “Бога любі і бліжняга свайго не губі”, “Любі другога, як сябе самога”, “Шчыраму сэрцу чужая болька баліць”, “Чаго сабе не хочаш, таго і другому не зыч”.

Беларускаму нацыянальнаму характару практычна ва ўсе часы (асабліва ў перыяды войнаў і ўсялякіх выпрабаванняў) былі ўласцівы такія дадатныя рысы, як мужнасць і вынослівасць, жыццястойкасць і нескаронасць. Беларусы праяўлялі заўсёдную гатоўнасць бараніць родны край, годнасць бацькоў, дзяцей, сваякоў.

Амаль усе, хто прыязджае на Беларусь, заўсёды падкрэсліваюць, што беларусы – народ шчыры, добразычлівы і вельмі гасцінны. Мажліва, менавіта такая надзвычайная гасціннасць як бы сінтэзуе, аб’ядноўвае і некаторыя іншыя прывабныя якасці нашага народа – талерантнасць, памяркоўнасць і лагоднасць. Не выпадкова ў Беларусі была распаўсюджана характэрная прыказка: “Госць у хаце – Бог у хаце”. Нават пры ўсялякіх жыццёвых цяжкасцях і нягодах беларусы звычайна імкнуліся зрабіць усё магчымае, каб задаволіць сваіх гасцей, не выклікаць з іх боку ніякіх адмоўных пачуццяў.

Адной з найбольш тыповых рыс характару беларусаў з’яуляецца іх надзвычайная **талерантнасць** (цярпімасць) да прадстаўнікоў розных нацый, канфесій, да людзей з іншым складам мыслення, светаўспрымання. Прычым гэтая рыса характару была, мажліва, у некаторай ступені закладзена генетычна, але яна ў той жа час выпрацоўвалася гістарычна, у канкрэтных абставінах сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця беларускага этнасу.

У выніку працяглага сумеснага жыцця шматнацыянальнага і поліканфесійнага насельніцтва ў эпоху сярэднявечча на землях Беларусі склалася досыць трывалая сітуацыя этнаканфесійнай і грамадска-палітычнай талерантнасці. Пра яўную ўласцівасць цярпімасціі памяркоўнага стаўлення да “іншаземцау” ці “іншаверцау” можа сведчыць і той факт, што на нашай зямлі са старажытных часоў да сённяшніх дзен ніколі не было крывавых канфліктаў на нацыянальна-рэлігійнай глебе. На працягу XIV – XVII стст. на Беларусі ўзніклі пасяленні яўрэяў, рускіх, палякаў, татараў, сярод якіх былі распаўсюджаны розныя рэлігійныя вераванні – праваслаўе, каталіцтва,

уніяцтва, пратэстантызм (найперш у форме кальвінізму, лютэранства), мусульманства, іўдаізм. Пры вельмі стракатым складзе насельніцтва ўзаемаадносіны яго асобных этнічных і рэлігійных груп найчасцей характарызавалася добрасуседствам, цярпімасцю і прыхільнасцю (выпадкі непаразуменняўі спрэчак былі адносна нешматлікія). Якраз на “талерантнай” беларускай зямлі ў эпоху сярэднявечча знаходзілі сабе надзейны прытулак, напрыклад, яўрэі і рускія стараверы (стараабрадцы), якія ратаваліся ад нацыянальнага і рэлігійнага ўціску ў краінах іх былога пражывання. Падобным перасяленцам у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ), як правіла, афіцыйна гарантаваліся рэлігійныя свабоды, грамадзянскія правы і нават асобныя прывілеі, што звычайна не выклікала прыкметнага незадавальнення і непрыхільнасці.

**Адмоўныя якасці характару беларусаў.** Ва ўсе часы свайго гістарычнага развіцця ў беларусаў адначасова са станоўчымі праяўляліся таксама і некаторыя адмоўныя рысы нацыянальнага характару. Ёсць, здаецца, важкія падставы прымяніць і да беларусаў вядомае выказванне: “Недахопы чалавека – гэта працяг яго вартасцей”. Напрыклад, нерашучасць і некаторая абыякавасць, інэртнасць, магчыма, з’яўляюцца вынікам празмернай, “гіпертрафаванай” талерантнасці і памяркоўнасці. Празмерна развітая талерантнасць часам магла і шкодзіць, бо гэтую асаблівасць характару нярэдка выкарыстоўвалі ў сваіх асіміляцыйных мэтах і польскія, і расійскія ўлады. А беларускі народ, спакойны і спагадлівы, іншы раз моўчкі пераносіў глумленне над сваей мовай, культурай, не выказваючы моцнага пратэсту, і часам з паслухмянасцю, з пакорнасцю ўспрымаў і цярпеў чужацкую ўладу.

Некаторую пасіўнасць і апатычнасць беларусаў, іх недастатковую здольнасць да прадпрымальніцтва раней тлумачылі падаўляючымі энергію і волю асіміляцыйнымі ўплывамі з усходу і захаду, даволі раннім і моцным развіццем прыгонніцтва, а таксама тым, што, напрыклад, у сферы асобных промыслаў, рамёстваў і асабліва гандлёвай дзейнасці беларусы звычайна не маглі вытрымаць канкурэнцыі з боку энергічных і бойкіх яурэяў.

Спакойны характар беларусаў паўплываў і на выбар іх працоўных заняткаў (такіх жа няспешных). У мінулым многія лічылі беларусаў надзвычай пакорлівай, ціхмянай, ва ўсім безадмоўнай народнасцю. Пры гэтым адзначалася, што з цягам часу беларускі народ звыкся з неспрыяльнымі, амаль заўсёды несвабоднымі варункамі жыцця, не імкнуўся да паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча і ў выніку зрабіўся нібыта “рабом па духу”. Сапраўды, нягледзячы нават на шматлікія цяжкасці, сярод беларусаў не атрымалі шырокага развіцця апазіцыйныя, дысідэнцкія ідэі, а нацыянальна-вызваленчая барацьба не мела такога маштабу, як, скажам, ва Украіне.

Не маюць беларусы ў сваім характары і таго ірацыянальнага, нястрымнага імкнення да асабістай свабоды і волі, якім ва ўсе часы вызначаліся цыганы. У характары беларусаў караніцца і такая рыса, як заўсёдная схільнасць да кампрамісаў у вырашэнні жыццёвых праблем, да згоды (прыгадаем прыказку “Згода будуе, нязгода руйнуе”). Аднак у

выпадках празмернага развіцця гэтых якасцей “пазітыў” можа легка пераходзіць у “негатыў”, і тады ўжо частку беларусаў вызначаюць пэўнае прыстасаванства, канфармізм, недастатковая настойлівасць у абароне ўласных поглядаў і перакананняў.

Беларусы ў большасці бываюць даволі скрытнымі, недаверлівымі, насцярожанымі ва узаемаадносінах з незнаемымі людзьмі, “чужынцамі”. Прычына падобнай недаверлівасці, асцярожнасці ляжыць, магчыма, у спецыфіцы гістарычнага шляху беларусаў са шматлікімі нападамі, войнамі і здзекамі з боку іншых дзяржау, паноў-прыгнятальнікаў, асімілятараў і інш. Дарэчы, тыповыя беларусы заусёды ўмелі спакойна, уважліва выслухаць думкі розных “іншаверцау”, “іншаземцау”, аднак усё ж не падтрымлівалі, не падзялялі іх, калі яны не адпавядалі ўнутраным, душэўным перакананням.

У выніку ўздзеяння розных неспрыяльных фактараў у беларусаў склаліся тыпы характару, якія характарызуюцца абвостранымі пачуццямі няўпэуненасці, нерашучасці, занепакоенасці, схільнасцю да дэпрэсіі, апатыі, увогуле пэўным “комплексам непаўнацэннасці”. Прычым падобны комплекс непаўнацэннасці выяўляўся, напрыклад, у прадузятым успрыманні беларусамі сваей культуры, мовы як ніжэйшых, “мужыцкіх”, “хамскіх” у параўнанні з польскай, рускай і інш.

Прыведзеныя меркаванні пацвярджаюцца ў нашы дні і вынікамі спецыяльных даследаванняў, згодна з якімі так званы слабы тып характару, што праяўляецца ў нерашучасці і безабароннасці, значна часцей сустракаецца сярод сельскіх жыхароў Беларусі, а ў гарадах, наадварот, больш выяўлена людзей з досыць моцным і кантактным характарам. У сучасны перыяд і ў далейшым характар беларусаў хутчэй за усё будзе, відаць, “набываць” новыя, як станоўчыя, так і адмоўныя рысы, абумоўленыя найперш істотнымі зменамі ў розных сферах жыццядзейнасці грамадства.

### 1.3.2. Гістарычны шлях беларускай мовы

Усе асаблівасці жыцця нашага народа адлюстраваліся ў мове. Мова выконвае шмат функцый у жыцці нацыі: з’яўляецца сродкам камунікацыі; сродкам абмену культурнай інфармацыяй; складнікам нацыянальнай свядомасці; выступае сродкам засваення нацыянальнай гісторыі і нацыянальных каштоўнасцей; з’яўляецца інструментам і сродкам развіцця нацыянальнай культуры; выконвае функцыю перадачы і захавання навуковых ведаў; адлюстроўвае спецыфічныя бакі нацыянальнага жыцця і гісторыі; з дапамогай мовы яе носьбіты пазнаюць нацыянальнае жыццё свайго народа і сябе як прадстаўнікоў нацыі; з’яўляецца сродкам пазнання рэчаіснасці, усіх набыткаў практыкі чалавецтва. Мова – моцны інструмент уздзеяння на чалавека, сродак фарміравання яго як асобы, сродак паўнавартаснага выхавання.

На зямным шары жыве каля 2000 розных народаў, а моў налічваецца ад 3000 да 6000, пры гэтым розныя народы могуць гаварыць на адной мове. У наш час амаль кожны другі чалавек гаворыць на мове індаеўрапейскага

паходжання. Па ступені роднасці індаеўрапейская сям’я падзяляецца на асобныя групы моў. Беларуская мова належыць да славянскай групы моў індаеўрапейскай сям’і. Разам з рускай і ўкраінскай мовамі яна ўваходзіць у склад усходнеславянскай падгрупы. Стваралася і развівалася беларуская нацыянальная мова ў складаных гістарычных умовах, у непарыўнай сувязі са стварэннем і развіццём беларускага этнаса.

Археолагі вылучаюць некалькі этапаў засялення славянамі беларускіх земляў, якія да гэтага ўжо былі часткова асвоены балцкімі і ўгра-фінскімі плямёнамі. Апошняя хваля масавай славянскай міграцыі на Беларусь прыпадае на VI ст. Аселі тут пераважна плямёны крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў, якія мелі многа агульнага ў культуры і мове.

Славяне прынеслі з сабою свае племянныя дыялекты праславянскай мовы, блізкія да гаворак заходніх суседзяў і суродзічаў – будучых палякаў, чэхаў, славакаў, а таксама ўкраінцаў. Гэтыя дыялекты актыўна ўзаемадзейнічалі з балцкімі і ўгра-фінскімі гаворкамі мясцовага насельніцтва. Славянскія дыялекты паступова асімілявалі (выцеснілі) балцкія. Ад апошніх засталася ў беларускай мове толькі багатая тапаніміка ды гідраніміка (большасць назваў рэк і вадаемаў на Беларусі балцкага паходжання).

Старажытныя крывіцкая і дрыгавіцкія племянныя саюзы паступова перараслі ў дзяржаўныя супольнасці, феадальныя княствы, якія атрымалі пазней назвы Полацкае, Турава-Пінскае і інш. Моўнай адзінкай замест племянных дыялектаў у межах новай моўнай тэрыторыі становяцца тэрытарыяльныя дыялекты – гаворкі абласцей, якія аб ядноўваліся ў эканамічных і палітычных адносінах вакол пэўнага горада. Характэрныя фанетычныя рысы беларускай мовы – дзеканне і цеканне, цверды “р”, фрыкатыўны “г” – спачатку маглі ўзнікнуць на захадзе былой тэрыторыі дрыгавічоў і пашырацца з захаду на ўсход. З’ява акання, якая ў наш час з’яўляецца агульнанацыянальнай нормай, была больш пашырана на паўночным усходзе Беларусі.

Перш чым утварылася беларуская народнасць і сфарміравалася яе мова, у жыцці ўсходняга славянства адбылося многа важных падзей, якія паўплывалі на яе стан і развіццё. Да ліку такіх падзей адносіцца далучэнне славян у X ст. да хрысціянскай цывілізацыі. Разам з хрысціянствам на ўсходнеславянскія землі прыйшла пісьменнасць на старaславянскай мове і паступова выціснула язычніцкую культуру. З старaславянскай кніжнай мовай сутыкаюцца традыцыі вуснай мовы народа, у выніку сінтэзу гэтых дзвюх моў выпрацоўваецца варыянт пісьмовай мовы, якая існуе паралельна са шматлікімі дыялектамі ўсходніх славян. Яе называюць старажытнай усходнеславянскай або старажытнарускай мовай. Гэта мова становіцца дзяржаўнай мовай Кіеўскай Русі. На ёй былі створаны такія сусветна вядомыя помнікі, як “Слова пра паход Ігаравы”, творы Уладзіміра Манамаха, летапіс “Аповесць мінулых гадоў” і інш.

Надзвычай плённымі ў гісторыі беларускай кніжнасці і пісьменства былі XI—XII стст. Побач з традыцыйнымі богаслужэбнымі творамі на

царкоўнаславянскай (стараславянскай) мове да нас дайшлі арыгінальныя творы старажытнай эпохі: словы, казанні, павучанні, малітвы Кірылы Тураўскага, пісьменнікаў-асветнікаў Клімента Смаляціча і Аўраама Смаленскага. У XII ст. асветніцкую працу вяла Ефрасіння Полацкая. Яе жыццё і дзейнасць апісаны ў "Жыціі", складзеным пасля смерці адным з вучняў. На тэрыторыі Беларусі існавалі такія буйныя цэнтры старажытнай пісьменнасці, як Полацк, Тураў, Пінск, Смаленск, Слуцк, Мазыр.

Значна больш помнікаў пісьменнасці не толькі рэлігійнага, але і свецкага характару дайшло да нас ад XIII ст. Гандлёвыя дагаворы, надпісы на прадметах матэрыяльнай культуры, разнастайныя граматы знойдзены ў Віцебску, Смаленску, Мсціславе. Гэтыя помнікі шырока адлюстроўваюць асаблівасці жывой народнай гаворкі таго часу. Напрыклад, у адным з першых дакладна датаваных помнікаў – "Дагаворнай грамаце Смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай і Гоцкім берагам" ад 1229 г., у якім шырока прадстаўлены мясцовыя (полацка-смаленскія) рысы (змяшэнне "ч" і "ц", пераход "в" у "ў" (нескладовае).

У XIII ст. Кіеўская Русь распадаецца. Узнікае Вялікае княства Літоўскае, і на працягу XIV ст. ўся тэрыторыя Беларусі ўвайшла ў яго склад. Гэта была дзяржава шматэтнічная, поліканфесіяльная і шматмоўная. Этнічную большасць у Вялікім княстве Літоўскім складалі нашчадкі былых усходнеславянскіх плямёнаў (крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў), якія захавалі свае традыцыі, звычаі, веру, культуру, сваю мову, атрыманую з даўніх часоў. На базе гэтай часткі ўсходнеславянскага насельніцтва на працягу XIV—XV стст. склалася беларуская народнасць і сфарміравалася беларуская літаратурна-пісьмовая мова – старабеларуская. Гэтая мова мела статус афіцыйнай дзяржаўнай мовы ў ВКЛ, таму ўжывалася ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. На ёй існавала багатая літаратура, навуковая і мастацкая, летапісы, а з сярэдзіны XVI ст. – тэксты Святога Пісання. Гэта была мова законаў, суда, канцылярый (Літоўская метрыка, Статут Вялікага княства Літоўскага). Пераклад і выданне на Беларусі рэлігійнай літаратуры звязаны з дзейнасцю такіх выдатных пісьменнікаў-асветнікаў, як Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Пётр Мсціславец, Мялецій Сматрыцкі, кнігі якіх увасобілі дэмакратызацыю царкоўнаславяншчыны ў напрамку больш зразумелага для чытача пісьма. Літаратурная мова часоў Вялікага княства Літоўскага, можна сказаць, была "нацыянальнай" літаратурнай мовай у тым сэнсе, што ў яе аснове ляжала старабеларуская мова, а не царкоўнаславянская ці якая іншая.

Аднак далейшае развіццё беларускай народнасці і яе мовы адбывалася ў неспрыяльных умовах. Утварэнне Рэчы Паспалітай у выніку аб'яднання ВКЛ з Польшчай (Люблінская унія 1569 г.) мела вынікам значнае ўзмацненне польскага палітычнага і культурнага ўплыву. Польшча пачала ажыццяўляць вялікадзяржаўную палітыку ў адносінах да Вялікага княства Літоўскага. Яна выяўлялася найперш у імкненні падпарадкаваць гэты край, у пашырэнні каталіцызму, польскай культуры, мовы. З канца XVI ст. на Беларусі распаўсюджваецца лацінская мова – афіцыйная мова Польскай дзяржавы.

Яна пачынае выкарыстоўвацца ў судовай практыцы, навуковым ужытку, становіцца прадметам школьнага вывучэння. Экспансія польскай мовы асабліва пашыраецца ў XVII ст. Польская мова становіцца мовай канфесійнай палемікі свецкай літаратуры, выцясняе беларускую з прыватнага пісьмовага ўжытку. Творы, якія выходзяць на беларускай мове ў канцы XVI – XVII стст. напаўняюцца паланізмамі.

У 1696 г. Варшаўскі Сейм канстатуе, што ў справаводстве ВКЛ ўсе рашэнні павінны складацца на польскай мове. З гэтага часу афіцыйная пісьменнасць на беларускай мове спыняецца. Але беларуская мова працягвае выкарыстоўвацца ў штодзённым ужытку сялян і іншых ніжэйшых колаў грамадства, якіх польская асіміляцыя амаль не закранула, гэта значыць, працягвае функцыянаваць і развіваецца як народна-дыялектная мова.

Унікальнымі помнікамі беларускай пісьменнасці XVII – XVIII стст. з’яўляюцца рукапісныя кнігі беларускіх татар – кітабы (кітаб у перакладзе з арабскай мовы азначае “кніга”). Захаваўшы сваю рэлігію беларускія татары карысталіся для стварэння сваіх кніг польскай і старабеларускай мовамі. Кітабы маюць пераважна рэлігійны сюжэт і запісаны арабскім алфавітам па правілах арабскага пісьменства. Тэкст пачынаецца там, дзе ў еўрапейскіх кнігах ён завяршаецца. Радкі ідуць з права на лева без падзелу на словы і без знакаў прыпынку. Памеры кітабаў розныя – ад 70 да 1000 старонак. У Беларусі кітабы захаўваюцца ў Бібліятэцы Акадэміі Навук і Музеі кнігі, што дзейнічае пры Нацыянальнай бібліятэцы.

У канцы XVIII ст. беларускі народ апынуўся ў новых гістарычных абставінах. Некалі вялікая Рэч Паспалітая пасля трох падзелаў паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй у 1795 г. перастала існаваць. Беларускія землі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Царскі ўрад ігнараваў не толькі дзяржаўную самастойнасць, але і этнічную, моўную, культурна-рэлігійную адметнасць беларускага народа. Загадам Мікалая I у 1840 г. на Беларусі ў якасці афіцыйнай уводзіцца руская мова. У гэты час (перыяд нацыянальна-культурнага заняпаду) у асяроддзі навукоўцаў-беларусаў, выхаваных на традыцыях польскай і рускай культур, умацоўваецца разуменне самабытнасці беларускага народа. Такім чынам, у XIX ст. пачынаецца фарміраванне новай мовы на аснове жывой народнай мовы беларусаў. Характэрныя рысы народных гаворак бачны ў ананімных творах “Энеіда навыварат” і “Тарас на Парнасе”, а таксама ў працах створаных Я. Баршчэўскім, В. Дуніным-Марцінкевічам, Ф. Багушэвічам і інш. Значны ўклад у развіццё беларускай мовы ўнёс Ян Чачот. Ён стаў першым аўтарам слоўніка беларусаў, які быў надрукаваны ў Вільні (1846 г.) у зборніку народных песень.

Першыя спробы кадыфікаваць правапісныя і граматычныя нормы былі зроблены Я. Лёсікам, які ў 1917 г. апублікаваў лацінскім шрыфтам дапаможнік «Як правільна пісаць па-беларуску”, а ў 1918 г. на яго аснове быў выдадзены “Беларускі правапіс”. У гэты час выходзяць і іншыя дапаможнікі: “Беларускі правапіс” А. Луцкевіча і Я. Станкевіча, граматыка П. Пачобкі і іншыя. Але найбольш значнай і ўдала распрацаванай сярод іх стала

“Беларуская граматыка для школ” Б. Тарашкевіча, выдадзеная ў Вільні ў 1918 г. Аўтар апісаў усе ўзроўні моўнай сістэмы з пункту гледжання іх нарматыўнасці, правіл перадачы на пісьме. Ён здолеў акрэсліць асноўныя заканамернасці беларускай літаратурнай мовы, выявіць гістарычна-абумоўленую сувязь яе фанетыка-граматычных асаблівасцей з цэнтральнымі гаворкамі, якія аб’ядноўваюць у сабе найбольш агульныя і пашыраныя рысы абодвух дыялектаў. Выключных поспехаў у вывучэнні беларускай мовы, яе гісторыі, помнікаў беларускай пісьменнасці дасягнуў заснавальнік беларускай філалогіі Я.Ф. Карскі – аўтар шматлікіх прац па беларусістыцы, манаграфіі “Беларусы”.

Новы этап развіцця беларускай мовы праходзіў ва ўмовах савецкай палітыкі беларусізацыі. У 1920 г. быў створаны Інбелкульт, які паслужыў базай для арганізацыі АН Беларусі, што ўключала ў свой склад Інстытут мовы, літаратуры і мастацтва. У выніку збору і сістэматызацыі беларускай лексікі былі створаны 24 тэрміналагічныя зборнікі, апублікаваны “Беларуска-расійскі слоўнік” (1925 г.) і “Расійска-беларускі слоўнік” (1928 г.) М.Я. Байкова і С.М. Некрашэвіча. Абагульняльную працу пра гаворкі цэнтральнай і ўсходняй Беларусі “Спроба лігвістычнай геаграфіі Беларусі” ў 1928 г. апублікаваў П.А. Бузук. Дыялектычны матэрыял, назапашаны Інстытутам мовы, літаратуры і мастацтва АН Беларусі, загінуў у Вялікую Айчынную вайну. Гісторыю беларускай мовы вывучалі П.А. Бузук, Я.Ф. Карскі і іншыя, фанетыку – Я. Лёсік, І. Воўк-Левановіч і іншыя.

У выніку ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі беларуская мова набыла статус дзяржаўнай. На ёй працавалі ўрад, дзяржаўныя і грамадскія ўстановы, вялося навучанне ў школах, тэхнікумах, ВНУ, ствараліся падручнікі, слоўнікі. Беларуская мова стала мовай справаводства, навукі. Аднак ў 1930-я гг. працэс беларусізацыі спыняецца. У выніку “выкрыцця” і барацьбы з “нацыянал-дэмакратамі” гінуць грамадскія дзеячы, пісьменнікі, вучоныя, работнікі культуры і асветы. Беларуская мова паступова замяняецца рускай мовай у дзяржаўных установах, інстытутах. У 1933 г. ў выніку прыняцця пастановы СНК БССР “Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапісу” былі ўнесены значныя змены ў правапіс (замацаванне акання ва ўсіх ненаціскных складах пасля цвёрдых зычных, адмена перадачы на пісьме асімілятыўнай мяккасці зычных, змяненні ў напісанні некаторых запазычаных слоў). Рэформа атрымала як станоўчую, так і негатыўную ацэнку. Яна не была прынята за межамі БССР (Заходняя Беларусь), і амаль усе замежныя выданні на беларускай мове карысталіся правапісам Б. Тарашкевіча.

У 1938 г. выходзіць пастанова СНК і ЦК ВКП(б) “Аб абавязковым вывучэнні рускай мовы ў школах нацыянальных рэспублік і абласцей”. У другой палове XX ст. беларуская мова функцыянавала ва ўмовах канкурэнцыі з рускай.

На працягу 1950 – 1980-х гг. не абароненая дзяржавай беларуская мова саступала свае пазіцыі рускай мове, якая, па сутнасці, са сродку міжнацыянальных зносін ператварылася ў дзяржаўную мову рэспублікі.

Беларускія школы сталі рускамоўнымі, беларуская мова была выключана са сферы афіцыйнага ўжытку. Асобныя папраўкі і ўдакладненні былі ўнесены ў 1957 г. спецыяльнай пастановай Савета Міністраў БССР “Аб удакладненні і частковых зменах існуючага беларускага правапісу”. Поўны звод афіцыйнага беларускага правапісу “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” быў апублікаваны ў 1959 г.

### 1.3.3. Беларуская мова ва ўмовах глабалізацыйных працэсаў

Працэсы дэмакратызацыі грамадства, набыццё нашай рэспублікай суверэнітэту абвастрылі моўную праблему і абумовілі пачатак адраджэння беларускай мовы. У 1990 г. беларускай мове, у адпаведнасці з прынятым Вярхоўным Саветам Беларусі Законам Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі аб мовах у Беларускай ССР, быў нададзены статус дзяржаўнай, які прадугледжваў найперш аднаўленне яе ў сферы афіцыйна-прававога ўжытку і адукацыі. Дзякуючы намаганням інтэлігенцыі, дзейнасці ўстаноў асветы, культуры, творчых саюзаў роля беларускай мовы ў жыцці грамадства значна ўзрасла. Пашырыліся яе функцыі ў сістэме адукацыі – спынена практыка пераводу школ на рускую мову навучання. Дзяржаўная падтрымка беларускамоўных выданняў, сродкаў масавай інфармацыі значна павялічыла аб’ём камунікацыі на беларускай мове. Была распрацавана дзяржаўная праграма па паступоваму (да 2000 г.) пераводу на беларускую мову ўсіх арганізацый і ўстаноў. Аднак, рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. замацаваў дзяржаўнае беларуска-рускае двухмоўе ў рэспубліцы. Гэта негатыўна паўплывала на сферу ўжытку беларускай мовы. Так ў 1993–1994 вучэбным годзе па беларуску навучалася 67,3 % усіх першакласнікаў, то ўжо ў 2002–2003 вучэбным годзе 73,6 % (у Мінску – 93,6 %) школьнікаў Беларусі вучылася ў рускамоўных класах. У той жа час, паводле даследаванняў ЮНЭСКО, мова знаходзіцца на мяжы знікнення, калі на ёй размаўляе меньш за 30 % дзяцей.

Падобная сітуацыяназіраецца і ў выдавецкай справе. Па стане на 1999 г. у Беларусі выдавалася 118 беларускамоўных перыядычных выданняў і 314 рускамоўных. Беларускія кнігі складалі толькі 10,6 % усіх выданняў і 8 % усяго тыража.

Прадуктам двумоўя стала так званая “трасянка”, якая ўзнікла шляхам механічнага змяшэння ў розных прапорцыях элементаў дзвюх моваў – рускай і беларускай. Трасянку складаюць стыхійна русіфікаваныя варыянты нацыянальнай мовы. У Беларусі трасянка набыла масавы характар. Большасць тых беларусаў, што лічаць сябе рускамоўнымі, ужываюць менавіта трасянку, у іх спантанным маўленні беларускамоўныя рысы выяўляюцца вельмі выразна і рэгулярна. Гэты феномен нясе з сабой пагрозы для нацыянальнай беларускай мовы. Трасянка пры дзяржаўным двухмоўі не толькі перашкаджае ў выхаванні культуры беларускага маўлення, але і можа набыць самастойны статус мовы. У такім выпадку ставіцца пад сумненне існаванне асобнай беларускай мовы. Да таго ж неапраўданае змешванне

рускай і беларускай мовы ўспрымаецца як паказчык нізкай маўленчай культуры.

Нягледзячы на неспрыяльныя сацыяльна-палітычныя ўмовы, у якіх часта аказвалася беларуская літаратурная мова, развіццё на ёй розных жанраў мастацкай, публіцыстычнай, навуковай літаратуры не спынялася на працягу XX ст. Дзякуючы featnabakovai творчасці майстроў слова, вучоных беларуская мова стала здатнай да таго, каб ствараць на ёй самыя разнастайныя па характары і змесце творы. На беларускай мове выдадзены шматтомныя галіновыя энцыклапедыі, слоўнікі, граматыкі, манаграфіі, на ёй існуе багатая і самабытная мастацкая і публіцыстычная літаратура.

## 1.4. Гістарычная памяць і роля асобы ў гісторыі

### 1.4.1. Роля гістарычнай памяці ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці

Гістарычная памяць прадстаўляе сабой усе віды інфармацыі аб мінулых падзеях, іх часе і месцы ў гісторыі, удзельніках гэтых падзей, а таксама здольнасць даражыць гістарычнымі традыцыямі свайго народа. Пры гэтым гістарычная памяць з'яўляецца не проста інфармацыяй, а мае шэраг важных функцый. Па-першае, гістарычная памяць з'яўляецца важнейшым кампанентам этнічнай самасвядомасці, дазваляе прасачыць гісторыю сваёй краіны і вызначыць адрозненні паміж народамі. Па-другое, яна з'яўляецца асновай фарміравання пачуцця патрыятызму, гонару за сваю краіну і свой народ. Па-трэцяе, гістарычная памяць пастаўляе мадэлі для развіцця. Ідэя "залатога веку" – часу найвялікшага росквіту – задае крытычнае стаўленне да сучаснай эпохі, заклікае да выпраўлення сітуацыі і вяртання ў ідэальны стан. З іншага боку, мінулае пастаўляе і мадэль заняпаду, трагічнага стану нацыі, абумоўленага пераважна чужародным умяшаннем. Гэта дазваляе згуртаваць нацыю з мэтай недапушчэння мінулых памылак.

Гістарычная памяць грала важную ролю і ў мінулым. Лічыцца, што ў крывічоў для абраду ініцыяцыі – пераходу ў дарослае жыццё і атрымання правоў дарослага чалавека – малады чалавек павінен быў назваць сваіх продкаў да пятага калена, бо адчуваючы сувязь з продкамі, чалавек ніколі не здрадзіць свайму народу. Важнае значэнне продкаў у жыцці беларусаў праявілася ў захаванні адпаведнага культу і народных святаў Дзяды і Радуніца.

У наш час гістарычная памяць праяўляецца на двух узроўнях: афіцыйным і пабытовым. Афіцыйны ўзровень праяўляецца праз дзяржаўную ідэалогію, дзяржаўныя святы і ўрачыстыя даты, сістэму гістарычнай адукацыі, аб'екты тапанімікі і ўрбаністыкі. Неафіцыйны, ці пабытовы ўзровень выражаецца праз навуковыя канцэпцыі, якія не прымаюцца дзяржавай, асабістыя погляды, "вусную" памяць, фальклорныя формы, у тым ліку і анекдоты. Афіцыйны і пабытовы ўзровень гістарычнай памяці могуць

не супадаць, што з’яўляецца звычыйным для дэмакратычнага грамадства, але калі ўзроўні гістарычнай памяці рэзка разыходзяцца, губляюць агульныя падыходы і супярэчаць адзін адному, гэта можа прывесці да сітуацыі, калі гістарычная памяць не зможа выконваць свае фунцыі, што ў сваю чаргу можа выклікаць раскол грамадства.

Важную ролю ў фарміраванні гістарычнай памяці складаюць вобразы гістарычных асоб, праз якіх і ідзе ўсведамленне гісторыі. Тут пачынаюць дзейнічаць два важных працэса – далучэнне (адчуванне сваёй прыналежнасці да народа) і суперажыванне (пачуццё гонару ці перажывання за лёс асобы і народа). Гэтыя вобразы ўтвараюць нацыянальны Пантэон. Тэрмін “Пантэон” (у старажытным Рыме – храм усіх багоў) мае некалькі значэнняў: 1) месца пахавання адметных дзеячаў (Вавель у Кракаве, Красная плошча ў Маскве); 2) адметныя дзеячы краіны (нацыянальныя героі, славутыя землякі). На наш час можна адзначыць, што нацыянальны пантэон Беларусі знаходзцца яшчэ на стадыі фарміравання, агульнага стаўлення да галоўных гістарычных асоб беларускай гісторыі не існуе. Гэта можна патлумачыць шэрагам фактараў, такіх як: несупадзенні афіцыйнай і пабытовай гістарычнай памяці; міфалагізацыя гісторыі; залішняя палітызацыя гісторыі, падзел грамадства на сваіх і чужых; уплыў замежных інфармацыйных прастораў.

## 1.4.2. Славутыя імёны Беларусі

### Вядомыя гістарычныя асобы Беларусі

**Рагвалод** —першы гістарычна вядомы князь Полацкі (? — 980), родапачынальнік дынастыі полацкіх князёў.

**Рагнеда Рагвалодаўна, Гарыслава (? — 1000)** — князёўна Полацкая, дачка Рагвалода, адна з жонак князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча.

**Ізяслаў Уладзіміравіч (каля 980 — 1001)** — князь Полацкі (каля 988—1001), заснавальнік роду Ізяславічаў. Сын вялікага князя кіеўскагаУладзіміра Святаславіча ў яго шлюбе з полацкай князёўнай Рагнедай Рагвалодаўнай. З Ізяславам Уладзіміравічам звязана ўзнаўленне полацкай княжацкай дынастыі Рагвалодавічаў і самастойнасці Полацкага княства. Даследчыкі мяркуюць, што пры ім адбылося прыняцце хрысціянства на Полаччыне, тут было створана адно з першых усходнеславянскіх епіскапстваў (992 г.), уведзена пісьменства, аб чым сведчыць княжацкая пячатка з надпісамі. Першы з усходнеславянскіх князёў, які ахарактарызаваны ў летапісу як кніжнік.

**Усяслаў Брачыславіч Чарадзей (1044 — 1101)** — князь Полацкі, вялікі князь Кіеўскі (1068—1069 гг.). Сын Брачыслава і невядомай (імя маці гісторыя не захавала). Паводле легендаў, паходжанне князя прыпісвалася чарадзейным сілам. Пры Ўсяславе адзначаецца найвышэйшы ўздым і тэрытарыяльнае пашырэнне Полацкага княства.

**Міндоўг (каля 1195 — 1263)** — першы вялікі князь Літоўскі (1246—1263), адзіны кароль літоўскі (1253—1261). Княжэнне Міндоўга прыйшлося на пачатак ВКЛ, якое першапачаткова ўключыла ў сябе ўсходнеславянскія і

балцкія землі ў Панямонні (якія цяпер уваходзяць у Рэспубліку Беларусь і Літоўскую Рэспубліку). Гэты працэс адбываўся ў сярэдзіне XIII ст. — у складаны час, калі, ў выніку пагрозы з боку крыжакоў і татара-манголаў склаліся цяжкія ўмовы для існавання славянскага і балцкага насельніцтва. Такія абставіны вымушалі Міндоўга шукаць шляхі для ўмацавання сваёй дзяржавы і неаднойчы змяняць саюзнікаў. У гісторыі Літоўскай Рэспублікі ВКЛ з'яўляецца княствам, з якога пачалася літоўская дзяржаўнасць, а Міндоўг — першым правіцелем літоўскай дзяржавы. У гісторыі Рэспублікі Беларусь, на землях якой дзяржаўнасць пачалася з больш ранніх Полацкага і Тураўскага княстваў, Міндоўг выступае як першы правіцель ВКЛ — дзяржавы, якая ў далейшым ахапіла ўсю сучасную тэрыторыю Беларусі, Літвы і шэраг суседніх зямель.

**Гедымін (~1275 — 1341)** — вялікі князь літоўскі (~1316—1341). У часы Гедыміна Вялікае Княства Літоўскае зрабілася моцнай ўсходне-еўрапейскай дзяржавай, яго тэрыторыя павялічылася ўдвая, з’явіліся мураваныя замкі ў Вільні, Медніках, Лідзе, Крэве, Віцебску. Узмацнілася запазычанне элементаў заходне-еўрапейскай культуры. Адначасна Гедымін заклаў падмурак рускаму вектару палітыкі ВКЛ, які развіваўся ў наступныя дзесяцігоддзі. Яго шматлікія нашчадкі ўтварылі дынастыю Гедымінавічаў.

**Вітаўт (1350 —1430)** — князь гарадзенскі (1370—1382), вялікі князь Літоўскі (1392—1430). Абвешчаны кароль гусітаў. Сын Кейстута, пляменнік Альгерда і стрыечны брат Ягайлы. Адзін з найбольш вядомых кіраўнікоў Вялікага Княства Літоўскага, яшчэ пры жыцці празваны Вялікім. Пры Вітаўце ВКЛ дасягае найбольшай магутнасці і з’яўляецца найбуйнейшай еўрапейскай краінай – ад Балтыйскага да Чорнага мора. 15 ліпеня 1410 г. Вітаўт разам з Ягайлам кіраваў сумесным польска-літвінскім войскам у Грунвальдскай бітве, якая паклала канец крыжацкай экспансіі ва Усходняй Еўропе.

## Славутыя вучоныя з Беларусі

**Георгій Каніскі (1717 – 1795)** —праваслаўны царкоўны і грамадскі дзеяч, пісьменнік. Аўтар «Мемарыяла аб крыўдах праваслаўным», “Правоў і вольнасці жыхароў грэчаскага веравызнання”, “Збору павучальных слоў”, “Запісак аб тым, што ў Расіі да канца XVI ст. не было ніякай уніі з Рымскай царквой”, духоўнага дзённіку “Думкі”, адказу на “Пісьмо Вальтэра да настаўнікаў царквы і багасловаў”, драмы “Уваскрэсенне мёртвых” і інш. Сабраў гэтак званы “Архіў Каніскага”, аснову якога склалі дакументы з архіва Калегіі замежных спраў Расіі.

**Ігнат Дамейка (1802 – 1889)** – нарадзіўся ў Навагрудскім павеце. Быў знакамітым геолагам, большую частку жыцця правёў у Чылі, дзе стаў нацыянальным героем. За свае дасягненні афіцыйна прызнаны ЮНЭСКО.

**Іван (Ян) Чэрскі (1845 – 1892)** – нарадзіўся ў маёнтку Свольна Віцебскай губерні. Знакаміты вучоны-географ, геолаг, даследчык Сібіры, імем якога названы шэраг геаграфічных аб'ектаў.

**Аляксандр Чыжэўскі (1897 – 1964)** – нарадзіўся ў Гродзенскай губерні. Прызнаны вучоны, які вывучаў біялагічнае ўздзеянне Сонца і Сусвету, у тым ліку суадносіны сонечнай актыўнасці з перыядамі войнаў у гісторыі чалавецтва.

**Соф'я Кавалеўская (1850 – 1891)** – першая ў свеце жанчына-прафесар матэматыкі паходзіць са шляхецкага беларускага роду. Дзяцінства правяла ў маёнтку Палібіна Віцебскай губерні, а ў 18 гадоў заключыла фіктыўны шлюб, каб паехаць за мяжу і займацца навукай. Працы Кавалеўскай прысвечаны матэматычнаму аналізу, механіцы, астраноміі.

**Павел Сухі (1895 – 1975) –** нарадзіўся ў г. Глыбокае Віцебскай вобласці. Авіяканструктар, вынаходнік, адзін са стваральнікаў рэактыўнай і звышгукавой авіяцыі, аўтар паўсотні арыгінальных канструкцый самалётаў, больш за трыццаць з якіх былі пабудаваны і выпрабаваны.

**Міхаіл Высоцкі (1928 – 2013)** – нарадзіўся ў в. Семежава Мінскай вобласці. Выдатны вучоны і канструктар, пад кіраўніцтвам якога ствараліся лепшыя аўтамабілі МАЗ, на працягу дзесяцігоддзяў генеральны канструктар па аўтамабільнай тэхніцы Беларусі. Аўтар 134 вынаходстваў і 17 патэнтаў. Герой Беларусі (2006 г.).

**Жарэс Алфёраў** – нарадзіўся ў Віцебску ў 1930 г. Алфёраў удастоены Нобелеўскай прэміі па фізіцы ў 2000 г. Даследаваў уласцівасці нанаструктур зніжаннай памернасці. Яго вынаходніцтвы дапамаглі інфарматыцы выйсці на новы ўзровень. Уладальнік шматлікіх дзяржаўных узнагарод і іншых знакаў пашаны Савецкага Саюза, а пазней – Беларусі, Расіі, Украіны, Швецыі, ЗША, Арменіі і інш.

## Адметныя ў мастацтве беларусы

### Выяўленчае мастацтва

**Марк Шагал (1887 – 1985)** – нарадзіўся ў Віцебску. Адзін з самых знакамітых ўраджэнцаў Беларусі, вядомы ва ўсім свеце як класік авангардызму ў выяўленчым мастацтве. Большую частку жыцця правёў у эміграцыі ў Францыі, але тэма роднага Віцебска была адной з асноўных у яго творчасці. Марк Шагал таксама добра вядомы як скульптар, керамік, майстар мазаік і габеленаў, але больш за ўсё як майстар вітража. Свае вітражныя работы ён ствараў для французскіх сабораў, і для храмаў Рэймса, Цюрыха, Майнца, будынкаў ААН у Нью-Ёрку, сінагогі Медыцынскага цэнтра ў Іерусаліме, гатычнага сабора ў Мецы.

**Напалеон Орда (1807 – 1883)** – мастак, кампазітар, ураджэнец в. Варацэвічы Пінскага павета. Стварыў больш за тысячу эскізаў збудаванняў Беларусі, Літвы, Польшчы, Францыі, якія з'яўляюцца каштоўнай крыніцай для гісторыкаў архітэктуры і рэстаўратараў Еўропы. У 2007 г. 200-годдзе з дня нараджэння Н. Орды было ўключана ў каляндар памятных дат ЮНЭСКО.

**Іван Хруцкі (1810 - 1885)** – нарадзіўся ў мястэчку Ула Лепельскага павета Віцебскай губерні. Выдатны мастак, які распрацаваў уласны тып нацюрморта ў спалучэнні з партрэтам. Заснавальнік жанру акадэмічнага

нацюрморта ў беларускім жывапісе. 200-годдзе з дня нараджэння Івана Хруцкага ў 2010 г. было ў календары памятных дат ЮНЭСКО.

**Міхаіл Савіцкі (1922 – 2010)** – нарадзіўся ў в. Звянячы Віцебскай вобласці. Герой Беларусі (2006). Народны мастак Беларусі, аўтар амаль 200 палотнаў, стваральнік унікальнай серыі карцін "Лічбы на сэрцы", прысвечанай вязням канцлагераў. Многія работы Міхаіла Савіцкага атрымалі сусветную вядомасць.

**Гаўрыла Вашчанка (1928 – 2014)** – нарадзіўся ў в. Чыкалавічы Гомельскай вобласці. Народны мастак Беларусі, жывапісец і педагог. “Чалавек года-92” і "Чалавек XX стагоддзя" (1993) па прызнанні Міжнароднага біяграфічнага цэнтра Кембрыджа. “Чалавек года-94” па версіі Амерыканскага біяграфічнага інстытута.

## Музыка, тэатр і кіно

**Станіслаў Манюшка (1819 – 1872)** — кампазітар, дырыжор, стваральнік польскай нацыянальнай оперы, меў дачыненне да станаўлення беларускай музычнай культуры. Папулярнасць кампазітар атрымаў у 1848 г., дзякуючы оперы “Галька”. Яшчэ адна шырока вядомая опера — “Страшны двор” была напісана ў 1865 г. С. Манюшка стварыў 20 опер і аперэт, тры балеты, пяць месаў, два рэквіемы і болей за 300 песень, у тым ліку і “Паходную песню літвінаў” на словы паэта У. Сыракомлі. Станіслаў Манюшка напісаў музыку да п’есы В. Дуніна-Марцінкевіча “Сялянка”, і ў сувязі з гэтай падзеяй прысутнічае ва ўсіх беларускіх даследаваннях, прысвечаных літаратуры, тэатру і музыцы сярэдзіны XIX ст.

**Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1808 – 1884)** – пісьменнік, заснавальнік новай беларускай літаратуры і прафесійнай драматургіі, стваральнік першага беларускага тэатральнага калектыву, акцёр. Шырокую вядомасць атрымалі яго творы “Ідылія” (“Сялянка”), “Пінская шляхта” і інш. 200-годдзе з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча было ўключана ў каляндар памятных дат ЮНЭСКО (2008 г.).

**Леон Бакст (1866 – 1924)** – славуты тэатральны мастак і сцэнограф, дэкаратар і мадэльер, партрэтыст і майстар станковага жывапісу, адзін з заснавальнікаў знакамітага аб'яднання “Свет мастацтва”. Сапраўднае імя - Лейб-Хаім Розенберг, нарадзіўся ў Гродна, а з першымі поспехамі ўзяў у якасці псеўданіма скарочанае прозвішча бабулі (Бакстэр). Сусветную вядомасць Леон Бакст заваяваў дзякуючы сумеснай рабоце з Сяргеем Дзягілевым, па запрашэнні якога бліскуча аформіў пастаноўкі легендарных “Рускіх сезонаў” у Парыжы.

**Луіс Барт Маер (1885 – 1957)** – нарадзіўся ў Мінску. Кінематаграфіст Луіс Барт Маер найбольш вядомы як адзін з заснавальнікаў галівудскай кінастудыі “Метра-Голдвін-Маер”, а таксама амерыканскай Акадэміі кінематаграфічных мастацтваў і навук. Менавіта Маер прапанаваў штогод уручаць прэмію “Оскар”.

**Уладзімір Мулявін (1941 – 2003)** – яркі выканаўца, кампазітар і аранжыроўшчык, збіральнік беларускага фальклору, стваральнік

легендарнага ансамбля “Песняры” (1970 г.), які многія гады быў адным з самых папулярных у Савецкім Саюзе. Народны артыст БССР і СССР, кавалер ордэна Францыска Скарыны (2001 г.). Імя Уладзіміра Мулявіна, які стаў беларусам па духу, а не па нараджэнні, увекавечана на Алеі зорак у Маскве (2001 г.) і сталіцы фестывалю “Славянскі базар” у г. Віцебску.

## Літаратура

**Адам Міцкевіч (1798 — 1855)** — паэт, публіцыст, асветнік, дзеяч нацыянальна-вызваленчага польскага руху, сябар Таварыства філаматаў. Некаторымі з беларускіх літаратараў А. Міцкевіч вызнаецца як адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і беларускага польскамоўнага паэта. Вядомы сваімі баладамі, паэтычнымі апавяданнямі: драмай “Дзяды” і паэтычнай эпапэяй “Пан Тадэвуш”, якая прызнаная апошнім вялікім эпасам шляхецкай культуры. Сярод іншых уплывовых твораў Міцкевіча вылучаюцца паэмы “Конрад Валенрод” і “Гражына”.

**Францішак Багушэвіч (1840 — 1900)** — беларускі грамадскі дзеяч, паэт, празаік, публіцыст і перакладчык. Адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, яе класік. Літаратурная творчасць і грамадская дзейнасць Ф. Багушэвіча абуджалі нацыянальную самасвядомасць беларусаў, яго ідэйная спадчына з'явілася фундаментам ідэалогіі беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XX ст. Увосень 1891 г. у Кракаве выходзіць першы зборнік паэта “Дудка беларуская” пад псеўданімам Мацей Бурачок. Пры жыцці паэта пад псеўданімамі былі надрукаваны вершаваны зборнік “Смык беларускі” (Познань, 1894) і апавяданне “Тралялёначка” (Кракаў, 1892 г.).

**Алаіза Пашкевіч (1876 – 1916)** беларуская паэтэса (літаратурны псеўданім **Цётка**), грамадскі дзеяч, публіцыст. Цётка адна з пачынальніц беларускай прозы. Яе апавяданні адлюстроўваюць настроі студэнцкай моладзі (“Зялёнка”), цяжкі вясковы побыт (“Навагодні ліст”), гаротны лёс дзяцей, замучаных нечалавечымі ўмовамі жыцця ў капіталістычным грамадстве (“Міхаська”). Апавяданне “Прысяга над крывавымі разорамі” друкавалася ў якасці пракламацыі. Пяру Цёткі належаць кніжкі і падручнікі для дзяцей “Лемантар”, “Гасцінец для малых дзяцей”, “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, публіцыстычныя артыкулы і нарысы, даследаванні па гісторыі беларускага тэатра.

**Янка Купала, сапр. Іван Дамінікавіч Луцэвіч (1882 – 1942)** беларускі паэт, драматург, публіцыст, перакладчык, класік беларускай літаратуры, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Рэдактар першай беларускай легальнай газеты “Наша ніва”. Творчасць Я. Купалы накіравана на абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў і змаганне за свабоду. Народны паэт Беларусі (1925). Акадэмік АН БССР (1928), АН УССР (1929). Загінуў пры невысветленных абставінах у Маскве.

**Якуб Колас, сапр. Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч (1882 – 1956)** беларускі паэт, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны,

педагог, грамадскі дзеяч; адзін з заснавальнікаў (з Янкам Купалам) сучаснайбеларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Адным з найбольш вядомых твораў Коласа з’яўляецца паэма “Новая зямля”, якую называюць энцыклапедыяй сялянскага жыцця. Народны паэт Беларусі (1926 г.), акадэмік АН Беларусі (1928 г.), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1944 г.).

**Максім Багдановіч (1891 – 1917)** беларускі паэт, публіцыст,літаратуразнавец, перакладчык; класік беларускай літаратуры, адзін са стваральнікаў беларускай літаратуры і сучаснай літаратурнайбеларускай мовы. Багдановіч выступаў як крытык і гісторык літаратуры. Распачынальнік традыцыі беларускага мастацкага перакладу. Спадчына Максіма Багдановіча ўвайшла ў залаты фонд беларускай культуры. Некаторыя вершы сталі народнымі песнямі (“Зорка Венера”, “Слуцкія ткачыхі”), многія пакладзены на музыку кампазітарамі.

**Васіль Быкаў (1924 – 2003)** – беларускі празаік, драматург, публіцыст. Нарадзіўся ў в. Бычкі Ушацкага раёну Віцебскай вобласці. Народны пісьменнік Беларусі (1980 г.). Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1959 г. Уладальнік шматлікіх дзяржаўных узнагарод і званняў. У 1980 г. атрымаў званне Народнага пісьменніка Беларусі. У 1990 – 1993 гг. – прэзідэнт аб’яднання беларусаў свету “Бацькаўшчына”. Апошнія гады жыцця Васіля Быкава прайшлі за мяжой, але на сконе дзён творца ўсё ж вярнуўся ў Беларусь. У творчасці В. Быкава гучыць тэма чалевечнасці і маральнага выбара. Сярод яго твораў: кнігі “Жураўліны крык”, “Знак бяды” “На крыжах”, “Сцяна” , “Крыжовы шлях” , “Пахаджане” , “Доўгая дарога дадому”, “Грамадзянін свету” , “Бліндаж” , “Дажыць да зялёнай травы” і інш.

**Сяргей Грахоўскі (1913 — 2002)** беларускі паэт, празаік і перакладчык. Аўтар нарысу “Горад маладосці”, зборніка апавяданняў “Які вялікі дзень”, дакументальных аповесцяў “Рудабельская рэспубліка” (пастаўлены тэатрамі імя Я. Купалы і Гомельскім абласным драматычным у 1968 г.; у 1972 г. створаны аднайменны кінафільм), “Суровая дабрата”, аповесцяў “Ранні снег”, “Гарачае лета”, “Сустрэча з самім сабою”, “Споведзь” (вершы, аўтабіяграфічныя аповесці), кнігі ўспамінаў “Так і было”. Выступаў і як публіцыст. Выдаў кнігу “Мінск” (1971 г.) і нарыс на маральна-этычную тэму “Бацькі і дзеці” (1972 г.). Аўтар успамінаў пра перыяд рэпрэсій (аўтабіяграфічная трылогія “Такія сінія снягі”; “Зона маўчання”; “З воўчым білетам”).

**Уладзімір Караткевіч (1930 – 1984)** беларскі паэт,празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, сцэнарыст, класік беларускай літаратуры. Адна з найбольш яскравых постацей у беларускай літаратуры другой паловы XX ст. Першы беларускі пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву. Творчасць Уладзіміра Караткевіча адрозніваецца рамантычнай скіраванасцю, высокай мастацкай культурай, патрыятычным пафасам і гуманістычным гучаннем. Пісьменнік істотна ўзбагаціў беларускую літаратуру ў тэматычных і жанравых адносінах, напоўніў яе інтэлектуальным і філасофскім зместам. Найбольш вядомыя такія творы аўтара, як аповесці “Дзікае паляванне караля

Стаха", "Сівая легенда", раманы "Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чорны замак Альшанскі", нарыс "Зямля пад белымі крыламі".

**Святлана Алексіевіч (нар. у 1948 г.)** – беларуская пісьменніца і журналіст, аўтар кніг "У вайны не жаночы твар", "Апошнія сведкі", "Цынкавыя хлопчыкі", "Зачараваныя смерцю", "Чарнобыльская малітва", "Апошнія сведкі. Сола для дзіцячага голасу", "Час сэканд хэнд". У 2015 г. Святлана Алексіевіч названа лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры: "за яе шматгалосую творчасць – помнік пакутам і мужнасці ў наш час".

## Вядомыя палітыкі і дзяржаўныя дзеячы з Беларусі

**Канстанцін Астрожскі (1460 – 1530)** —дзяржаўны дзеяч ВКЛ, мецэнат. Вялікі гетман літоўскі (1497—1500, 1507—1530), маршалак валынскі і староста луцкі (з 1499 г.), кашталян віленскі (1513—1522), ваявода троцкі (1522—1530). Выдатны палкаводзец, пад кіраўніцтвам якога атрыманы перамогі больш чым у 60-ці бітвах, у тым ліку ў бітве пад Оршай (1514 г.).

**Леў Сапега (1557 – 1633)** – дзяржаўны і ваенны дзеяч, гетман Вялікага Княства Літоўскага, дыпламат, мысліцель. Адзін з галоўных стваральнікаў Статута ВКЛ 1588 г. – выдатнага помніка прававой і палітычнай думкі, па сутнасці першай канстытуцыі ў Еўропе.

**Тадэвуш Касцюшка (1746 – 1817)** нарадзіўся ў Беларусі ў 1746 г., з'яўляецца нацыянальным героем Беларусі, Амерыкі і Польшчы. Прымаў удзел у вайне за незалежнасць ЗША, быў кіраўніком нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. ў Рэчы Паспалітай. Імя Т. Касцюшкі носіць самая высокая гара Аўстраліі.

**Міхал Клеафас Агінскі (1765 – 1833)** – дыпламат, палітычны дзеяч, удзельнік паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, таленавіты кампазітар. Знакаміты паланэз "Развітанне з Радзімай" ён напісаў у радавой сядзібе Агінскіх у Залессі (Гродзенская вобласць). 250-годдзе з дня нараджэння М.-К. Агінскага ўключана ў каляндар памятных дат ЮНЭСКО на 2014–2015 гг.

**Мікалай Судзілоўскі (1850 – 1930)** – філосаф, прыродазнаўца, рэвалюцыянер, удзельнік грамадска-палітычных рухаў Беларусі, Расіі, Швейцарыі, Румыніі, Англіі,Францыі, ЗША, Японіі, Кітая і інш. краін. Прэзідэнт Сената Гавайскіх астравоў. Падарожнік-географ, аўтар публіцыстычных твораў, спецыяліст у галінеэтнаграфіі, энтамалогіі, хіміі, біялогіі, аграноміі. Адкрыў шэраг астравоў цэнтральнай часткі Ціхага акіяна, пакінуў каштоўныя геаграфічныя апісанні Гаваяў і Філіпінаў. Доктар, з імем якога звязаныя пэўныя дасягненні ў хірургіі, тэорыі туберкулёзу і іншых хвароб. Яму належаць некалькі важных прац па медыцыне.

**Іосіф Гашкевіч (1814 – 1872).** Нарадзіўся ў у Рэчыцкім павеце (Гомельская вобласць). Дыпламат, навуковец-усходазнавец, падарожнік, першы консул Расійскай Імперыі ў Японіі і аўтар першага ў свеце японска-рускага слоўніка. Імем Гашкевіча названыя апісаныя ім віды насякомых і

заліў у Паўночнай Карэі (Чосанман). 200-годдзе з дня нараджэння І. Гашкевіча ўключана ў каляндар памятных дат ЮНЭСКО на 2014 – 2015 гг.

**Зміцер Жылуновіч (1887 – 1937)** – беларускі пісьменнік, паэт (літаратурны псеўданім **Цішка Гартны**) і перакладчык, грамадскі і дзяржаўны дзеяч, акадэмік АН БССР (1928 г.). З. Жылуновіч – аўтар Маніфеста аб утварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, першы старшыня Ўрада ССРБ.

**Вацлаў Ластоўскі (1883 – 1938)** – беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, пісьменнік, гісторык, філолаг, літаратуразнавец, этнограф. З 1919 г. член Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПС-Р). У снежні 1919 г. узначаліў Кабінет міністраў Народнай рады БНР. Працаваў у Міністэрстве беларускіх спраў у Літве. У 1923 – 1927 гг. выдаваў часопіс "Крывіч", надрукаваў некалькі падручнікаў. Узначальваў "Камітэт 400-летняга юбілею беларускага друку: 1525—1925". Быў старшынёй арганізацыі "Сувязь нацыянальна-дзяржаўнага вызвалення Беларусі", ад імя якой выступаў за выкарыстанне беларускай мовы ў богаслужэннях. Запрошаны Інбелкультам на акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі (лістапад 1926 г.), на якой абраны старшынёй Графічнай камісіі, выступіў прыхільнікам кірылічнага шрыфту. Пад націскам неспрыяльных абставін у красавіку 1927 г. пераехаў у БССР. Працаваў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, загадчыкам кафедры этнаграфіі пры Інбелкульце, не маючы нават сярэдняй адукацыі. З 1928 г. акадэмік БелАН. Быў неадменным сакратаром Інбелкульта. Рэдагаваў "Працы кафедры этнаграфіі", працаваў у "Камісіі жывой беларускай мовы", уваходзіў у "Камісію па ахове помнікаў старасвтечыны ў БССР". Арганізоўваў этнаграфічныя экспедыцыі ў розныя рэгіёны Беларусі, у час адной з іх знойдзены Крыж Ефрасінні Полацкай. У1930 г. арыштаваны, у 1938 г. прыгавораны да расстрэлу "як агент польскай разведкі і ўдзельнік нацыянал-фашысцкай арганізацыі". Рэабілітаваны ў 1988 г.

**Хаім Вейцман (1874 – 1952)** – нарадзіўся ў Беларусі ў вёсцы Моталь (зараз Іванаўскі раён, Брэсцкая вобласць). Хаім Вейцман быў выдатным хімікам, чытаў лекцыі ў Швейцарыі і Вялікабрытаніі. Як актыўны сіяніст ён быў выбраны першым прэзідэнтам Дзяржавы Ізраіль (1949) і заставаўся на гэтай пасадзе да самай смерці.

**Андрэй Грамыка (1909 – 1989)** – нарадзіўся ў в. Старыя Грамыкі (Веткаўскі раён Гомельскай вобласці). Дыпламат, у 1957 – 1985 гг. міністр замежных спраў СССР. Узначальваў савецкую дэлегацыю на канферэнцыі па стварэнню ААН.

## Знакамітыя асветнікі Беларусі, прадстаўнікі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі

**Ефрасіння Полацкая** – беларуская асветніца XII ст., полацкая князёўна, стала манашкай у 12 гадоў і правяла жыццё, дапамагаючы бедным і будуючы цэрквы і манастыры па ўсёй Беларусі. Памерла ў час паломніцтва ў

Іерусалім, яе мошчы вернуты ў Беларусь у 1910 г. Прылічана да ліку святых, ушаноўваецца як нябесная заступніца зямлі беларускай.

**Кірыла Тураўскі (1113 — каля 1182)** — царкоўны дзеяч XII ст., епіскап Тураўскі (магчыма, з 1159/1161 па 1177) — святы праваслаўнай царквы; аўтар вядомых царкоўна-асветніцкіх і царкоўна-літаратурных твораў. Сучаснікамі быў называны Залатавустам.

**Мікалай Гусоўскі (~1470 —пасля 1533)** —беларускі і польскі паэт, гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння. Пісаў у публіцыстычным, эпічным, гераічным, лірычным, гістарычным і сатырычным жанрах. Самым знакамітым творам М. Гусоўскага лічыцца паэма "Песня пра зубра".

**Францыск Скарына (~1490 – ~1551)** – нарадзіўся ў Полацку. Беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар. Атрымаў выдатную адукацыю – скончыў Кракаўскі ўніверсітэт, атрымаў ступень доктара медыцыны ў Падуанскім універсітэце (Італія). З'яўляўся сакратаром дацкага караля. Каля 1517 г. заснаваў у Празе першую ў гісторыі ўсходнеславянскіх народаў друкарню, у якой 6 жніўня 1517 г. выдаў першую друкаваную беларускую кнігу — "Псалтыр". Усяго пераклаў на старабеларускую мову і выдаў 23 кнігі Бібліі. Працягнуў друкарскую дзейнасць ў Вільні, дзе выдае "Малую падарожную кніжыцу" (1522 г.) і "Апостал" (1525 г.). У 30-я гады працаваў галоўным садоўнікам пры двары чэшскага караля.

**Васіль Цяпінскі-Амельяновіч (~1530 – 40-я — 1603)** — гуманіст-асветнік, пісьменнік, кнігавыдавец, перакладчык. Васіль Цяпінскі прадоўжыў гуманістычныя і культурна-асветніцкія традыцыі Францыска Скарыны, быў асабіста і ідэйна звязаны з Сымонам Будным, падзяляў яго грамадска-палітычныя і рэлігійныя погляды. Пераклаў і выдаў на старабеларускай мове Евангелле. Выступаў з ідэямі захавання нацыянальнай мовы і культуры.

**Сымон Будны (~1530 — 1593)** — дзеяч беларускай культуры, гуманіст, філосаф, асветнік, гісторык Вялікага Княства Літоўскага. Актыўны ўдзельнік рэфармацыйнага руху, адзін з заснавальнікаў навуковай крытыкі Бібліі. Творы С. Буднага паводле іх зместу пераважна палемічныя і філасофска-публіцыстычныя, з выразнай дыдактычнай скіраванасцю. Яго Катэхізіс ("Катэхізіс, або Навука старадаўняя хрысціянская для простых людзей", Нясвіж, 1562) прываблівае чытачоў зместам і манерай выкладання матэрыялу, логікай разважанняў і пераканаўчасцю доказаў.

**Сімяон Полацкі (1629 — 1680)** — праваслаўны і грэка-каталіцкі дзеяч, духоўны пісьменнік. Нарадзіўся ў Полацку, але значную частку жыцця правёў ў Маскве. Быў выхавацелем царскіх дзяцей (сярод іх быў будучы расійскі імператар Пётр І), заснаваў Славяна-грэка-лацінску акадэмію – першую вышэйшую навучальную ўстанову на тэрыторыі Рускай дзяржавы. З'ўляецца пачынальнікам рускай паэзіі, аўтар твораў "Рыфмалагіён", "Вертаград" і інш.

## Касманаўты – ураджэнцы Беларусі

**Пётр Клімук** – першы беларускі касманаўт, вучоны ў галіне тэхнічных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў в. Камароўка Брэсцкага р-на ў 1942 г. Ажыццявіў тры палёты ў складзе экіпажаў касмічных караблёў і арбітальных комплексаў, правёў у космасе 78,76 сутак.

**Уладзімір Кавалёнак** – беларускі касманаўт, вучоны ў галіне ваенных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў в. Белае Мінскай вобласці ў 1942 г. Ажыццявіў тры палёты ў космас у якасці камандзіра экіпажа, правёў у космасе 216,38 сутак, у тым ліку ў адкрытым космасе 2,3 гадзіны.

**Алег Навіцкі** – нарадзіўся ў 1971 г. ў г. Чэрвень Мінскай вобласці. Да паступлення ў атрад касманаўтаў служыў ваенным лётчыкам, ветэран баявых дзеянняў. Першы беларускі касманаўт, які ўзначаліў у 2013 г. экіпаж 34-й міжнароднай экспедыцыі на МКС.

**Выдатныя спартыўныя дзеячы**

**Аляксандр Мядзведзь** – беларускі спартсмен і трэнер (вольная барацьба). Чэмпіён Алімпійскіх гульняў (1964, 1968, 1972), свету (1962, 1963, 1966, 1967, 1969 – 1971). Прызнаны лепшым барцом вольнага стылю XX стагоддзя.

**Вольга Корбут** – легендарная гімнастка заваявала 4 залатыя алімпійскія медалі, тры з іх – на алімпійскіх гульнях у Мюнхене (1972). У 1972 г. прызнана лепшай спартсменкай свету.

**Віталь Шчэрба** – беларускі спартсмен (спартыўная гімнастыка). Чэмпіён XXV Алімпійскіх гульняў (1992, Іспанія). Бронзавы прызёр XXVI Алімпійскіх гульняў (1996, ЗША). 14-разовы чэмпіён свету, 10-разовы чэмпіён Еўропы. Пераможца Гульняў добрай волі (1990, ЗША). Чэмпіён Універсіяд (1993, 1995). Лепшы спартсмен свету за 10-годдзе (1991–2000).

**Юлія Несцярэнка** – заваявала залаты медаль у бегу на 100 метраў на Алімпійскіх гульнях у Афінах ў 2004 г.

**Максім Мірны** – самы вядомы тэнісіст Беларусі, які заваяваў серыю міжнародных узнагарод у парным разрадзе і вывеў беларускую зборную на лепшае месца за ўсю яе гісторыю на Кубку Дэвіса.

**Вікторыя Азаранка** – знакамітая беларуская тэнісістка, пераможца найбуйнейшых сусветных турніраў, алімпійская чэмпіёнка. У студзені 2012 г. Вікторыя Азаранка ўпершыню ў кар'еры ўзначаліла рэйтынг Жаночай тэніснай асацыяцыі (WTA). На Алімпіядзе-2012 у Лондане заваявала золата ў міксце (у пары з Максімам Мірным) і бронзу ў адзіночным разрадзе.

**Дар’я Домрачава** – трохразовая чэмпіёнка Алімпійскіх гульняў у Сочы (2014 г.) у гонцы праследавання, індывідуальнай гонцы на 15 км, мас-старце (12,5 км), бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Ванкуверы (2010 г.) у індывідуальнай гонцы на 15 км. За спартыўныя дасягненні Дар’і Домрачавай прысвоена званне Герой Беларусі.

**Аляксей Грышын** – фрыстайліст, які прынёс Беларусі першае ў гісторыі незалежнай дзяржавы золата зімовых Алімпійскіх гульняў (Ванкувер-2010), бронзавы прызёр Алімпіяды ў Солт-Лэйк-Сіці (2002 г.).

**Сяргей Мартынаў** – “Кароль малакалібернай вінтоўкі”, алімпійскі чэмпіён Лондана-2012, двухразовы бронзавы прызёр Алімпіяд у Сіднэі і Афінах, рэкардсмен свету: 600 ачкоў з 600 магчымых у стральбе лежачы з малакалібернай вінтоўкі.

**Руслан Салей** – адзін з найлепшых ігракоў у гісторыі беларускага хакея, капітан нацыянальнай зборнай. Руслан Салей першым з айчынных хакеістаў дайшоў да фіналу Кубка Стэнлі.

**Аляксандра Герасіменя** – беларуская плыўчыха. Чэмпіёнка свету па плаванні 2011 г., чэмпіёнка і срэбраны прызэр чэмпіянату Еўропы 2010 г. На Алімпійскіх гульнях 2012 г. выйграла 2 срэбраных медалі. У 2016 г. стала бронзавай алімпійскай прызёркай**.**

# Раздзел 2. Сістэма светапогляду, жыццёвых арыенціраў і маральных каштоўнасцей беларускага грамадства

## 2.1. Сістэма светапогляду, жыццёвых арыенціраў і маральных каштоўнасцей беларускага грамадства

### 2.1.1. Асаблівасці дахрысціянскага і хрысціянскага сярэднявечнага светапогляду

У дахрысціянскі час жыхары Беларусі былі язычнікамі, верылі ў мноства багоў і пакланяліся прыродзе. Гэта абумовіла пэўныя рысы іх светапогляду:

1. Політэізм (шматбожжа). Кожнай з'яве прыроды і жыцця чалавека адпавядала пэўная звышнатуральная істота. Пярун быў богам маланкі і грому, Сварог – бог неба. Людзі верылі ў духаў леса – лесавікоў, вады – вадзянікоў і русалак і інш.
2. Пакланенне прыродзе. Прырода разглядалася як вышэйшая сіла, якая як дае чалавеку жыццё, так можа яго і пазбавіць. Адносіны да навакольнага свету былі вельмі ашчадныя – чалавек браў толькі тое, што яму патрэбна.
3. Уяўленні аб часе былі звязаны з прыродным цыклам змены сезонаў, што абвяшчала магчымасць паўтору падзей і бясконцасці часу.
4. Уяўленні аб прасторы таксама звязваліся з прыродай. Засвоеная чалавекам прастора была бяспечнай для жыцця, тады як прыродная – незасвоеная, разглядалася як непрымальная для чалавека. Целаснае ўяўленне аб свеце фактычна адсутнічала, нават да жыхароў суседніх паселішчаў ставіліся падазрона. Гэтая рыса існавала яшчэ ў XIX ст. ў некаторых сельскіх мясцовасцях Беларусі.
5. Сацыяльныя адносіны вызначаліся кроўна-сваяцкімі сувязямі і рэгламентаваліся звычаёвым правам, дзе існавалі прынцыпы "вока за вока" і традыцыі кроўнай помсты.

У канцы X ст. на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваецца хрысціянства, што аказвае значны ўплыў на розныя сферы чалавека і на яго светапогляд. Але пэўны перыяд язычніцкі і хрысціянскі светапогляд суіснуюць разам – гэтую з'яву ў гісторыі называюць двухвер'е. Пэўныя перажыткі язычніцтва захаваліся і да нашых дзён.

З прыняццем хрысціянства на змену політэізму прыходзіць монатэізм (адзінабожжа) з тэзісам аб Боге, як адзіным творцы сусвету. Прынцып лінейнасці часу абумовіў непаўторнасць гістарычных падзей. Чалавечае зямное жыццё разглядаецца як падрыхтоўка да жыцця пасля смерці, адсюль узнікае фаталізм – вера ў нязменнасць лёсу. Змяняюцца ўяўленні аб прасторы – зямная частка разглядаецца як адзінае цэлае, у выніку чаго ўзнікае своеасаблівы сярэднявечны касмапалітызм – адсутнасць прывязнасці чалавека да пэўнай краіны. Сацыяльныя адносіны рэгламентуюцца нормамі

хрысціянскай маралі і запаведзяў, што значна павысіла маральнае аблічча людзей. Разам з гэтым чалавек разглядаўся як асоба грахоўная, няздольная да самаўдасканалення, сацыяльная няроўнасць тлумачыцца расплатай за былыя грахі. Але у Беларусі, у адрозненні ад Заходняй Еўропы тэзіс аб калектыўнай адказнасці і магчымасці пазбаўлення ад грахоў праз выкуп (індульгенцыю) не атрымаў распаўсюджвання.

У межах хрысціянскага светапогляду адбывалася фарміраванне філасофскай думкі ў Беларусі. З распаўсюджваннем ідэй хрысціянства адбываецца далучэнне беларускіх зямель да кніжных традыцый, знаёмства з творамі антычных і еўрапейскіх філосафаў. Прадвеснікам філасофскай думкі стала асветніцкая дзейнасць такіх персаналій як Евфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі і інш.

**Ефрасіння Полацкая** – беларуская асветніца, сімвал самаадданага служэння высакародным ідэалам і вернасці сваей радзіме, актыўны прапагандыст праваслаўя. Звесткі пра дзейнасць Ефрасінні дайшлі да нас з “Жыцця Ефрасінні Полацкай”, дзе сцвярджаецца неабходнасць пашырэння ведаў, любові да кнігі, духоўнага ўдасканалення, самаадданага служэння вышэйшым маральным ідэалам. З летапісаў вядома, што яна займалась пераводамі Біблії і перапіскай твораў рэлігійна-маральнага зместу. Ефрасіння заснавала ў Полацку жаночы і мужчынскі манастыры, на яе грошы былі пабудаваны дзве царквы, па заказе быў зроблены напрастольны шасціканцовы крыж для царквы святога Спаса – найкаштоунейшая нацыянальная святыня, выдатны ўзор прыкладнога мастацтва XII ст. Канкрэтную духоўную мэту і сэнс свайго служэння Ефрасіння бачыла у сцвярджэнні хрысціянскіх маральных прынцыпаў існавання чалавека. Яе дзейнасць – гэта яскравы прыклад кардынальных духоўных зрухаў, што адбываліся ў грамадска-культурным жыцці Беларусі ў XII ст., калі закладваўся фундамент новага разумення свету, сцвярджэння духоўнай самакаштоўнасці чалавека.

**Кірыла Тураўскі** – пісьменнік, прапаведнік, царкоўны дзеяч. Атрымаў добрае хатняе выхаванне, пазней вучыўся ў грэчаскіх настаўнікаў, добра ведаў візантыйскую культуру. У раннім узросце стаў паслушнікам аднаго з тураўскіх манастыроў. У манастыры ён пачаў літаратурную дзейнасць, каля 1169 г. прыняў епіскапства. Яго працы лічыліся класічнымі ўзорамі багаслоўскага красамоўства і на працягу стагоддзяў карысталіся папулярнасцю. К. Тураўскі выступаў за яднанне славян, за цэнтральную ўладу, якая спрыяла б спыненню міжусобіц і ўмацаванню духоўнай улады. У творах К. Тураўскага ўпершыню на нашай зямлі выразна акрэслівалася кола філасофскіх праблем. Напрыклад, праблема сутнасці чалавека вырашаецца на аснове дуалізму: душа і цела сутнасна непарыўныя. К. Тураўскі прыходзіць да высновы, што розум чалавека, яго інтэлект з'яўляюцца вышэйшай праявай жыцця, таму ён заклікае чытаць кнігі і браць з іх мудрасць, бо начытанасць у значнай ступені вызначае ўзровень інтэлекта чалавека. Аднак нават самы мудры чалавек не можа прыпадобніцца Хрысту таму, што Бог валодае звышнатуральнай, а не чалавечай прыродай, не мае якаснасці і меры. З

літаратурнай спадчыны К. Тураўскага да нас дайшлі 8 слоў-казанняў, прытчы, 2 казанні пра манаскі чын і ангельскі вобраз, 2 пасланні да Васіля ігумена Пячорскага, 2 каноны і каля 30 спавядальных малітваў.

**Клімент Смаляціч (? – пасля 1164)** – мысліцель, асветнік, царкоўна-палітычны дзеяч. Прыхільнік развіцця ўсходнеславянскай культуры. Яго творчасць вельмі патрыятычна. Смалятіч імкнуўся садзейнічаць царкоўнай незалежнасці ад Візантыі, а таксама развіццю усходнеславянскіх мясцовых традыцый. К. Смалятіч быў пераканаыы ў тым, што ўсе існае мае мэтазгодную будову (сілай боскай). Бог – абсалютная непазнавальная істота, якая, аднак, можа пазнавацца ў сваіх тварэннях. Такім чынам чалавек становіцца на шлях пазнання, калі адкрывае для сябе разумную пабудову свету і знаходзіць вышэйшы сэнс ў сваім існаванні. Арганізацыя быцця дае чалавеку магчымасць праз учынкі далучацца да Бога альбо аддаляцца ад яго (са свайго боку Бог садзейнічае збліжэнню з чалавекам, калі той імкнецца да гэтага). Чалавек валодае свабоднай воляй – гэта найвышэйшы дар. Але свабода ўчынкаў – гэта напамін пра тое, што чалавеку, які створаны па ўзору і падабенству Бога неабходна імкнуцца да маральнага ўдасканалення. Такім чынам падкрэсліваецца духоўна-маральная прырода чалавека. Важнае месца ў светапоглядзе мысліцеля займае ідэя няхцівасці, у тым ліку накшталт царкоўнай маёмасці. Смалятіч ясна і дакладна выказваецца аб неабходнасці памкнення да найвышэйшых каштоўнасцей быцця, захавання маральнай чысціні думак і ўчынкаў – што і зараз гучыць вельмі надзённа і сучасна.

### 2.1.2. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі перыяду Адраджэння і Рэфармацыі

У другой палове XVI ст. ў Вялікім княстве Літоўскім распаўсюджваюцца ідэі еўрапейскага Адраджэння (Рэнесанса), заснаваныя на прынцыпах антрапацэнтрызма і гуманізма. У адрозненні ад сярэднявечных поглядаў на чалавека як на грахоўную істоту, дзеячы Адраджэння разглядалі чалавека як цэнтр сусвету і прызнавалі чалавечае жыццё як галоўную каштоўнасць. Працягам Адраджэння стала Рэфармацыя – рух XVI – XVII стст. за перабудову каталіцкай царквы, які прывёў да ўзнікнення новай канфесіі – пратэстантызма. Ідэолагі Рэфармацыі – М. Лютэр, Ж. Кальвін – выступалі супраць умяшальніцтва царквы ў свецкія справы, супраць багатых уладанняў царквы і раскошы храмаў, супраць дагмата аб тым, што царква з’яўляецца адзіным пасрэднікам паміж Богам і чалавекам.

Рэфармацыя аказала вялікі ўплыў на эканамічнае і палітычнае жыццё краіны, адбыўся ўзлёт айчыннай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі, афармілісяя ідэалы нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. У ВКЛ дастаткова моцна зацвердзіліся прынцыпы верацярпімасці і палітычнай волі, прынцыпу падзелу ўладаў, вяршэнства закона, сацыяльнай роўнасці, якія былі ўвасоблены ў трэцім Статуце ВКЛ 1588 г. Важнай асаблівасцю адраджэнскай філасофіі на Беларусі з'яўляецца тое, што асноўнае развіццё

атрымаў не прынцып індывідуальнай свабоды, а практычная накіраванасць вырашэння праблемы гарманізацыі грамадскага жыцця.

Прадстаўнікамі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі гэтага перыяду былі Ф. Скарына, М. Гусоўскі, С. Будны, М. Літвін, В. Тяпінскі, А. Волан, Л. Сапега.

**Францыск Скарына** – мысліцель-гуманіст, пісьменнік, першадрукар, вучоны. Заснавальнік беларускай нацыянальна-патрыятычнай традыцыі. Першы ўсходнеславянскі перакладчык і выдавец Біблii, якую разглядаў як сродак маральнага выхавання чалавека. Пазіцыя Скарыны носіць выяўлены антрапацэнтрычны характар. У сваіх каментарах да выдадзеных кніг Ф. Скарына асэнсоўвае рэлігійныя і сацыяльныя праблемы з пазіцый гуманізму. Разглядае чалавека як істоту маральную, разумную, грамадскую і дасканалую. Выступае за актыўнае жыццё на карысць грамадства. Як хрысціянін, ў поглядах на паходжанне свету прытрымліваецца пазіцыі крэацыянізму (тэорыя, згодна з якой свет створаны Богам з нічога). Размяжоўваючы веру і веды, Скарына прыходзіць да высновы, пра неабходнасць авалодання навукамі, паказвае на важнасць пастаяннага ўдасканалення кожнага чалавека, што будзе спрыяць гарманізацыі грамадскіх адносін. Ф. Скарына ў якасці найвялікшага грамадскага дабра аб'яўляе законнасць, прапаведуе новыя прававыя ідэі. Паказвае, што закон і права, развітая судовая сістэма з'яўляюцца асновай гарманічнага развіцця грамадства. Выступаў супраць саслоўнай няроўнасці, натуральныя правы чалавека ставіў вышэй зямнога і царкоўнага права.

**Мікалай Гусоўскі** – паэт-лацініст XVI ст., гарачы прыхільнік гуманістычных ідэй эпохі Адраджэння. Выразнік перадавых грамадска-палітычных і эстэтычных поглядаў свайго часу, паплечнік і сябар Эразма Вітэліуса, сакратара канцылярыі ВКЛ. Злучаючы ў творчасці славянскую і заходнееўрапейскую культуры, М. Гусоўскі далучыў сваю бацькаўшчыну да еўрапейскага і агульнасусветнаму культурнай прасторы. Найбольш вядомым яго творам з’яўляецца паэма “Песня пра зубра” (1522 г.), якая была выдадзена ў Кракаве на лацінскай мове. У адпаведнасці з натуралістычнымі тэндэнцыямі Адраджэння, М. Гусоўскі стварыў арыгінальную карціну гарманічнага злучэння чалавека і прыроды, што як ніколі актуальна і сёння. Прырода з'яўляецца скарбам, крыніцай багацця і дабрабыту краіны. М. Гусоўскі адыходзіць ад сярэднявечных установак на сузіранне, сціпласць, аскетызм, мяркуючы, што сэнс жыцця можна апісаць такімі катэгорыямі як адсутнасць страху, гонар, карысць грамадству, задавальненне, сцвярджаючы дзеясны і маральна-рацыяналістычны прынцыпы чалавечага жыцця. Лічыў, што няправільна шанаваць чалавека за шляхетнае паходжанне, што справядліва яго ацэньваць за працу і заслугі перад Бацькаўшчынай. Толькі той, хто прыносіць грамадскую карысць мае права на прызнанне і добрую памяць нашчадкаў. З'яўляючыся выхадцам з бедных слаёў насельніцтва, Гусоўскі расказвае пра нялёгкае жыццё простага народа, выступае супраць феадальных парадкаў, якія склаліся ў краіне. Лічыў, што моц дзяржавы

залежыць не толькі ад справядлівага гаспадара, але і ад адукаванасці і дабрачыннасць грамадзян.

**Сымон Будны** – рэлігійны рэфарматар, паэт, мысліцель, прадаўжальнік традыцыі Ф Скарыны. Пасля навучання ў Кракаўскім і Базельскім пратэстанцкім універсітэтах служыў святаром пратэстанцкай абшчыны. У выніку гэтай дзейнасці былі выдадзеныя ў 1562 г. ў Нясвіжскай друкарні знакамітыя працы на старабеларускай мове пад назвай “Катэхізіс, ці навука старадаўняя хрысціянская ад святога пісьма, для простых людзей мовы рускай у пытаннях і адказах сабрана” і “Пакаянне грэшнага чалавека перад Богам”. Будны быў прыхільнікам кальвінізму, але з цягам часу ў яго ўзніклі сумненні наконт трактавання догмату Тройцы, у выніку ён быў абвінавачаны ў ерасі як каталікамі і праваслаўнымі, так і прыхільнікамі кальвінізма, пасля чаго ён зближаецца з антытрынітарыямі і абгрунтоўвае натуральнае паходжанне Хрыста. Дабрабыт дзяржавы С. Будны звязвае з трымя складаючымі – роўныя магчымасці для ўсіх, прыватная ўласнасць і самаадданая праца. У звязку вера – розум, аддае перавагу розуму. У цэлым, за свабоднае трактаванне палажэнняў веры, творчасць Буднага асуджалася прадстаўнікамі і праваслаўя і каталіцызму і пратэстантызму.

**Васіль Цяпінскі** – беларускі пісьменнік, кнігавыдавец, паплечнік С. Буднага, прадаўжальнік культурна-асветніцкай традыцыі Ф. Скарыны. Лічыў сваім лёсам служыць народу. На свае сродкі арганізаваў друкарню з намерам выдаваць кнігі на беларускай мове. Спрабаваў завяршыць выданне Бібліі, пачатае Скарынам (абмежаваныя матэрыяльныя магчымасці дазволілі здзейсніць толькі частку задуманага). Быў занепакоены заняпадам у развіцці самабытнай нацыянальнай культуры. Да свайго перакладу Бібліі, як і Скарына, Цяпінскі напісаў прадмову, у якой адстойвае пазіцыі айчыннай культуры і мовы. Спрабаваў даказаць вялікую карысць чытання на роднай мове, вызначаў, што родная мова лепш за ўсё развівае розум, абвінавачваў вышэйшыя слаі шляхты ў тым, што яны не падтрымліваюць нацыянальную адукацыю, адстойваў ідэю верацярпімасці.

**Міхалон Літвін** – беларускі мысліцель XVI ст. Хто карыстаўся гэтым псеўсаданімам ды нашага часу канчаткова не высветлена. Каля 1550 г. пад аўтарствам М. Літвіна быў выдадзены трактат “Аб норавах татар, літвінаў і масквіцян”, дзе параўноўваліся законы, арганізацыю кіравання, судовыя сістэмы, звычаі гэтых народаў. У гэтым трактаце аўтар падымаў праблематыку рэфармавання існуючай грамадска-палітычнай сістэмы і сацыяльнага роўнасці. Асаблівую ўвагу надаваў пытанням функцыянавання сістэмы правасуддзя. М. Літвін пазначаў, што сіла дзяржавы залежыць ад прадуманасці заканадаўства, а маральнае здароўе грамадства звязваў са стабільнасцю інстытута сям'і, адсутнасцю шкодных звычак, выказваўся супраць ўмяшання царквы ў свецкія справы.

**Андрэй Волан (1530 – 1610)** – палітычны дзеяч, правазнаўца, філосаф. Пісаў пра змены ў соцыуме, пра зараджэнне новых грамадскіх адносін, якія патрабуюць новых рэгулятараў. А. Волан казаў, што ў сучасным яму грамадстве мараль і рэлігія перастаюць быць безумоўнымі рэгулятарамі ўсіх

узаемадзеянняў. Выхад са становішча ён бачыў ва ўдасканаленні прававой сістэмы. Распрацоўкі А. Волана ў юрыдычнай вобласці абганялі свой час. Права, якое ён вызначае як выраз разумнай калектыўнай волі народа (найвышэйшы розум, закладзены ў прыродзе), эфектыўна функцыянуе, калі заканадаўства разумна і справядліва. Свабоду А. Волан разумее не як маральны выбар, а з юрыдычнага пункту гледжання, як неабходнасць. Лічыў, што грамадства з'яўляецца свабодным, калі ўлада гарантуе чалавеку асабістую і маёмасную бяспеку, разважаў аб натуральных правах чалавека. У рашэнні пытання аб суадносінах палітыкі і маралі паказваў на тое, што прыярытэтамі дзейнасці кіраўніка павінны быць справядлівасць, маральнасць і агульны дабрабыт.

**Леў Сапега** – таленавіты палітык, грамадскі, ваенны дзеяч ВКЛ. На працягу жыцця займаў высокія пасады: сакратар, затым пісар, затым канцлер ВКЛ, віленскі ваявода, вялікі гетман і староста Берасцейскі, Слонімскі, Магілёўскі. Актыўна супрацьстаяў агрэсіўным намерам у дачыненні да суверэнітэту ВКЛ. Выступаў супраць палажэнняў Люблінкай уніі 1569 г., якія прыніжалі палітычнае значэнне ВКЛ. Кіраваў выданнем III Статута ВКЛ (1588 г.), які ўмацаваў аўтаномны палітыка-прававы статус ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай. Меркаваў, што закон павінен быць адзін - і для падданых, і для кіруючых вярхоў, беззаконне ж вядзе да тыраніі, нягледзячы на добрыя намеры кіраўнікоў. Лічыў, што галоўная задача права – забеспячэнне агульнага дабрабыту, а не абраных асоб: “Народу сорамна права свайго не ведаць, асабліва нам, якія не чужой якой моваў, але сваёй уласнай правы запісаныя маем і ў любы час, што нам неабходна да адбіцця ўсякай крыўды, можам ведаць”. У пытаннях веры з’яўляўся прыхільнікам ідэі верацярпімасці.

### 2.1.3. Філасофская і грамадска-палітычная думка Беларусі перыяду Контррэфармацыі і Асветніцтва

Да сярэдзіны XVI ст. для барацьбы з Рэфармацыяй каталіцкай царквой была распрацавана праграма дзеянняў па вяртанню былога ўплыву і аўтарытэта ў грамадстве. Гэты перыяд атрымаў назву Контррэфармацыі. Галоўная роля ў палітыцы каталіцкай царквы належыла Ордэну езуітаў. Езуіты стварылі лепшую на той час сістэму адукацыі – калегіўмы і акадэміі – паступіць куды мог любы хрысціянін, але выпускніком быў ужо католік. Галоўнымі прадметамі тут былі схаластычная філасофія, тэалогія і лацінская мова. Рэнесанснаму тэзісу аб здольнасці чалавека да пазнання і самаразвіцця супрацьпастаўляецца непарушнасць царкоўнага аўтарытэта і царкоўнай навукі (схаластыка). Значная колькасць навуковых дзеячаў за свае адкрыцці была асуджана інквізіцыяй – Дж. Бруна, Г. Галілей і інш.

Можна вылучыць наступныя асаблівасці перыяду Контррэфармацыі на тэрыторыі Беларусі:

– Контррэфармацыя на тэрыторыі Беларусі насіла пераважна мірны характар і была падтрымана вышэйшымі коламі дзяржавы;

– пачатак Контррэфармацыі па часе супаў з заключэннем Люблінскай уніі (1569 г.) і распаўсюджваннем польскага ўплыву на тэрыторыі Беларусі, таму адной з галоўных тэм грамадска-палітычнай думкі гэтага перыяду з’яўляецца праблема захавання роднай мовы і культуры;

– Контррэфармацыя на тэрыторыі Беларусі была накіравана не толькі супраць пратэстантаў, але і супраць праваслаўнай царквы. Да канца XVI ст. значная колькасць магнатаў і шляхты, як пратэстантаў, так і праваслаўных, перайшла ў каталіцтва. Гэта знайшло адбітак ў творах тагачасных дзеячаў – яны набываюць характар палемічнай літаратуры, дзе адно з галоўных пытанняў праблема верацярпімасці.

Прадстаўнікамі грамадска-палітычнай думкі Беларусі эпохі Контррэфармацыі з’яўляюцца П. Скарга, браты Зізініі, М. Сматрыцкі, А. Філіповіч, С. Полацкі, Г. Каніскі, К. Лышчынскі.

**Пётр Скарга (1536 – 1612)** – рэлігійны і палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, адзін з ідэолагаў Контррэфармацыі. Вучыўся ў Кракаве, член ордэна езуітаў. Стваральнік і першы кіраўнік Віленскай Езуіцкай Акадэміі – першай вышэйшай навучальнай установы ў ВКЛ. Прапагандыст Брэсцкай царкоўнай уніі 1596 г., якую разглядаў у якасці сродку пераадолення рэлігійнай варожасці ў краіне. Лічыў, што свецкая ўлада павінна падпарадкоўвацца царкоўнай. Нягледзячы на тое, што ў сваіх палітычных поглядах быў прыхільнікам неабмежаванай манархіі, аб'ектыўна апісваў эксплуатацыю сялян і сацыяльную няроўнасць у дзяржаве. Крытыкаваў ўклад жыцця шляхты і быў адным з першых, хто прадказаў заняпад Рэчы Паспалітай.

**Стэфан Зізаній** – гуманіст, прапаведнік, пісьменнік XVI – пачатку XVII стст., на творчасць якога вялікае ўздзеянне аказала рэфармісцкае вучэнне гуманістаў Заходняй Еўропы. Быў вельмі адукаваным чалавекам. Яго кнігі і пропаведзі карысталіся вялікай папулярнасцю ў ВКЛ. Выступаў супраць існуючых феадальных парадкаў, пропаведзяў уніятаў і езуітаў, крытыкаваў праваслаўных іерархаў. Самастойна інтэрпрэтаваў Біблію. Усё гэта выклікала відавочную незадаволенасць і моцнае супрацьдзеянне прадстаўнікоў розных канфесій. Сам сябе лічыў праваслаўным. Погляды і дзейнасць С. Зізанія аказалі вялікі ўплыў на далейшае развіццё сацыяльна-палітычнай думкі ў Беларусі і Ўкраіне.

**Лаўрэнцій Зізаній (? – 1634)** – царкоўны дзеяч, мовазнаўца, перакладчык, педагог. Брат Стэфана Зізанія. Шмат зрабіў для развіцця адукацыі на роднай мове. У 1595 г. выдаў “Азбуку” і “Граматыку словенску”. У творчасці выразна прасочваюцца рэфармацыйныя ідэі.

**Мялецій Сматрыцкі (1575 – 1633)** – грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч, пісьменнік. Выступаў супраць уніяцкай-езуіцкай нецярпімасці, беззаконня і гвалту ў адносінах да мясцовага насельніцтва, не прызнаваў Брэсцкую ўнію. Адстойваў думку аб неабходнасці захавання вернасці веры і культуры свайго народа. Адзначаў ў якім гаротным становішчы апынуўся народ са сваёй культурай, мовай, багатым гістарычным мінулым. Гэта адбілася ў яго творы “Трэнас (Плач па Усходняй царкве)”, які аказаў значнае

ўздзеянне на грамадскасць. “Трэнас” сведчыў аб глыбокай эрудыцыі і энцыклапедычнасці ведаў аўтара. Сматрыцкі лічыў, што мірнае суіснаванне народаў розных веравызнанняў – гэта важны фактар магутнасці дзяржавы, але ўнія падзяліла народ на два супрацьлеглых лагеры, і гэта ўяўляе найбольшую пагрозу існаванню самой дзяржавы. Аднак пазней М. Сматрыцкі сам пераходзіць у ўнію. Ідэалогію пераходу абгрунтоўвае ў “Апалогіі”, дзе крытыкуе праваслаўную царкву за культурную адсталасць, кажа пра тое, што супраціў уніі – дарэмная трата сіл, якая парушае спакой у дзяржаве.

**Афанасій Філіповіч (1597 – 1648)** – палітычны і церкоўны дзеяч, пісьменнік. Меў высокую юрыдычную падрыхтоўку, добра ведаў прававую базу функцыянавання праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. Праваслаўны святар, сутынуўся з рознага роду ўціскам з боку ўніятаў і ўступіў у барацьбу за правы праваслаўных. Аргументавана абвінавачваў высокіх службовых асоб у ігнараванні законаў дзяржавы. А. Філіповіч сцвярджаў, што свецкая ўлада выконвае свае функцыі толькі ў зямным свеце, у сваю чаргу, улада ў духоўным свеце належыць Богу, а не Папе Рымскаму. Вялікае значэнне надаваў уладзе караля і лічыў, што сенат, сінод і сойм павінны даваць разумныя парады, але не прэтэндаваць на каралеўскую ўладу – гэта важная ўмова спынення шляхецкага самавольства ў краіне.

Яскравым прадстаўніком матэрыялістычнага светапогляду быў **Казімір Лышчынскі (1634 – 1689)**. Лышчынскі скончыў езуіцкую школу ў Брэсце і Віленскую духоўную акадэмію, аднак пасля кардынальна памяняў свае погляды. Свае думкі ён выклаў у працы “Аб неіснаванні Бога” на лацінскай мове. Лышчынскі адмаўляў Бога як творцу Сусвету, крытыкаваў існуючы грамадзкі парадак. Выказаў здагадку аб выкананні рэлігіяй сацыяльнага заказу ўлады заможных. За адступніцтва і радыкалізм езуіты не даравалі яму, Лышчынскі быў адлучаны ад царквы, прыцягнуты да суда і асуджаны да спалення на вогнішчы разам з яго творам. Кароль Рэчы Паспалітай змяніў прысуд, загадаўшы пакараць смерцю мысляра шляхам адсячэння галавы, а цела спаліць. Пакаранне адбылося 30 сакавіка 1689 г. на плошчы Стары рынак у Варшаве.

**Сімяон Полацкі (1629 – 1680)** змагаўся за развіццё асветы і навуковых ведаў. Пазначаў вялікае значэнне філасофіі ў жыцці кожнага чалавека, асабліва ў яго маральным станаўленні. Адукаванасць разглядаў як адну з галоўных рысаў чалавека. Палітычным ідэалам для С. Полацкага з'яўляецца моцная і асвечаная манархія са справядлівымі законамі на аснове хрысціянскай маралі і класічных юрыдычных нормаў. Маёмасную няроўнасць С. Полацкі называе адной з асноўных прычын сацыяльных канфліктаў.

**Георгій Каніскі (1717 – 1795)** быў Магілёўскім епіскапам, абаронцам праваслаўнай царквы на беларускіх землях. Філасофія Каніскага – дэізм, філосаф сцвярджаў, што Бог, ствараючы свет, больш у яго парадак не ўмешваецца. У духу рацыяналізму разводзіў веру і розум. Г. Каніскі лічыў, што праўдзіва толькі тое, што спасцігаецца розумам і пацвярджаецца

вопытам. Нават пра Бога чалавек павінен судзіць, кіруючыся інтэлектам. У працэсе пазнання вырашальную ролю адыгрываюць адчуванні, таму Каніскі аддаваў перавагу індукцыі. Прырода таксама ўсемагутная як і Бог. Матэрыю разглядаў як першааснову, у якой патэнцыйна закладзена ўся разнастайнасць свету. Разнастайнасць існуе дзякуючы форме. Форма – таксама субстанцыя, з дапамогай якой з матэрыі можа ўзнікнуць любая рэч. Вучэнне Каніскага пра грамадства і пра чалавека адпавядае айчыннай традыцыі – агульнае дабро мае перавагу над асабістым. Калі людзі будуць імкнуцца да агульнага дабра, то сацыяльныя канфлікты знікнуць. Мысліцель адмаўляе ідэю абсалютнага падпарадкавання чалавека Божай волі, мяркуючы, што чалавек у сваіх дзеяннях кіруецца розумам, ўсведамляе мэты і здольны самастойна размяжоўваць дабро і зло. Згодна з Г. Каніскім свабода чалавека – гэта свабода над сабой, свабода кіраваць сваімі пачуццямі і жаданнямі.

У другой палове XVIII ст. філасофская думка пачынае пакрыху аддаляцца ад схаластыкі. Развіццё капіталістычных грамадскіх адносін прывяло да пераменаў у сацыяльна-палітычным жыцці. Бурна развівалася прыродазнаўства, што адпавядала патрэбам грамадства таго часу. Гэта прывяло да афармлення так званай эклектычнай філасофіі, у якой разам з Арыстоцелем і Фамой Аквінскім выкладаліся погляды філосафаў Новага часу. Гэта была спроба напоўніць філасофію новым зместам без рэзкага разрыву са склаўшыміся ўяўленнямі. Эклектычная філасофія ў Беларусі найбольш прадстаўлена ў працах А. Скарульскага, С. Шадурскага, Б. Дабшэвіча, творчасць якіх, у сваю чаргу спрыяла распаўсюджванню ідэй Асветніцтва.

Эпоха Асветніцтва пачалася ў канцы XVII ст. Для філасофіі гэтага часу характэрны дэізм, ідэя асветы мас у якасці вырашальнага фактару грамадскага прагрэсу, ідэя неўмяшання Бога ў жыццё чалавека. Розум разглядаўся як галоўны інструмент пазнання. Падкрэслівалася магчымасць мэтанакіраванай змены свету і соцыўма на аснове аб'ектыўнага вывучэння грамадства і прыроды з дапамогай дакладных метадаў. У гэтым сэнсе айчынная філасофія не з'яўлялася выключэннем. Акрамя таго, гэта быў час новых палітычных ідэй. Беларускія мысляры выступалі за абарону правоў і свабод чалавека, рацыянальную арганізацыю палітычнага кіравання і эканомікі. У 1773 г. у Рэчы Паспалітай па ініцыятыве Іахіма Храптовіча была створана Адукацыйны камісія, якая стала пяршым ў Еўропе свецкім міністэрствам асветы, але падзелы Рэчы Паспалітай зруйнавалі гэтыя здабыткі. З 1802 г. цэнтрам ідэй Асветніцтва з’яўляўся Віленскі універсітэт. Філасофія Асветніцтва ў Беларусі звязана з імёнамі Казіміра Нарбута, Анёла Доўгірда, Марціна Пачобута-Адланіцкага, Яна Снядэцкага.

### 2.1.4. Асноўныя накірункі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі сярэдзіны XIX – XX стагоддзях

У першай палове XIX ст. ў Беларусі значна ўзмацніўся грамадска-палітычны рух, на які паўплывалі рэвалюцыйныя падзеі ў Заходняй Еўропе,

развіцце польскіх нацыянальна-вызваленчых ідэй і расійскай рэвалюцыйнай думкі. У пачатку XIX ст. з’яўляецца шмат праектаў дзяржаўных пераўтварэнняў.

Формай арганізацыйнага згуртавання рэвалюцыйных сіл у тыя гады былі розныя тайныя таварыствы, папулярныя сярод моладзі. Галоўнымі дзеячамі такіх таварыстваў былі прадстаўнікі навучальных устаноў. Адным з найбольш важных было таварыства філаматаў (аматараў навукі) створанае ў 1817 г. студэнтамі Віленскага ўніверсітэта, якія ставілі перад сабой нацыянальныя польскія і асветніцкаія мэты: культурная праца ў масах, выхаванне патрыятызму ў асяроддзі польскай, беларускай і літоўскай моладзі. Гэта арганізацыя задала арыентацыю на нацыянальна-культурнае і дзяржаўнае адраджэнне, яна мела шматлікія філіялы ў розных частках Беларусі, разгарнула актыўную прапагандысцкую дзейнасць сярод вучнёўскай моладзі Вільні, заяўляла аб неабходнасці пры дапамозе асветніцтва аб'яднання суайчыннікаў. Адным з вынікаў гэтай дзейнасці стала заснаванне, з дазволу ўніверсітэтскага кіраўніцтва, у маі 1820 г. па ініцыятыве Тамаша Зана “Таварыства прамяністых”. Прамяністыя прапаведвалі высокамаральныя ідэі, адпаведным чынам паводзілі сябе, практыкаваліся ў гімнастычных гульнях.

На погляды філаматаў паўплывлі ідэі польскага мысліцеля Іахіма Лялевеля (1786 – 1861), вядомага еўрапейскага вучонага, прызнанага ідэолага вызваленчага руху, які акрамя аднаўлення польскай дзяржавы, таксама адстойваў ідэю барацьбы супраць феадальнага прыгнёту. У сваіх творах ён аналізаваў мінулае Беларусі і Літвы, асуджаў нацыянальны прыгнёт беларускага і ўкраінскага народаў, пісаў пра вялікае значэнне старабеларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім.

У канцы 1820 г. філаматы ініцыіравалі стварэнне новай тайнай арганізацыі філарэтаў (ад. грэч. – аматары дабрачыннасці), кіраўніком якой быў Тамаш Зан (1796 – 1855), паэт-рамантык, адзін з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, які адзін з першых звярнуў увагу на багацце беларускага фальклору, кумір моладзі, чалавек, які карыстауся вялікай павагай сярод студэнтаў і выкладчыкаў яшчэ ў час свайго навучання у Віленскім універсітэце, які галоўнай мэтай свайго жыцця лічыў падрыхтоўку моладзі дзеля вызвалення роднага края. Галоўная мэта філарэтаў была ўжо палітычнай – аднаўленне Рэчы Паспалітай.

У XIX ст. беларуская школа паказвае добрае веданне лепшых дасягненняў класічнай нямецкай філасофіі, у прыватнасці, творчасці І. Канта і Гегеля. А. Доугірд, браты А. і Я. Снядзецкія, Б. Дабшэвіч і іншыя крытыкавалі ідэалізм Канта і Гегеля з пазіцыі хрысціянскай веры. Але былі і паслядоўнікі нямецкіх філосафаў (І. Быхавец, Ю.Галухоўскі, Ф. Бохвіц, А. Марціноўскі, Э. Жалігоўскі).

Напрыклад, Юзаф Галухоўскі (1797 – 1858) філосаф-ідэаліст, быў блізка знаёмы з Ф. Шэлінгам, праз якога трапіў пад уплыў філасофіі, навеянай трансцэндэнтальнымі поглядамі. Прыйшоў да пераканання, што розум не здольны вырашаць самыя важныя пытанні, а самы галоўны орган

пазнання – гэта пачуцце. Дапытлівасць, праз якую чалавецтва шукае Бога, парадзіла навуку, але тая пры дапамозе розуму шукае толькі прыватные ісціны. А філасофія імкнецца да сузірання ўсіх ісцін, што ёсць быцце Бога. Будучы прафесарам філасофіі Віленскага універсітэта, чытаў лекцыі, якія карысталіся надзвычайнай папулярнасцю. Яго галоўная філасофская праца “Разважанні над найгалоўнйшымі праблемамі чалавека”.

Яшчэ адзін знаток нямецкай класічнай філасофіі – Юзаф Уладзіслаў Быхавец (1778 – 1845) вядомы філосаф, пісьменнік, перакладчык. Скончыў Віленскі ўніверсітэт, пасля працягваў навучэнне ў Германіі. У Кёнінсбергу слухаў лекцыі І. Канта, пераклаў і выдаў на польскай мове некаторыя яго творы. Наогул, філасофія Канта велімі паўплывала на творчасць Быхаўца.

Рэлігійны падзел у Беларусі XIX ст. адлюстроўвалі дзве інтэлектуальная плыні: каталікі і праваслаўныя развівалі нацыянальную ідэю рознымі шляхамі. Сярод праваслаўных была вельмі папулярная ідэя заходнерусізму, галоўным ідэолагам якой быщ Міхаіл Каяловіч (1828 – 1891), які лічыў, што беларуская народнасць, складзеная з пляменаў крывічоў і дрыгавічоў, перш за ўсе радніцца (па мове, веры,этнаграфічных традыцыях) з рускімі і ўкраінцамі і што далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі адрадзіла старарускае адзінства. Палякі (паводле Каяловіча ўсе католікі) лічыліся чужаземцамі. Выступаў супраць паўстання 1863 – 1864 гг. Адмаўляў пазітыўны ўплыў заходніх народаў на ўсходнеславянскія народы і права на нацыянальнае самавызначэнне беларусаў (таксама літоуцаў і ўкраінцаў). Выказваў тэзіс аб неабходнасці поўнага нацыянальна-культурнага зліцця Беларусі з Расіяй. Заходнерусізм паспрыяў таму, што насельніцтва значна меньш стала думаць пра Беларусь у традыцыі Рэчы Паспалітай, і беларуская ідэя ўсё больш стала існаваць у адорванасці ад псіхалагічна-культурнага польскага кантэксту. У друку з пазіцый заходнерусізма гісторыя Беларусі асвятлалася таксама ў працах І. Бялевіча, П. Бацюшкава, А. Турцэвіча і інш.

У сваю чаргу, многія інтэлігенты католікі шляхецкага паходжання свае карані бачылі ў Вялікім княстве Літоўскім, пісалі па беларуску. Так В. Дунін-Марцінкевіч (1808 – 1884), які вышэй за ўсе ставіў агульны дабрабыт грамадства, лічыў, што дасягненне гэтага магчыма праз сацыяльную гармонію. Шлях да гармоніі бачыў у маральным удасканаленні і развіцці наыянальнай культуры. Літаратурная творчасць Марцінкевіча на беларускай мове стала практычнай рэалізацыяй сцвярджэння ідэі самавызначэння беларускага народа, неабходнасці існавання беларускай культуры і літаратуры, развіцця самасвядомасці беларусаў.

Па меры разгортвання нацыянальна-вызваленчага руху фарміравалася ідэалогія і філасофія беларускага нацыянал-дэмакратызму. Філасофскія ідэі гэтага руху развіваліся ў мастацкай літаратуры і публіцыстыцы.

У першай палове XIX ст. беларускае пісьменства стваралася больш у асяроддзі каталіцкай шляхты і ідеалізавала колішнюю Рэч Паспалітую. Адам Міцкевіч (1798 – 1855) – польскі паэт беларускага паходжання, вучыўся ў Віленскім універсітэце, адзін з кіраўнікоў таварыства філаматаў, зрабіў вялікі

ўплыў на развіцце беларускай літаратуры. Яго творчасць была накіравана на выхаванне маладых патрыётаў. А. Міцкевіч высока ацэньваў беларускі фальклор, а беларускую мову называў самай гарманічнай з усіх славянскіх моў. У 1830 – 1840-я гг. ў польскай літаратуры склалася так званая беларуская школа, прадстаўнікі якой (Ян Чачот, Ян Баршчэускі, В. Дунін-Марцінкевіч і інш.) услед за Міцкевічам пісалі аб жыцці беларускага народа.

У другой палове XIX ст. ідэалам становіцца аднаўленне беларускай дзяржаўнасці. На пачатку 1880-х гг. беларускія студэнты, якія вучыліся ў Пецярбургу і заснавалі некалькі гурткоў рэвалюцыйна-сацыялістычнага характару (у народавольніцкім духу), выпусцілі некалькі адозваў, адрасаванных жыхарам Беларусі з загалоўкамі: “Да беларускай інтэлігенцыі”, “Да беларускай моладзі”, “Пасланне да землякоў беларусаў”. Аўтары гэтых публікацый пісалі, што ў беларусаў ёсць свае інтарэсы, што адрозніваюцца ад інтарэсаў палякаў ці раскіх, ёсць свой менталітэт, мова, культура; што беларусы – гэта народ, які заслугоўвае таго, каб стаць свабодным ад чужых манархаў і паноў. Яны жадалі аўтаноміі для Беларусі ў складзе расійскай дзяржаўнасці.

Апрача народавольцаў былі і сацыялістычныя суполкі (у якія уваходзілі дзеячы больш з каталіцкага асяроддзя), што таксама адмоўна сказваліся да тагачаснай рэчаіснасці, але не выказвалі энтузіязму накшталт сувязі з Расіяй – каб Беларусь была адным з элементаў гэтай федэрацыі шматлікіх нацый.

Напярэдадні дэкрэта пра адмену прыгонніцтва грамадскія працэсы значна паскорыліся. Яшчэ больш шырокі дэмакратычны рух пачаўся з паўстаннем 1863 – 1864 гг. Адзін з кіраўнікоў гэтага паўстання – рэвалюцыянер **Кастусь Каліноўскі (1838 – 1864)**, чалавек вялікай мэтанакіраванасці, і сілы духу, які аказаў вельмі вялікі ўплыў на афармленне ў Беларусі самастойнай палітычна-вызваленчай плыні. У сваей літаратурнай дзейнасці (7 нумароў газеты “Мужыцкая праўда”, рэвалюцыйныя загады, заклікі, інструкцыі, лісты “Лісты з-пад шыбеніцы”) выказваўся, што асвета і навука павінна развівацца на роднай мове, раскрываў вельмі цяжкае становішча і сутнасць эксплуатацыі сялян, крытыкаваў судовую сістэму і бюракратычны апарат з яго бескантрольнасцю і хабарніцтвам. Выступаў з крытыкай капіталізму, у якім бачыў толькі форму эксплуатацыі чалавека чалавекам. Быў прыхільнікам сялянскага абшчыннага сацыялізму – марыў раздаць усю зямлю сялянам. Лічыў, што ў будучым грамадстве не павінна быць класавых, рэлігійных і нацыянальных прывілегіяў – чалавека трэба ацэньваць па яго рэальных заслугах. Выказваўся за ўсеагульную дзяржаўную адукацыю і выхаванне. Найлепшай формай дзяржавы лічыў дэмакратычную рэспубліку.

Як прыхільнік рэвалюцыйна-дэмакратычных ідэй, ажыццяўленне сацыяльных праектаў Каліноўскі звязваў з сялянскай рэвалюцыяй – у сялянстве бачыў галоўную сілу, падкрэсліваў, што свабоду можна заваяваць толькі праз узброеную барацьбу.

К. Каліноўскі, як пачынальнік беларускай рэвалюцыйнай дэмакратыі, зрабіў вялікі ўплыў на ўсю беларускую культуру. Яго ідэйныя прынцыпы развівалі пасля Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, Цетка і інш.

У 1880-я гг. разгарнулася творчая дзейнасць Францішка Багушэвіча – натхняльніка працэсу нацыянальнага адраджэння, актыўнага ўдзельніка паўстання 1863 – 1864 гг., аднаго з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, у творах якога выказаны прынцыпы ідэалогіі нацыянальнага вызвалення. Навакольнае ён успрымаў як свет, што знаходзіцца ў трагічным стане з-за невырашальных супярэчнасцей. Быў перакананы, што грамадства пабудаванае на прыгнёце людзей – гэта ўласцівы працэс пастаяннага ўзнікнення і павелічэння зла.

Як асноўную праблему нацыянальнага жыцця Багушэвіч вылучаў праблему мовы – найважнейшай формы праяўлення духоўнасці народа. У сваіх творах звяртаў увагу на гістарычнае абгрунтаванне суверэннасці беларусаў. Як прадстаўнік дэмакратычнага руху выступаў супраць феадальна-самадзяржаўнага ладу з яго прыгонніцкай сістэмай панавання над шырокімі працоунымі масамі. Багушэвіч уяўляў працоўны народ за вышэйшую каштоўнасць быцця, як і К. Каліноўскі быў перакананы ў сіле і стваральных магчымасцях народа, пры гэтым сутнасць чалавека ўяўляў у сацыяльна-эканамічным і палітычным плане. Марыў аб свабодзе, якую разумеў як стан, несумяшчальны з тагачаснымі грамадскімі адносінамі. Мэта Багушэвіча – дапамагчы народу пазбавіцца прыгнёту і галечы і выйсці на новыя абсягі жыцця.

На пачатку XX ст. у Беларусі меліся даволі значныя дасягненні ў галіне этнаграфіі, гісторыі, культуры, ў прыродазнаўчых навуках. Пры ўдзеле мясцовай інтэлігенцыі стваралася шмат навуковых таварыстваў. У верасні – снежні 1906 г. вышла першая легальная беларуская газета “Наша доля”, пасля закрыцця якой эстафету падхапіла газета “Наша ніва” (1906 – 1915), дзе друкаваліся беларускія літаратары Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч і інш, ў творах якіх найбольш поўна разглядаліся тыповыя рысы нацыянальнага характара і светапогляду беларускага народа. Пры садзейнічанні “Нашай нівы” выходзілі часопісы “Лучынка”, “Саха”, папулярны “Беларускі каляндар”, пачалося легальнае беларускае кнігадрукаванне.

Прадстаўнікамі грамадска-палітычнай думкі Беларусі “нашаніўскага” перыяду з’яўляюцца М. Багдановіч, Я. Колас, Я. Купала, І. Абдзіраловіч, У. Суліма, В. Ластоўскі, А. Цвікевіч і інш.

**Максім Багдановіч (1891 – 1917)** – класік беларускай літаратуры, пісаў вершы, займаўся публіцыстыкай, перакладамі, складаў казкі і прыпавесці. У сваёй творчасці, поўным рамантызму і лірыкі, працягвае развіваць ідэю патрыятызму. Праблема цяжкага становішча, у якім знаходзіцца беларускі люд, тэма самаахвяравання дзеля народа, адраджэння, сувязь чалавека з прыродай – адны з асноўных тэм у творах Багдановіча.

Ядро творчасці **Янкі Купалы** – ідэя адраджэння беларускай нацыі і культуры. У сваіх працах ён акцэнтуе ўвагу на праблемах сацыяльнай

нявоўнасці і нацыянальнай самасвядомасці. Ідэю нацыянальнага адраджэння Я. Купала звязвае з праблемай грамадскага перабудовы.

**Ігнат Абдзіраловіч (Канчэўскі) (1896 – 1923)** – аўтар сацыяльна-філасофскага эсэ "Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду" (1921 г.), у якім зрабіў аналіз асаблівасцей гістарычнага развіцця і культуры Беларусі. Гэта работа ствaралася ў суаднясенні з тэндэнцый радыкальнага пераасэнсавання духоўнай спадчыны Кіеўскай Русі і Вялікага княства Літоўскага. У гэтым творы ўпершыню грунтоўна сфармулява менавіта ўласная нацыянальна-беларуская філасофская канцэпцыя, дзе Абдзіраловіч гаворыць, што беларуская нацыя "заціснута" паміж Расіяй і Польшчай, Усходам і Захадам, што эліта здрадзіла свайму народу – прыняла "заходнюю" або "ўсходнюю" арыентацыю. Асэнсоўваючы нацыянальны лёс, аўтар піша што беларусаў, якія не зрабіліся народам ні Ўсходу ні Захаду, пачалі зваць цёмным, дзікім народам, што шляхта, а пазней страціўшая сувязь з народам інтэлігэнцыя, ўцяклі ад беларускага карэньня, пакідаючы народ на свой ўласны лёс. Далей Абдзіраловіч робіць вывад, што ні ўсходняя ні заходняя культура не запоўняць вольнае развіцце нашага духу і што выхад трэба шукаць па шляху творчасці. Творчасць ён трактуе як касмічную моц, аснову сапраўднага жыцця.

**Уладзімір Самойла (Суліма) (1878 – 1941)** – літаратуразнаўца, публіцыст, актыўны ўдзельнік сацыяльна-палітычнага жыцця, які ў палітычных пытаннях не прызнаваў пазіцыю ні расійскай, ні польскай улады. Развіваў філасофію нацыянальнага адраджэння. Найбольш вядомая праца Самойлы "Гэтым пераможаш!: нарысы крытычнага аптымізму" (1924 г.). Сваю пазіцыю мысліцель называе "крытычны аптымізм" – лічыць, што праз духоўную рэвалюцыю магчыма адраджэнне беларускага народа. Піша, што сапраўдная моц – гэта літаратура і філасофія, якія ўзгадуюць імкненне да свабоды. Акрамя гэтага, глыбінны выток рэвалюцыі духа – гэта такое хрысціянства, што будзе будзіць сваё "Я", актыўную творчую энэргію кожнага чалавека. Сваё "Я" павінен разумець у сабе, а таксама мець і кожны народ, у тым ліку беларускі.

**Вацлаў Ластоўскі (1883 – 1938)** быў перакананы, што нацыянальнае адраджэнне немагчыма без вяртання народу праўды пра яго мінуўшчыну. Выступаў у абарону беларускай дзяржаўнасці.

**Аляксандр Цвікевіч (1888 – 1937)** – аўтар 6 манаграфій і брашур, а таксама шматлікіх артыкулаў і эсэ. Актыўна выступаў за незалежнасць Беларусі. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Беларускай народнай грамады. Удзельнік Першага Усебеларускага з'езда. Пасля пераезду ў БССР працаваў ў Інстытуце гісторыі Беларускай Акадэміі навук, у Наркамаце фінансаў, сакратаром ў Інбелкульце. У 1930 г. быў арыштаваны і абвінавачаны. У 1937 г. быў расстраляны ў Мінску. Рэабілітаваны ў 1988 і 1989 гг. Аляксандр Цвікевіч можа лічыцца пачынальнікам даследвання гісторыі беларускай думкі. Яго кніга "Западно-руссізм", якая метадалагічна была напісана ў традыцыі (ранняга) крытычнага марксізму – першае ў беларускім дыскурсе даследаванне ідэй, думак, мыслення, якое па сутнасці разарвала

літаратурацэнтрызм беларускага дыскурса. Праз свае творы Цвікевіч дае даведку з гісторыі беларускага нацыянальна-палітычнага руху і адлюстроўвае справядлівасць барацьбы беларусаў за сваю дзяржаўнасць, а таксама знаёміць замежнага чытача з Беларуссю і яе нацыянальным рухам.

З 20-х гадоў XX ст. пачалася савецкая філасофія, для якой характэрна дамінаванне дагматызаванай дыялектыка-матэрыялістычнай філасофіі. Але і ў гэтых умовах існавала развіцце ідэй у рамках гнасеалогіі, метадалогіі навукі, гісторыі філасофіі. У 1921 г. быу заснаваны нацыянальны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1922 г. – Інстытут беларускай культуры (затым пераўтвораны ў Акадэмію навук БССР), якія сталі цэнтрам падрыхтоўкі нацыянальных навуковых кадраў. У 1925 г. быў укладзены юбілейны зборнік артыкулаў пра дзеячаў беларускай навукі, дзе ўсебакова асвятляўся светапогляд прадстаўнікоў нацыянальнай культуры XVI ст. На гэты час у галіне гісторыі філасофіі, эстэтычнай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі вялі даследванні І. Пічэт, М. Піотуховіч, Н. А. Янчук, І. В. Воўк-Левановіч, М. Шчакаціхін, У. Ігнатоўскі, М. Гарэцкі, А. Станкевіч і інш. Аднак гэтыя даследаванні былі неўзабаве выкрытыя як ідэалагічная дыверсія, а пераважная большасць дзеячаў беларускай навукі была фізічна знішчана або выслана. У рэшце на некалькі дзесяцігоддзяў даследаванне ў галіне гісторыі філасофскай, грамадскай і палітычнай думкі Беларусі стала прадпрыемствам надзвычай небяспечным.

У 1931 г. быў створаны Інстытут філасофіі Акадэміі навук БССР, першым дырэктарам якога стаў С.Я. Вальфсон (аўтар першага беларускага падручніка філасофіі, што быў надрукакаваны яшчэ ў 1921 г). Гэты інстытут адыграў ролю “ідэалагічнага танка” ў справе развіцця нацыянальнай думкі.

Толькі ў пасляваенны перыяд вывучэнне гісторыі філасофскай думкі Беларусі набывае больш або менш актыўны характар; ставяцца пытанні, звязаныя з неабходнасцю вызначэння важных этапаў станаўлення духоўнай культуры беларускага народа, адэкватнай ацэнцы дзейнасці буйных прадстаўнікоў нацыянальнай грамадска-палітычнай і філасофскай думкі. Актыўна пачаў вывучацца светапогляд рэвалюцыйных дэмакратаў. У маі 1948 г. на сесіі Аддзялення грамадскіх навук АН БССР ішла гаворка аб актывізацыі распрацовак, звязаных з вывучэннем пытанняў па гісторыі філасофскай думкі Беларусі. У полі зроку даследчыкаў гэтага часу знаходзіліся некаторыя бакі гуманістычнага і рэфармацыйнага руху (працягваліся даследаванні дзейнасці Ф. Скарыны. С. Буднага, В. Цяпінскага). Вучонымі рэспублікі былі прадстаўлены раздзелы аб развіцці філасофскай думкі Беларусі ў эпоху феадалізму для першага тома “Очерков по истории философской и общественно-политической мысли народов СССР” (1955 г.). У манаграфіі “Скарына, яго дзейнасць і светапогляд”, якая была выдана ў 1958 г., М. А. Алексютовіч піша аб некаторых важных аспектах адносін Ф. Скарыны да навукі. У гэтым жа годзе выйшла калектыўная манаграфія “Из истории борьбы за распространение марксизма в Белоруссии (1883 – 1917 гг.)” пад рэдакцыяй К. П. Буслава. Значны ўклад у даследаванне філасофскай думкі другой паловы XIX ст зрабіў

І.М. Лушчыцкі. Вынікі яго даследванняў атрымалі выраз у працы “Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палавіне XIX веку” (1958 г.). Гэта было першае грунтоўнае выданне, у якім разглядаліся сацыяльныя, эканамічныя, ідэйныя фактары, што паўплывалі на развіццё рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху і грамадскай думкі Беларусі. Важнае значэнне мела падрыхтоўка, а затым выданне ў 1962 г. анталогіі “Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии. Избранные произведения XVI – начала XIX в.” (М. А. Алексютовіч, Е. С. Пракошына, В. А. Сербента, М. С. Купчын, В. І. Пратасевіч і інш.).

Перыяд сталасці школы даследванняў у галіне гісторыі філасофіі выпадае на канец 1960-х – пачатак 1970-х гг. У 1962 г. вышла кніга “Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: избранные произведения XVI – начала XX вв.”. У 1973 г. выдаюцца “Очерки истории очерки философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.)” пад рэдакцыяй К. П. Буслава. У гэты час збіраліся матэрыялы па інтэлектуальнай рэальнасці мінулага, пісаліся тэарэтычныя працы каб паказаць тэндэнцыі развіцця гэтай рэальнасці (А. А. Бірала, А. Я. Цукерман, У.У. Дуброўскі, Н.М. Махнач).

Надзвычай цікавымі былі 1980-я гг., дастаткова вольныя ад дагматызму і ідэалагічнай абмежаванасці, адзначаныя значнымі дасягненнямі канцэптуальна-метадалагічнага і арганізацыйнага плана, звязаныя з такімі іменамі як Д.І. Шыраканаў, А.У. Самускевіч, В.С. Сцепін, А.І. Зелянкоў, Ю.А. Харын, А.А. Лягчылін, М.В. Рожын, А.С. Кляўчэня, М.Р. Галенка, Г.У. Грушавы, Я.В. Петушкова і інш. У1984 г. калектыў гісторыкаў філасофіі (А.С. Майхровіч, У.М Конан, С.А Падокшын і інш.) атрымлівае дзяржаўную прэмію БССР за працы па гісторыі Беларусі.

У розныя гады праблематыку метадалогіі навукі, логікі, філасофіі прыроды, філасофіі культуры, сацыяльнай філасофіі распрацоўвалі В.С. Сцепін, Ю.А. Харын, У.Ф. Беркаў, Я.С. Яскевіч, А.М. Елсукоў, У.К. Лукашэвіч, В.С. Вязоўкін і інш. Сучасную айчынную школу спецыялістаў у вобласці замежнай западнай філасофіі прадстауляюць М.А. Мажэйка, Я.М. Бабосаў, А.А. Грыцанаў, Т.Г. Румянцава, В.І. Аўчарэнка, У.Л. Абушэнка, А.А. Алексеева, Т.М. Тузова, А.В. Філіповіч і інш.

За час існавання суверэннай беларускай дзяржавы вынікі праведзеных у Інстытуце філасофіі даследаванняў станаўлення і развіцця філасофскай думкі Беларусі адлюстраваныя ў шматлікіх манаграфіях, дапаможніках і падручніках.

### 2.1.5. Сістэма маральных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства

Духоўнасць і маральнасць маюць важнае значэнне як фактары, якія забяспечваюць устойлівае развіццё грамадскай сістэмы. Аднак, у сучасным грамадстве хуткае засваенне навукова-тэхнічных дасягненняў суправаджаецца павольнымі пераўтварэннямі ў духоўнай сферы. Стан

беларускага грамадства непарыўна звязаны з глабальнымі трансфармацыйнымі працэсамі, і, такім чынам, спалучаны з супярэчнасцямі, якія складваюцца паміж традыцыйнымі і інавацыйнымі каштоўнасцямі. Гэта вядзе да з'яўлення рознага роду сацыяльна-маральных рызык. У цяперашні час відавочна патрэба ў маральным аздараўленні грамадства, яго духоўным і культурным ўзбагачэнні.

Праблема бяспекі з'яўляецца адной з першарадных для дзяржаўнай палітыкі. Рэспубліка Беларусь надае сур'ёзнае ўвагу абароне сваіх нацыянальных інтарэсаў, умацаванню міжнароднага аўтарытэту, супрацьдзеянні ваенным, палітычным, эканамічным, псіхалагічным, інфармацыйным пагрозам. У прынятай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь актуалізуюцца праблемы сацыякультурнага і духоўна-маральнага характару развіцця грамадства. У якасці аднаго з асноўных нацыянальных інтарэсаў пазначаецца развіццё інтэлектуальнага і духоўна-маральнага патэнцыялу грамадства, захаванне і прымнажэнне яго культурнай спадчыны, умацаванне духу патрыятызму.

У цяперашні час у вобласці духоўна-маральных адносін назіраецца супярэчнасць, якая заключаецца ў праяве, з аднаго боку, імкнення да інтэлектуальнага развіцця, самарэалізацыі чалавека, з другога - страта нацыянальна-культурных традыцый, падзенне нораваў, рост дэструктывізма. Эканамічныя, палітычныя, экалагічныя крызісы негатыўна адбіваюцца на псіхалагічным стане людзей. Назіраюцца неразвітасць сацыяльных і духоўных патрэбаў, рознага роду маральныя дэфармацыі.

Важна разумець, што ў аснове развіцця грамадства ляжаць змены ў культуры. Гэтыя змены звязаныя, перш за ўсё, з пераўтварэннем каштоўнасцяў. Прырода каштоўнасцяў - сацыяльная і гістарычная - людзі іх выпрацоўваюць ў выніку калектыўнай творчасці і ў ходзе пэўнага гістарычнага развіцця грамадства. Гэта значыць выпрацоўваецца нейкі эталон або стандарт, адзіны правільны выбар. А вось сёння культурныя каштоўнасці страчваюць сваю абсалютнасць і права на валоданне агульным універсальным аўтарытэтам: па-першае, хутка мяняюцца, па-другое, чалавек, рэалізуючы сваю свабоду, ўсталёўвае ў якасці абсалютных свае суб'ектыўныя каштоўнасці. Таму людзі ўвесь час знаходзяцца ў культурным шоку, пераскокваючы ад адных нормаў і каштоўнасцяў да іншых. Гэта прыводзіць да таго, што каштоўнасці нівеліруюць адна адну. Сучаснасць характарызуецца тым, што людзі губляюць каштоўнасныя арыентацыі і ідэалы, ім цяжка арыентавацца ў сённяшнім жыцці. Маральнасць сучаснага беларускага грамадства можна ахарактарызаваць як “варыянт маралі “мадэрніці”, які склаўся ва ўмовах індустрыялізацыі на базе камуністычнага мадэрн-праекта. Абавязкова трэба ўлічваць фон узораў маральнасці папярэдніх пакаленняў і традыцыі. У 1990-я гг. цэласнасць савецкай маралі сутыкнулася з ліберальнымі капіталістычнымі каштоўнасцямі, арыентацыямі спажывецкага таварыства і глабалізмам постмадэрну, гэта спрыяла стварэнню сітуацыі каштоўнаснай дэзарыентацыі. За разбурэннем савецкай мадэлі маральных каштоўнасцей не адбылася прапанова новай сістэмы. Гэта

прывяло да таго, што людзі сталі самастойна шукаць выйсце ў царкоўных сектах, адбыўся рост веры ў звышнатуральныя з'явы, экстрасэнсаў і г.д. Разам з гэтым адбыўся рост дэвіянтных паводзін – прастытуцыя, наркаманія, п'янства і арганізаваная злачыннасць – якія пачалі разглядацца не як негатыўная з'ява, а як праява новага жыцця.

Акрамя таго, у соцыўме цяпер пануе пазіцыя індывідуалізму. У цэлым, у свядомасці нашага грамадства адбылася пераарыентацыя з калектыўных праблем на асабістыя інтарэсы, звужэнне сацыяльнага гарызонту да межаў бліжэйшага акружэння. Маральная тэматыка сучаснасці перамясцілася з сферы адносін "асоба-грамадства" ў іншую – "асоба-асоба". Жыццёвая прастора і сфера самавыяўлення асобы атаясамліваецца з мікраасяроддзям, сямейнай групай, сяброўскай і, нарэшце, віртуальнай супольнасцю, роля якой пастаянна расце. Сучаснасць прадугледжвае абавязковае ўсведамленне сваёй індывідуальнасці і непаўторнасці. Гэта ня столькі грамадскі прынцып паводзін супрацьстаяння агульнаму, колькі спосаб самавыяўлення і знаходжання сябе. Іншымі словамі, сучасны індывідуалізм – гэта не барацьба за свабоду, а нацэленасць на бязмежнае самавыяўленне ўнутры наяўнага сацыяльнага парадку. Усведамляючы адзначаныя акалічнасці, праблема духоўна-маральнага выхавання, павінна перш за ўсё разглядацца як праблема выхавання асобы. Вырошчванне духоўнасці – гэта працэс, калі чалавек свядома прылучае сябе да больш высокай шкалы каштоўнасцяў. Каштоўнасная шкала фарміруецца ў выніку сацыяльных узаемадзеянняў, калі індывід так ці інакш суадносіць сябе з той ці іншай грамадскай шкалой каштоўнасцяў. Адну з ключавых роляў у гэтым працэсе адыгрывае інстытут адукацыі, у прыватнасці, гуманітарная адукацыя заклікана ўмацаваць гуманны пачатак у чалавеку.

Рэаліі XXI ст. вылучаюць на першы план праблему выпрацоўкі і рэалізацыі стратэгіі ўстойлівага развіцця грамадства на аснове прынцыпаў каэвалюцыі прыроды і грамадства, гуманізму, салідарнасці, справядлівасці, свабоды. Пераход ад зразумелага ўсім прынцыпу асабістага спажывання да парадыгмы адзінства чалавецтва быў бы грандыёзным крокам, прарывам, які немагчымы, калі асноўную стаўку рабіць па-ранейшаму выключна на сацыяльна-эканамічныя праекты і праграмы. Выпрацоўка сістэмы духоўных каштоўнасцей, выхавання высокамаральнай і гуманнай асобы, усведамляючай не толькі свае асабістыя, але і агульна нацыянальныя інтарэсы з'яўляецца асновай стабільнага развіцця грамадства.

# Раздзел 3. Умовы фарміравання і захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі

## 3.1. Гісторыка-культурныя каштоўнасці Беларусі

### 3.1.1. Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі

Гісторыка-культурная спадчына - гэта сукупнасць адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага развіцця беларускага народа, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях, якія прадстаўляюць сабой найбольш адметныя матэрыяльныя аб’екты і нематэрыяльныя праяўленні чалавечай творчасці, што маюць выдатныя духоўныя, эстэтычныя, дакументальныя вартасці і ўзяты пад ахову дзяржавы.

Існуе шмат варыянтаў класіфікацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Па форме выдзяляюць матэрыяльныя і духоўныя (нематэрыяльныя). Матэрыяльныя каштоўнасці – гэта каштоўнасці, матэрыяльнае ўвасабленне якіх складае іх сутнасць. Яны існуюць у канкрэтнай форме, якая і ўяўляе каштоўнасць, копіі не маюць вартасці арыгінала. У сваю чаргу матэрыяльныя каштоўнасці падзяляюцца на:

– рухомыя – пры перамяшчэнні ў прасторы не страчваюць сваёй вартасці (напрыклад – творы выяўленчага і ювелірнага мастацтва);

– нерухомыя – пры перамяшчэнні вартасць аб’екта можа быць цалкам або часткова страчана (помнікі архітэктуры і мемарыялы).

Духоўныя ці немататэрыяльныя каштоўнасці – гэта каштоўносці, магчымае матэрыяльнае ўвасабленне якіх не аказвае істотнага ўплыву на іх сутнасць. Іх вартасць не залежыць ад формы, гэта значыць, што розныя праявы і формы аднаго аб’екта маюць аднолькавую каштоўнасць. Сярод нематэрыяльных каштоўнасцей выдзяляюць:

– фіксаваныя – сутнасць якіх цалкам зафіксавана і не залежыць ад лёсу стваральнікаў ці сацыяльных змен у грамадстве (фальклор, нацыянальная кухня);

– увасобленыя – сутнасць якіх можа быць страчана са знікненнем іх стваральнікаў, носьбітаў ці пры змене сацыяльных умоў існавання (народныя рамёствы).

Больш дакладным з’яўляецца падзел гісторыка-культурных каштоўнасцей на групы:

1. Дакументальныя помнікі (летапісы, архіўныя дакументы, кнігі, кіна-, фота-, фонаматэрыялы. Самым стажытным дакументальным помнікам, які быў створаны на тэрыторыі Беларусі і які захаваўся да нашых дзён з’яўляецца Тураўскае Евангелле, створанае ў XII ст. На сёняшні час арыгінал яго захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. У 2014 г. беларускімі даследчыкамі было створана факсімільнае выданне гэтага твору. Найвялікшую групу дакументальных помнікаў складаюць архіўныя дакументы. У Беларусі створана сетка архіўных устаноў, сярод якіх можна

вылучыць Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (Мінск), Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Гродна і Мінск), Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў (Дзяржынск).

2. Этнаграфічныя помнікі – помнікі культуры традыцыйнага грамадства, сярод якіх ёсць як матэрыяльныя (прылады працы, народныя строі, помнікі народнага дойлідства і тыпы забудовы сядзіб) і духоўныя (нацыянальная кухня, фальклор, абрады і звычаі). Сярод этнаграфічных помнікаў выдзяляюць скансэны – музеі пад адкрытым небам. Ідэя стварэння першага беларускага скансэна належыла мастаку Фердынанду Рушчыцу, аднак ў выніку Першай сусветнай вайны назапашаны ім матэрыял быў знішчаны. Толькі ў 1976 г. быў створаны Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту (в. Азярцо, Мінскі раён). Музейны комплекс павінен быў уключаць больш за 250 помнікаў і 50 тыс. экспанатаў, вытворча-гаспадарчую зону, аб’екты інжынернага забеспячэння, унутрымузейныя дарогі, аб’екты добраўпарадкавання. На працягу 1987 – 1994 гг. для наведвальнікаў былі адчынены тры навукова-экспазіцыйных сектара: «Цэнтральная Беларусь» і часткова сфарміраваныя “Паазер'е” і “Падняпроўе”. Сёння ў склад экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўваходзяць каля 40 аб'ектаў, частка якіх знаходзіцца ў стадыі рэстаўрацыі. Праца на стварэнню музейнай экспазіцыі ў Азярцы працягваецца.

3. Помнікі археалогіі – гістарычныя артэфакты, выяўленыя пад час археалагічных раскопак, рэшткі паселішчаў (стаянкі, селішчы, гарадзішчы), могільнікі, гістарычны культурны слой у населеных пунктах. У Беларусі знойдзены стаянкі першабытных людзей Юравічы (Калінкавічскі раён), Бердыж (Чачэрскі раён). Археалагічны музей “Бярэсце” (г. Брэст) – прапаноўвае сваім наведвальнікам азнаёміцца з рэшткамі старажытнага Бярэсця і са знойдзенымі пад час раскопак артэфактамі.

4. Помнікі горадабудаўніцтва, дойлідства і архітэктуры – гістарычныя цэнтры гарадоў, прадмесці, вуліцы, асобныя будынкі, а таксама звязаныя з імі творы манументальнага, выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, садова-паркавага мастацтва і культурна-прыродныя ландшафты, якія ўтвараюць з помнікам архітэктуры адзіны комплекс. Найбольш старажытным захаваўшымся архітэктурным помнікам Беларусі з’яляецца Сафійскі сабор ў Полацку (XI ст.). Аднак першапачаткы буданак сабора быў моцна пашкоджаны ў пачатку XVIII ст. – ад яго фактычна захаваўся толькі фундамент і частка сцен. У сярэдзіне XVIII ст. на старым фундаменце быў узведзены новы храм. XII ст. датуецца Спасская царква ў Полацку. У рознай ступені захаваліся сярэндявечныя замкі ў Лідзе, Навагрудку, Крэве, Міры, Гродна, Любчы. Нясвіжскі касцёл Божага цела (сярэдзіна XVI ст.) з’яўляецца не толькі першым помнікам у стылі барока ва Ўсходняй Еўропе, але і другім ў свеце. Унікальнымі з’яўляюцца гатычныя цэрквы абарончага тыпа ў вёсках Сынкавічы (Зэльвенскі раён) і Мураванка (Шчучынскі раён).

5. Помнікі выяўленчага і прыкладнога мастацтва – творы жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога і ювелірнага мастацтва і інш.

6. Помнікі гісторыі – аб’екты звязаныя з важнымі гістарычнымі і культурнымі падзеямі і з жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей (мемарыялы, родныя мясціны знакамітых суайчыннікаў, месцы іх пахавання і інш.). Тут значную колькасць складаюць аб’екты звязаныя з падзеямі Другой сусветнай вайны – вайсковыя пахаванні, мемарыяльныя комплексы (“Хатынь”, “Дальва”).

Па месцы знаходжання і сучасным фізічным стане выдзяляюць наступныя групы:

1. каштоўнасці, якія знаходзяцца ў межах Рэспублікі Беларусь

2. каштоўнасці, якія легальна знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь (аб’екты, якія ў свой час былі вывезены ў адпаведнасці з тагачасным заканадаўствам, ці апынуліся на тэрыторыі суседніх дзяржаў ў выніку фарміравання дзяржаўных межаў).

3. каштоўнасці, якія нелегальна знаходзяцца па-за межамі Рэспублікі Беларусь (аб’екты, якія былі вывезены з парушэннем нормаў заканадаўства)

4. каштоўнасці, якія зніклі пры невысветленных абставінах, лёс якіх на сёняшні час невядомы. Прыкладам з’яўляецца адна з найвялікшых святыняў Беларусі – крыж Ефрасінні Полацкай, сляды якога былі згублены летам 1941 г.

5. каштоўнасці, якія патрабуюць тэрміновай рэстаўрацыі ці кансервацыі, аб’екты якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення або знішчэння. Сярод іншых у такім стане сёння знаходзіцца замак ў Крэва, без тэрміновай кансервацыі, гэты помнік архітэктуры і гісторыі ў бліжэйшыя дзесяцігоддзі можа быць страчаны.

Аб’екты, якім прысвойваецца статус гісторыка-культурных каштоўнасцей уключаюцца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Тут прыняты падзел каштоўнасцей на 4 катэгорыі, пазначаныя лічбамі:

Катэгорыя “0” (нуль) – гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя або прапанаваныя да ўключэння ў спіс сусветнай спадчыны. Па стане на 2016 г. ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЭСКО унесены наступныя беларускія аб’екты: Белавежская пушча (1992), Мірскі замак (2000), архітэктурны комплекс Нясвіж (2005), геадэзічны аб’ект “Дуга Струвэ” (2005), калядны звычай “Цары” у вёсцы Семежава (Капыльскі раён) (2009), Аўгустоўскі канал (2015). Да ліку прапанаваных да ўключэння у спіс сусветнай спадчыны адносяцца: Спаса-Праабражэнская царква і Сафійскі сабор у Полацку (2004), Камянецкая вежа (Белая Вежа) (2004), Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне (2004), Свята-Нікольскі жаночы манастыр у Магілёве (2004), Брэсцкая крэпасць (2004), палацава-паркавы ансамбль Румянцавых і Паскевічаў у Гомелі (2004), культавыя збудаванні абарончага тыпу ў Беларусі, Польшчы і Літве (2004), архітэктурны ансамбль праспекта Незалежнасці ў Мінску (2004), драўлянае культавае дойлідства Палесся

(2004), калядная гульня "Жаніцьба Цярэшкі" і традыцыя шапавальства ў Дрыбіне.

Катэгорыя “1” – унікальныя мастацкія, эстэтычныя і дакументальныя аб'екты міжнароднага значэння;

Катэгорыя “2” – аб’екты гісторыка-культурнай спадчыны рэспубліканскага значэння;

Катэгорыя “3” – гісторыка-культурныя каштоўнасці рэгіянальнага значэння.

Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці падзяляюцца на 2 групы:

“А” – гісторыка-культурныя каштоўнасці, поўная аўтэнтычнасць і дакладнасць якіх безумоўныя і нязменныя;

“Б” – гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія поўнасцю або часткова аднаўлены (зафіксаваны) на другасным матэрыяле ці адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці якіх аб’ектыўна з часам могуць змяняцца.

Працэс фарміравання Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пачаўся у пачатку 1990-х гг. і працягваецца да нашага часу. У 2007 г. яго складалі 4811 аб'ектаў. На 2010 г. у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцяў было ўжо 4911 аб'ектаў (з іх 4779 нерухомыя, 73 рухомыя і 59 нематэрыяльныя).

У 2013 г. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей складалі 5533 аб'ектаў. У тым ліку 1763 помнікаў архітэктуры, 1191 – гісторыі, 60 – мастацтва, 2350 – археалогіі, 11 – горадабудаўніцтва, 4 запаведныя мясцовасці, 77 рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, 77 нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Нажаль колькасць аб’ектаў Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пастаянна змяняецца не толькі ў выніку ўключэння ў яго новых пазіцый, але і з прычыны страты пэўных помнікаў (знішчэнне, пажары, немагчымасць кансервацыі і інш.).

### 3.1.2. Праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі

Праблема захавання гісторыка-культурнай спадчыны паўстала з пачаткам навуковага вывучэння Беларусі. Першыя спробы ахоўы датычацца XIX ст., але яны не мелі цэласнага характара. Вялікі ўклад у гэтым накірунку зрабілі браты Яўстах і Канстанцін Тышкевічы, якія арганізавалі археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі і стварылі ў сваёй рэзідэнцыі ў Лагойску першы гістарычны музей, які затым быў перавезены ў Вільню. Па ініцыятыве Яўстаха Тышкевіча была створана Віленская Археаграфічная камісія, якая займалася зборам і даследваннем гістарычных каштоўнасцей на тэрыторыі Беларусі і Літвы у 1855 – 1865 гг.

Багаты матэрыял па гісторыі Беларусі і гістарычных каштоўнасцях Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў сабраў генерал Міхаіл Бэз-

Карніловіч, які ў 1855 г. выдаў “Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии”.

Аднак гэтыя крокі адбываліся на фоне знішчэння гістарычнай спадчыны. Пад час перапланіроўкі гарадской забудовы і ўзвядзення новых будынкаў знішчаліся гістарычныя аб’екты. Так, гістарычны цэнтр Брэста апынуўся пад зямлёй у выніку будаўніцтва Брэсцкай крэпасці. У 1857 г., з мэтай выкаранення напамінаў аб ранейшых вольнасцях, па асабістаму загаду Мікалая I была разбурана Мінская ратуша. Пасля паўстанняў 1830 – 1831 гг. і 1863 – 1864 гг. касцёлы і ўніяцкія цэрквы пераўтвараліся ў праваслаўныя, знішчаліся творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, спальваліся кнігі і рукапісы, вывозіліся архівы шляхецкіх родаў, часам спустошваліся пахаванні.

Лёс шматлікіх аб’ектаў цалкам залежыў ад іх уладальнікаў. У 1840-я гг. пачалі разбіраць на цэглу Мірскі замак, але дзякуючы паэту У. Сыракомлі гэты працэс быў спынены. Аналагічная сітуацыя склалася ў Смалянах (Аршанскі раён), дзе памешчык Сямёнаў пачаў разбураць замак князёў Сангушак (Белы замак). Дзякуючы кампаніі ў прэсе рэшткі замка здолелі захаваць. Менш пашанцавала Гальшанскаму замку, дзе ў 1880 г. памешчык Гарбанёў узарваў вежы і сцены і пабудаваў карчму.

Разам з гэтым пачынаюцца і першыя рэстаўрацыйныя работы. У 1853 – 1859 гг. у выніку абвала берага Нёмана была страчана частка Барысаглебскай (Каложскай) царквы ў Гродна. Для захавання храма была пабудавана часовая драўляная частка, у такім выглядзе храм знаходзіцца і сёння. У 1903 г. па загаду Мікалая II была праведзена рэстаўрацыя Камянецкай вежы і кансервацыя Лідскага замка.

Значную шкоду гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі нанесла Першая сусветная вайна і рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. У выніку баявых дзеянняў быў значна пашкоджаны Крэўскі замак, адбываліся канфіскацыі каштоўнасцей, рабаванні памешчыцкіх сядзіб, храмаў. У гэтых складаных умовах 30 студзеня 1919 г. урад БССР прыняў пастанову “Аб перадачы культурных каштоўнасцей навукі і мастацтва Камісарыяту адукацыі і аб арганізацыі іх уліку, аховы і збору”.

У 1924 г. была прынята сумесная пастанова камісарыятаў адукацыі, земляробства і ўнутраных спраў, якая забараняла разбурэнне гістарычных каштоўнасцей без дазволу дзяржавы. Пры Інбелкульце (з 1929 – Акадэмія навук Беларусі) была створана Камісія па ахове помнікаў мастацтва, якая атрымала права на правядзенне рэстаўрацыйных работ. Пад яе аховай знаходзіліся археалагічныя помнікі, сядзібы і прысядзібныя паркі.

Складаная сітуацыя склалалася з культавымі збудаваннямі. Ва ўмовах барацьбы савецкай улады з царквой у 1920 – 1930 гг. было абвешчана, што храмы не маюць гістарычнай каштоўнасці. Шмат з іх было знішчана, частка ператворана ў зернесховішчы (у сельскай мясцовасці), клубы, спартыўныя аб’екты (Кафедральны касцёл у Мінску). У Чырвоным касцёле (касцёл св. Сымона і Алены) размясцілася кінастудыя. У 1937 г. у Магілёве пад час будаўніцтва Дома Урада за адну ноч ыло разабрана 9 цэркваў. Падобныя

з’явы назіраліся і з старымі пахаваннямі. Пасля ўзрыву капліцы Прушынскіх у Лошыцы (Мінск) свінцовыя труны былі пераплаўлены на пласціны для акамулятараў. У 1934 г. былі ліквідаваны Старажоўскія могілкі ў Мінску, а каменныя пліты пайшлі на будаванне Дома Чырвонай Арміі (Дом Афіцэраў).

У Заходняй Беларусі у 1920 – 1930-я гг. дзейнічала Камісія па ахове помнікаў старажытнасці пад кіраўніцтвам Фердынанда Рушчыца, якая займалася аховай замкаў, рэстаўрацыяў касцёлаў (часам вяртаўся першасны вгляд, тым храмам, якія ў свой час былі пераўтвораны ў праваслаўныя цэрквы). Дзякуючы камісіі ў 1924 – 1931 гг. у Наваградку быў насыпаны Курган Бессмяротнасці у гонар Адама Міцкевіча.

Амаль усе поспехі міжваеннага часу былі зруйнаваны ў гады Другой сусветнай вайны. Падзеі вайны і пасляваенныя аднаўленчыя работы значна змянілі выгляд населеных пунктаў Беларусі. У 1948 г. была прынята пастанова “Аб мерах па паляпшэнню аховы помнікаў культуры”, дзе была агучана канцэпцыя па стварэнню гісторыка-культурных запаведнікаў. Але у цэлым палітыка ў дачыненні да гістарычнай спадчыны не змянілася. Штогод спіс страчаных аб’ектаў павялічваўся. У 1953 г. быў узарваны касцёл св. Станіслава ў Пінску, у 1957 г. – знесена Магілёўская ратуша. У 1961 г. быў узарваны адзін з самых старажытных касцёлаў Беларусі – Фарны касцёл Гродна (Фара Вітаўта).

У 1967 г. было створана Добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Члены яго ініцыіравалі рэстаўрацыйныя работы такіх аб’ектаў як Камянецкая вежа, Мірскі і Лідскі замкі, Сафійскі сабор і інш. У тым жа 1967 г. быў створаны першы гісторыка-культурны запаведнік у Полацку.

Значныя змены у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны адбыліся ў выніку палітыкі Перабудовы і набыцця незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Узрасла цікаўнасць грамадства да айчыннай гісторыі і спадчыны, дзяржава нармалізавала адносіны з царквой і вярнула ёй маёмасць, пачалося аднаўленне храмаў.

13 лістапада 1992 г. быў прыняты закон Рэспублікі Беларусь “Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны” (дапаўненні і змяненні 1995, 1998 г.). Пры Міністэрстве культуры быў створаны Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пад кіраўніцтвам якага вядзецца праца па стварэнню Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей. Захаванню гісторыка-культурнай спадчыны і развіццю турызма ў Беларусі прысвечаны дзяржаўныя праграмы “Замкі Беларусі” і “Культура Беларусі”.

Беларусь актыўна супрацоўнічае з міжнароднымі арганізацыямі, у тым ліку ЮНЭСКО. Праца ідзе не толькі ў накірунку ўключэння беларускіх аб’ектаў у спіс сусветнай спадчыны, аб чым гаворылася вышэй, але і ўшанаванні памяці знакамітых ураджэнцаў Беларусі і важных падзей з беларускай гісторыі на міжнародным узроўні. Толькі ў перыяд з 2006 па 2016 г. ЮНЭСКО ўсталявала наспупныя памятныя даты:

- 200-годдзе з дня нараджэння мастака і кампазітара Напалеона Орды (2007 г.);

- 200-годдзе з дня нараджэння паэта, драматурга і акцёра Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (2008 г.);
- 600-годдзе запаведнага рэжыму ў Белавежскай пушчы (2009 г.);
- 200-годдзе з дня нараджэння мастака Івана Хруцкага (2010 г.);
- 1150-годдзе першага згадвання ў летапісах горада Полацка (2012 г.);
- 200-годдзе з дня нараджэння вучонага і дыпламата Іосіфа Гашкевіча (2014 г.)4
- 250-годдзе з дня нараджэння палітычнага дзеяча, дыпламата і кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага (2015 г.).

Негледзячы на пэўныя поспехі апошніх гадоў у справе захавання гісторыка-культурнай спадчыны застаецца шмат цяжкасцей. Вялікую занепакоенасць выклікае якасць правядзення рэстаўрацыйных работ, калі гістарычныя будынкі губляюць свой выгляд, ці выкарыстоўваюцца сучасныя матэрыялы. Шкоду прыносіць і дзейнасць так званых “чорных капальнікаў”, у выніку якой часта адбываецца знішчэнне гістарычных помнікаў і вываз каштоўнасцей за мяжу. Дадзеная дзейнасць з’яўляецца супрацьпраўнай і караецца па закону.

Асобнай праблемай з’яўляецца пытанне рэстытуцыі (вяртання) гісторыка-культурных каштоўнасцей. Даддзенай справай займаюцца як дзяржаўныя ўстановы (Міністэрства культуры і Міністэрства замежных спраў), так і прыватныя асобы і арганізацыі. Справа ўскладняецца тым, што многія каштоўнасці былі вывезены з Беларусі ў свой час на законных абставінах і іх новыя ўладальнікі маюць усе правы на іх. Вяртанне гэтых каштоўнасцей звязана са значнымі фінансавымі выдаткамі. Акрамя таго заканадаўства асобных краін забараняе рэстытуцыю. Сярод тых каштоўнасцей, якія здолелі вярнуць у апошнія гады, можна назваць выданні Статута 1588 г. і “Вялікае майстэрства артэлерыі” Казіміра Семяновіча, што былі выкуплены на замежных аукцыёнах дзякуючы ініцыятыве грамадзян, а таксама ўнікальнае рукапіснае Слуцкае Евангелле XVI ст.

## 3.2. Роля этнаканфесійнага фактара ў фарміраванні гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа

### 3.2.1. Уплыў рэлігіі на духоўнае і культурнае развіццё беларускага народа

**Язычніцтва.** Да канца X ст. славяне – продкі сучасных беларусаў – былі язычнікамі. Язычніцкі пантэон уключаў мноства багоў. Дажбог, Стрыбог, Вялес, Хорс, Пярун, Вялес, Макош, вадзянікі, лясуны, дамавікі, русалкі. Славяне рабілі драўляныя выявы багоў, якія ставіліся на капішчах – месцах пакланення багам. Язычніцкія святы былі звязана з гадавым цыклам сонца. На зімовае сонцастаянне адзначалася свята Каляда – пасля прыняцця хрысціянства гэтае свята было прывязана да Нараджэння Хрыстова і захавалася ў выглядзе абраду калядавання. Вясновае сонцастаянне было

прысвечана богу Хорсу, выявай якога быў сонечны дыск – адсюль узнікла традыцыя пекчы бліны, а ў хрысціянскім календары дадзеная свята стала адзначацца ў выглядзе Масленечнага тыдня перад вялікім пастом. Летняе сонцастаянне было звязана з богам Ярылай і называлася Купалле. Восеньскае сонцастаянне прысвячалася богу Дажбогу. У нашыя дні яго традыцыі захаваліся ў свяце Багач ці Дажынкі. Язычніцкія карані маюць традыцыі памінання продкаў – святы Радуніца і Дзяды захаваліся і да нашага часу.

**Прыняцце хрысціянства. Праваслаўе**. У апошняй чвэрці Х ст. вялікі князь кіеўскі Ўладзімір Святаслававіч вырашыў замяніць палітэістычную рэлігію монатэізмам. Выбіраючы, згодна старажытнага летапісу Аповесць мінулых часоў, паміж ісламам, іўдаізмам і хрысціянствам, князь, фактычна не меў альтэрнатывы. Хрысціянская рэлігія была ўжо добра вядома ў Кіеўскай Русі. Сюды прыходзілі хрысціянскія місіянеры з Візантыі, бабка Ўладзіміра княгіня Вольга была хрысціянкай.

На той час хрысціянская царква яшчэ была адзінай, аднак ужо існавалі два рэлігійныя цэнтры хрысціянства, якія канкурыравалі за лідэрства: Рым з рымскім папам і Канстанцінопаль на чале з патрыярхам. Сувязі Кіеўскай Русі з краінамі Заходняй Еўропы былі не такімі трывалымі, як з Візантыяй, таму прыняццю хрышчэння менавіта з Канстанцінопаля фактычна не было альтэрнатывы. У 988 г. князь Уладзімір з дружынай ахрасціўся, гарадское і сельскае насельніцтва было пастаўлена перад фактам неабходнасці прыняцця хрысціянства, хаця язычніцкія вераванні, асабліва сярод сялян, трымаліся яшчэ многія стагоддзі.

Пасля фармальнага расколу адзінай хрысціянскай царквы на праваслаўную і каталіцкую ў 1054 г., калі рымскі папа і канстанцінопальскі патрыярх узаемна праклялі адзін аднаго, Кіеўская Русь стала праваслаўнай дзяржавай. Былі створаны царкоўныя акругі – епархіі на чале з епіскапамі, якія падпарадкоўваліся кіеўскаму мітрапаліту (апошні прызначаўся канстанцінопальскім патрыярхам), епархіі дзяліліся на царкоўныя прыходы. на землях Беларусі ў 992 г. была створана Полацкая епархія і ў 1005 г. – Тураўская. Хрысціянізацыя садзейнічала культурнаму ўздыму. Дзякуючы хрысціянству на Беларусі з’явілася пісьменства і літаратура, каменнае дойлідства, пачало актыўна развівацца выяўленчае (фрэскі, іканапіс, мазаіка) і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, пры цэрквах і саборах ствараліся школы.

**Каталіцтва.** Праваслаўе з’яўлялася пануючай рэлігіяй да канца XIV ст. у Вялікім княстве Літоўскім, якое уключала ў сабе землі сучаснай Беларусі, Літвы, Украіны і заходнія рэгёны Расіі, абсалютную большасць насельніцтва стваралі праваслаўныя хрысціяне. Пераарыентацыя вялікім князем літоўскім Ягайлам знешнепалітычнага курсу на Польшчу ў канцы XIV ст. змяніла канфесійную сітуацыю на беларускіх землях. У 1385 г. паміж Польшчай і ВКЛ была заключана Крэўская ўнія, згодна ўмовам якой Ягайла прымаў каталіцтва і абяцаў ахрасціць у каталіцтва літоўскіх язычнікаў. Разам з князем у каталіцтва перайшла частка феадалаў ВКЛ. З гэтага моманту вялікія князі літоўскія аддавалі прыярытэт феадалам-католікам. У 1387 г. выйшаў

прывілей Ягайлы феадалам-католікам, якія атрымалі спадчынныя правы на зямлю. Дзяржаўныя пасады пачынаюць займаць католікі. Згодна Гарадзельскай ўніі 1413 г. католікам далі права карыстацца гербамі. Такім чынам, ў дзяржаве ўзнікла рэлігійная напружанасць, калі ільготы і прывілеі даваліся каталіцкай меншасці, праваслаўная большасць была пастаўлена ў прыніжанае становішча. З цягам часу каталіцкая царква распаўсюдзіла свой ўплыў па ўсёй тэрыторыі ВКЛ, каталіцкія храмы з'явіліся ва ўсіх гарадах Беларусі, каталіцтва ўслед за князем і феадаламі прымалі сяляне і гараджане. І хоць колькасна праваслаўныя пераважалі, аднак, праваслаўная царква па свайму палітычнаму ўплыву і маёмаснаму становішчы да XVI ст. рэзка сатупала каталіцкай.

**Пратэстантызм.** У XVI ст. на беларускіх землях з'явілася яшчэ адна галіна хрысціянства – пратэстантызм. У гэты час Еўропа была ахоплена Рэфармацыяй (рух за аднаўленне каталіцкай царквы), старт якой даў нямецкі манах Марцін Лютэр. У 1517 г. ён апублікаваў свае знакамітыя "95 тэзісаў", у якіх выступіў з рэзкай крытыкай заган, што былі ў каталіцкай царкве. Супраць усеўладдзя каталіцкай царквы выступалі розныя слаі насельніцтва еўрапейскіх краін: феадалы, гараджане, сяляне. Выклікала незадавальненне і ўсеўладдзе рымскіх пап, якія лічылі духоўную ўладу вышэй за свецкую і імкнуліся дыктаваць сваю волю правіцелям краін Еўропы. Феадалаў таксама вабілі вялікія зямельныя ўладанні царквы. Сяляне і гараджане выступалі супраць царкоўнай дзесяціны, прымусовага продажу індульгенцый, жорсткасці інквізіцыі, залішняй пышнасці каталіцкіх храмаў. Грамадства лічыла не патрэбным існаванне манахаў, еўрапейскія інтэлектуалы патрабавалі магчымасці для міран самастойна вывучаць слова Божае, весці набажэнствы на нацыянальных мовах, а не на лацінскай, якую абсалютная большасць людзей не разумела.

М. Лютэру і яго паслядоўнікам не ўдалося рэфармаваць каталіцкую царкву, аднак, вынікам іх дзейнасці стала з'яўленне новай хрысціянскай канфесіі – пратэстантызма. Пратэстанцкая царква адпавядала патрабаванням людзей паколькі была таннай. царкоўная дзесяціна, зямельныя ўладанні, манастыры адсутнічалі, пратэстанцкія храмы былі вельмі сціплымі ў аздаблені. На нацыянальныя мовы народаў Еўропы была перакладзена Біблія (М.Лютэр першым пераклаў Біблію на нямецкую мову).

У адрозненні ад каталіцтва і праваслаўя, пратэстантызм не з'яўляўся адзінай цэнтралізаванай канфесіяй, ён дзяліўся на шэраг асобных накірункаў: лютэранская царква ў Германіі і краінах Скандынавіі, кальвінізм, які быў распаўсюджаны ў Швейцарыі і Францыі, англіканства, прэсвітэрыянства, арыянства і інш.

На тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага асноўнымі накірункамі пратэстантызму ў XVI – XVII стст. былі кальвінізм і антытрынітарызм (арыянства), сацыяніянства. Кальвіністы лічылі Біблію адзінай крыніцай веры, верылі ў прадвызначанасць чалавечага лёсу, з хрысціянскіх таінстваў прызнавалі толькі хрышчэнне і прычасце. Кальвінісцкая дактрына прадугледжвала адмову ад ідэі боскага паходжання вярхоўнай улады, што

стымулявала магнатаў, шляхту і мяшчан пераходзіць у пратэстантызм. Асяродкамі кальвінізму ў ВКЛ былі Брэст, Віцебск, Клецк. Пратэстанцкія храмы (зборы) з'явіліся ў многіх гарадах Беларусі, была створана пратэстанцкая сістэма адукацыі (у 1617 г. была адчынена Слуцкая кальвінісцкая гімназія – старэйшая навучальная ўстанова Беларусі, якая дзейнічае і да нашага часу), вялася гуманітарная дзейнасць (шпіталі, прытулкі для жабракоў), актыўна выдаваліся кнігі. Мецэнатамі пратэстантызма ў ВКЛ з'яўляліся магнаты Радзівілы. У 1563 г. ў г. Брэсце была надрукавана пратэстанцкая Біблія.

Прыхільнікі арыянства (антытрынітарыі) адвяргалі вучэнне аб Тройцы (Бог-айцец, Бог-сын, Бог-Дух Святы). Яны прызнавалі Богам толькі «Бога-айца», Ісуса Хрыста лічылі толькі вялікім чалавекам, якому Бог адкрыў ісціны.

У наш час пратэстанты з'яўляюцца рэлігійнай меншасцю. У краіне зарэгістравана каля 1000 пратэстанцкіх абшчын. Буйнейшыя пратэстанцкія аб'яднанніI: Аб'яднаная царква хрысціян веры евангельскай у Беларусі, Саюз евангельскіх хрысціян-баптыстаў у Рэспубліцы Беларусь, Адвентысцкая царква, Евенгеліцка-лютэранская царква. Пратэстанцкія абшчыны складаюць каля паловы рэлігійных абшчын у шэрагу раённых цэнтраў.

**Уніяцтва.** У другой палове XVI ст. каталіцкая царква спрабавала вярнуць страчаныя пад час Рэфармацыи пазіцыі, пачаўся працэс Контррэфармацыі, рухаючай сілай якой быў ордэн езуітаў са сваёй магутнай сістэмай адукацыі. На пачуцці людзей уплываў пышны стыль барока, у якім будаваліся каталіцкія храмы. У кантэксце Контррэфармацыі адбылася спроба аб'яднання хрысціянскіх канфесій Рэчы Паспалітай пад уладай рымскага папы.

Спробы пераадолець царкоўны раскол рабіліся неаднаразова. Інтэлектуалы сярэднявечча і новага часу разумелі штучны характар падзелу хрысціянства (Фэрара-Фларэнтыйскі сабор 1483 – 1445 гг.) Праваслаўныя іерархі Рэчы Паспалітай разумелі прыніжанае становішча сваёй канфесіі на фоне каталіцкай, таму, аб'яднанне для іх было магчымасцю атрымаць такія ж эканамічныя і палітычныя магчымасці, якія былі ў каталіцкага духавенства. Рэлігійную сітуацыю ў ВКЛ актыўна выкарыстоўвала Маскоўскае княства (затым Руская дзяржава). Сітуацыя з праваслаўным насельніцтвам ў ВКЛ была повадам да шматлікіх войнаў, У 1596 г. у Брэсце адбыўся сабор праваслаўнага духавенства Рэчы Паспалітай, на якім была абвешчана царкоўная ўнія з каталіцкай царквой. Праваслаўная царква Рэчы Паспалітай прызнавала вяршэнства рымскага папы прымала некаторыя каталіцкія дагматы, але захоўвала сваю абраднасць і святы.

Ідэю ўніі спачатку не прыняла значная частка праваслаўнага духавенства і вернікаў. Улады Рэчы Паспалітай спачатку насаджалі ўніяцтва жорсткімі метадамі. Так, уніяцкі архібіскуп Ясафат Кунцэвіч у г. Віцебску зачыніў усе праваслаўныя храмы, забараняў святарам і вернікам праводзіць рэлігійныя абрады, нават пахаванне. У выніку ён быў забіты паўстаўшымі віцебчанамі ў 1623 г. З 30-х гг. XVII ст. улады перайшлі да мірных сродкаў

распаўсюджвання ўніі і легалізавалі праваслаўную царкву. Пашырэнню ўніі спрыяла дзейнасць у Рэчы Паспалітай уніяцкага манаскага ордэна базыліян, які меў вялікую колькасць калегіўмаў, у якіх адукацыю на роднай мове маглі атрымаць дзеці дробнай шляхты і мяшчан. У выніку ў XVIII ст. ўніяты складалі каля 70 % хрысціянскіх вернікаў Беларусі (пераважна мяшчане і сяляне).

У 1839 г. у кантэскце змен палітыкі расійскіх улад адносна насельніцтва Беларусі ўніяцтва было ліквідавана. У Полацку адбыўся царкоўны сабор, на якім пад ціскам расійскіх улад уніяцкае духавенства прыняла рашэнне аб аб’яднанні з праваслаўнай царквой. Адраджэнне ўніі адбылося ў 1920-я гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Па стане на 2008 г. колькасць вернікаў-уніятаў складае каля 10000 чалавек, маецца 15 зарэгістраваных прыходаў. набажэнства вядзецца на беларускай мове.

Згодна закону Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацыях” ад 31 кастрычніка 2002 г. гарантуецца свабода сумлення і веравызнання, роўнасць грамадзян перад законам незалежна ад веравызнання і адносін да рэлігіі. Закон прызнае вядучую ролю праваслаўнай царквы ў гістарычным развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа, ролі каталіцкай царквы, неад’емнай ад агульнай гісторыі народа Беларусі, пратэстантызма, іудаізма і ісламa. У законе падкрэсліваецца неабходнасць спрыяння дасягненню ўзаемнага разумення, цярплівасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання.

Па стане на 2012 г. 95,5 % грамадзян адзначылі сваю прыналежнасць да той ці іншай канфесіі, з іх: 83 % вернікаў – праваслаўныя (каля 77 % ад агульнай колькасці насельніцтва), 10 % католікі (каля 9,5 % ад агульнай колькасці насельніцтва), 1,5 % – іншыя рэлігіі. Пры гэтым, нягледзячы на тое, што абсалютная большасць грамадзян атаясамліваюць сябе з канкрэтнай канфесіяй, вернікамі лічаць сябе толькі 65 % насельніцтва.

### 3.2.2. Міжэтнічныя адносіны ў Беларусі і праблема захавання нацыянальнай ідэнтычнасці

**Нацыянальныя меншасці** — нацыянальныя супольнасці ў поліэтнічных дзяржавах, якія складаюць адносную меншасць насельніцтва ў параўнанні з асноўнай нацыянальнасцю краіны. Да іх звычайна адносяцца групы людзей, што пастаянна жывуць на тэрыторыі пэўнай дзяржавы, маюць яе грамадзянства, але адрозніваюцца сваім этнічным паходжаннем, матэрыяльнай і духоўнай культурай, самасвядомасцю, мовай, рэлігіяй, ментальнасцю. Нацыянальныя меншасці існуюць ва ўсіх шматэтнічных краінах свету.

У прынятай ААН у **1992 г. «Дэкларацыі правоў асоб, што належаць да нацыянальных ці этнічных, рэлігійных і моўных меншасцей»** абвешчаны іх правы на бесперашкоднае развіццё сваёй культуры, мовы і

рэлігіі, стварэнне ўласных аб'яднанняў і таварыстваў, а таксама магчымасць карыстацца ўсімі грамадзянскімі свабодамі без аніякай дыскрымінацыі і абмежавання.

**Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь»,** прыняты ў 1992 г., гарантуе свабоднае развіццё культур, моў, традыцый усіх этнічных супольнасцей у Беларусі, садзейнічае гарманізацыі міжнацыянальных адносін, дазваляе ствараць нацыянальныя грамадскія арганізацыі і культурна-асветныя ўстановы.

У 1989 г. у БССР пражывала 10 152 000 насельніцтва, з якіх беларусы складалі 77,9 %, рускія – 13,2 %, палякі – 4,1 %, украінцы – 2,9 %, яўрэі – 1,1 %. Налічвалася 12400 татар і 10800 цыганоў. Усяго ў гэты час у БССР пражывалі прадстаўнікі каля 100 нацыянальных меншасцяў. У канцы 1980-х гг. узніклі першыя культурна-асветніцкія таварыствы нацыянальных меншасцей. Зарэгістраваныя згуртаванні маюць палякі, яўрэі, рускія, украінцы, татары, літоўцы, немцы, армяне, азербайджанцы і карэйцы. У чэрвені 1994 г. ў Мінску заснаваны Цэнтр нацыянальных культур Беларусі. Усе разам нацыянальныя меншасці складаюць звыш 20 % насельніцтва Беларусі.

**Дынаміка нацыянальнага складу Беларусі**

| | **1959 г.** | **1970 г.** | **1979 г.** | **1989 г.** | **1999 г.** | **2009 г.** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Усяго насельніцтва | 8 055 714 | 9 002 338 | 9 532 516 | 10 151 806 | 10 045 237 | 9 503 807 |
| **Беларусы** | **6 532 035** | **7 289 610** | **7 567 955** | **7 904 623** | **8 159 073** | **7 957 252** |
| Рускія | 660 159 | 938 161 | 1 134 117 | 1 342 099 | 1 141 731 | 785 084 |
| Палякі | 538 881 | 382 600 | 403 169 | 417 720 | 395 712 | 294 549 |
| Украінцы | 133 061 | 190 839 | 230 985 | 291 008 | 237 014 | 158 723 |
| Яўрэі | 150 084 | 148 011 | 135 450 | 111 977 | 27 798 | 12 926 |
| Татары | 8 654 | 10 031 | 10 911 | 12 552 | 10 089 | 7 316 |
| Цыганы | 4 662 | 6 843 | 8 408 | 10 762 | 9 927 | 7 079 |

**Доля асобных нацыянальнасцяў у агульнай колькасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь, 2009 г.**

| | % | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | **Беларусы** | **Рускія** | **Палякі** | **Украінцы** | **Яўрэі** |
| Рэспубліка Беларусь | 83,7 | 8,3 | 3,1 | 1,7 | 0,1 |
| Брэсцкая вобласць | 88 | 6,4 | 1,3 | 2,9 | 0,0 |
| Віцебская | 85,1 | 10,2 | 0,9 | 1,2 | 0,2 |
| Гомельская | 88,2 | 7,7 | 0,1 | 2,1 | 0,2 |
| Гродзенкая | 66,7 | 8,2 | 21,5 | 1,4 | 0,1 |
| г. Мінск | 79,3 | 10,0 | 0,7 | 1,5 | 0,3 |
| Мінская | 88,5 | 7,1 | 1,3 | 1,2 | 0,0 |
| Магілёўская | 88,7 | 7,8 | 0,2 | 1,2 | 0,1 |

**Рускія.** Адной з найвялікшых этнічных меншасцяў на беларускіх землях з’яўляюцца рускія. Міграцыі рускага насельніцтва ў Рэч Паспалітую адбываліся ў XV – XVI стст., калі расійскія сяляне беглі ў ВКЛ ад прыгоннай залежнасці, а таксама пасля правядзення царкоўнай рэформы патрыярха

Нікана ў Расіі ў 1650 – 1660-х гг. Тыя, хто не прыняў рэформу, атрымалі назву стараабрадцы (стараверы). У Расійскай дзяржаве яны падвяргаліся дыскрымінацыі, таму ў вялікай колькасці пачалі перасяляцца на землі Беларусі. Ва ўсходніх раёнах узніклі раёны кампактнага пражывання старабрадцаў (Ветка, Віцебск, Полацк), якія жылі ізалявана, захоўвалі сваю рэлігійна-культурную самабытнасць (трыманне дарэформеных абрадаў праваслаўя, адсутнасць святароў, манахаў, непрыняцце ўжывання алкаголю і тытуню). Склаўся самабытны іканапіс стараабрадцаў. У наш час працуе Музей стараабрадніцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава ў г. Ветка Гомельскай вобласці.

Другая хваля міграцыі рускіх на тэрыторыю Беларусі адбылася пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі. Расійскія імператары пачалі раздаваць землі з прыгоннымі сялянамі рускім памешчыкам, каб нейтралізаваць уплыў польскай шляхты; сюды накіроўвалася мноства чыноўнікаў з расійскіх губерняў. Адначасова пасля адмены прыгоннага права пачаўся адток беларускага насельніцтва (эміграцыя ў Амерыку, выезд ў азіяцкую частку імперыі пад час Сталыпінскай рэформы), што павялічвала долю рускага насельніцтва ў Беларусі, як і палітыка русіфікацыі. Этнічныя рускія асядалі на беларусі пад час рэвалюцыйных падзей 1917 г. (салдаты-бальшавікі Заходняга фронту), у часы СССР (накіраваныя сюды на працу партыйныя і дзяржаўныя чыноўнікі, спецыялісты з часоў індустрыялізацыі, вайскоўцы).

У часы беларусізацыі савецкія ўлады праводзілі карэктную палітыку ў адносінах да нацыянальных меншасцяў Беларусі. Згодна Канстытуцыі БССР 1927 г. дзяржаўнымі мовамі, акрамя беларускай, з'яўляліся таксама руская, польская і яўрэйская. Было створана 16 рускіх нацыянальных раёнаў.

У ХХ ст. удзельная вага рускага насельніцтва пастаянна павялічвалася: у 1926 г. — 384 тыс. чал. (7,7 % усяго насельніцтва); 1959 г. — 659 тыс. чалавек (8,2 %); 1979 г. — 938 тыс. (10,4 %); 1989 г. — 1342 тыс. (13,2 %); 1999 г. — 1142 тыс. чалавек (11,4 %).

**Палякі.** Вынікам аб'яднання Вялікага княства Літоўскага і каралеўства Польскага ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую стала экспансія польскай культуры і каталіцкай рэлігіі. З цягам часу шляхецкае саслоўе ВКЛ страціла сваю нацыянальна-культурную адметнасць, злілася з польскай шляхтай і стварыла "польскі народ шляхецкі". Да XVIII ст. нашчадкі магнатаў і шляхты ВКЛ па мове, культуры, самасвядомасці былі палякамі. Старабеларуская мова страціла статус дзяржаўнай мовы ў ВКЛ і была заменена польскай (пастанова сейма 1696 г.). Праз каталіцкі касцёл адбывалася паланізацыя часткі сялянства і гараджан. Пасля Польска-савецкай вайны 1919 – 1920 гг. па выніках Рыжскага міру 18.03.1921 г. Заходняя Беларусь апынулася пад уладай Польскай дзяржавы. З мэтай умацавання пазіцый польскай улады на гэтых землях сталі рассяляцца так званыя асаднікі – былыя польскія вайскоўцы, якім улада давала зямельныя надзелы. нацыянальна-культурная дыскрымінацыя беларусаў польскімі ўладамі прывяла да павелічэння колькасці жыхароў регіёну, якія пачалі

лічыць сябе палякамі. Прыналежнасць да польскай нацыі давала магчымасць у прыярытэтным парадку атрымаць сярэднюю і вышэйўую адукацыю, займаць дзяржаўныя пасады, служыць у войску і паліцыі. па-ранейшаму актыўна паланізацыя вялася праз каталіцкі касцёл. У выніку ў рэгіёне мелася значная колькасць грамадзян, якія былі носьбітамі польскай самасвядомасці.

У БССР у 1920-я гг. было 40 польскіх сельскіх саветаў і існаваў нацыянальны польскі раён з цэнтрам ў Дзяржынску (Койданава).

Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР колькасць палякаў была штучна зменшана ў выніку савецкіх рэпрэсій (арышты, дэпартацыя былых памешчыкаў, асаднікаў, афіцэраў, паліцэйскіх, інтэлігенцыі ў Сібір), аднак і ў пасляваенны час у заходніх раёнах заставалася высокай. Пад час нацысцкай акупацыі і ў пасляваеннае дзесяцігоддзе ў заходніх раёнах Беларусі актыўна дзейнічала польскае падполле і партызанскія атрады Арміі Краёвай, якія абапіраліся на мясцовае польскае насельніцтва і каталіцкі касцёл. Пасля вызначэння беларуска-польскай мяжы ў 1945 г. адбыўся абмен насельніцтвам паміж Польскай рэспублікай і БССР, у выніку чаго з Беларусі выехала звыш 100 тыс. чал.

**Татары.** Татары пачалі сяліцца на тэрыторыі Беларусі ў XIV ст. Гэта былі ваеннапалонныя і прынятыя ў ВКЛ уцекачы з Залатой Арды. Актыўна рассяляў татар на тэрыторыі ВКЛ, пераважна ў заходніх раёнах Беларусі, князь Вітаўт. Дзеці хана Тахтамыша Джэлаладзін і Багардзін з войскам удзельнічалі ў Грунвальдскай бітве. У ВКЛ татары мелі спецыфічнае становішча: неслі вайсковую службу, займаліся конегадоўляй, агародніцтвам. Пры пераходзе ў хрысціянства татары-вайскоўцы атрымлівалі правы шляхты. Доўгі час татары захоўвалі сваю самабытнасць, свабодна спавядалі іслам. Да XVIII ст. яны ўжо карысталіся ў паўсядзённым жыцці беларускай мовай, што вымусіла пісаць свае рэлігійныя тэксты па-беларуску, але арабскімі літарамі. Такія кнігі атрымалі назву “Кітабы”.

У наш час татарскае насельніцтва кампактна пражывае ў заходніх рэгіёнах Беларусі, больш усяго ў г. Іўе Гродзенскай вобласці. У 1990-я гг. было створана звыш 20 татарска-мусульманскіх абшчын. Ёсць татарскія мячэці ў Іўе, Смілавічах, Навагрудку. У лістападзе 2016 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё адноўленай Мінскай саборнай мячэці, узарванай у 1960-я гг. Дзейнічаюць татарскія культурна-асветніцкія арганізацыі, напрыклад, Беларускае згуртаванне татараў-мусульман “Аль-Кітаб”.

**Яўрэі.** Яўрэі селяцца на тэрыторыі Беларусі ў XIV стагоддзя. Першыя яўрэйскія абшчыны ўзніклі ў Брэсце і Гродна. Вялікія князі Літоўскія заклікалі яўрэяў у ВКЛ для актывізацыі гандлю і рамёстваў. Рэлігійная талерантнасць у ВКЛ стымулявала многіх яўрэяў пераязжаць сюды з краін Заходняй Еўропы, дзе яны падвяргаліся дыскрымінацыі.

Яўрэі жылі адасоблена сваімі абшчынамі-кагаламі ў асобных кварталах (гета), мелі самакіраванне, ўласную сістэму адукацыі. Законы ВКЛ гарантавалі яўрэям недатыкальнасць асобы, капіталу. Традыцыйнымі заняткамі яўрэяў былі гандаль, рамёствы, ліхвярства, яны кантралявалі сістэму грамадскага харчавання (трымалі шматлікія корчмы). У XVIII ст. у

перыяд сацыяльна-эканамічнага і палітычнага крызісу Рэчы Паспалітай часта выступалі як арандатары маёнткаў магнатаў і шляхты, што прыводзіла да павелічэння феадальнага прыгнёту беларускіх сялян. Крычаўскае паўстанне пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы (1740 – 1744 гг.) было справакавана дзейнасцю арандатараў братоў Іцкавічаў.

Пасля загада расійскай імператрыцы Кацярыны II аб увядзенні мяжы яўрэйскай аселасці ў 1794 г. былі вызначаны тэрыторыі (Беларусь, Літва, частка Украіны), на якіх мелі права пражываць яўрэі. Ім забаранялася перасяляцца ў расійскія губерні, жыць у сельскай мясцовасці. У выніку, яўрэйскае насельніцтва было прымусова сканцэтравана ў гарадах і мястэчках, многія з якіх ў Беларусі на працягу XIX ст. набылі выразна яўрэйскі характар. Яўрэі пачалі дамінаваць у гандлі, рамёствах, прамысловасці, пераважалі сярод буржуазіі, якая пачала фарміравацца пасля буржуазных рэформ 1860 – 70-х гг. Па выніках перапісу насельніцтва 1897 г. у Беларусі налічвалася 724 548 яўрэяў (13,6 % усяго насельніцтва). У Мінску яўрэі складалі 52 % насельніцтва, Віцебску – 52,4 %, Магілёве – 50 %, Пінску – 74,2 %, Бабруйску – 60,5 %, Гомелі – 54,8 %.

У Расійскай імперыі яўрэі падвяргаліся дыскрымінацыі (адбываліся чарнасоценныя пагромы, існавалі асобыя налогі, меліся абмежаванні на атрыманне вышэйшай адукацыі, заняцце пасад і г.д.), таму многія з іх актыўна ўдзельнічалі ў рэвалюцыйнай барацьбе (БУНД, РСДРП) і падтрымалі савецкую ўладу. У канцы XIX ст. сярод беларскіх яўрэяў пачаўся сіяніскі рух (перасяленне ў Палестыну). Пад час нацысцкай акупацыі Беларусі яўрэйскае насельніцтва масава знішчалася немцамі. Ахвярамі Халакосту сталі звыш 500 тыс. беларускіх яўрэяў. У 1980 – 1990-я гг. адбывалася масавая рэпатрыяцыя яўрэяў у Ізраіль.

Уклад у беларускую і сусветную культуру ўнеслі мастакі-яўрэі Марк Шагал, Казімір Малевіч, Юдэль Пэн, скульптар Заір Азгур, архітэктар Іосіф Лангбард. Ураджэнцамі Беларусі з'яўляліся першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман (м. Моталь Пінскага павета), прэзідэнты Ізраіля Залман Шазар (м. Мір), Шымон Перэс (м. Вішнева Валожынскага павета), пісьменнік-фантаст Айзек Азімаў (в. Пятровічы на Магілёўшчыне), заснавальнік кінакампаніі "Метро Голдвін Маер" Луіс Барт Маер (Лазар Меір, нар. у Мінску).

**Украінцы –** нацыянальная меншасць, якая налічвае 158,7 тыс. асоб (1,7 %) ад агульнай колькасці насельніцтва краіны. Украінцаў падзяляюць на аўтахтонных (карэннае насельніцтва) і мігрантаў. Аўтахтонныя ўкраінцы жывуць, галоўным чынам, на Брэстшчыне і Гомельшчыне. Тэрытарыяльна, болей за ўсё ўкраінцаў жыве на Брэстшчыне (40 тыс. асоб, альбо 2,9 % ад усяго насельніцтва вобласці). Найбольшая канцэнтрацыя ўкраінцаў — у паўднёва-заходняй частцы вобласці (Маларыцкі раён і інш.).

**Цыганы.** У ВКЛ цыганы з'явіліся ў XV стагоддзі. Яны былі вядомы як добрыя каняводы, вандроўныя музыкі, знахары, варажбіты, дрэсіроўшчыкі звяроў. Вандроўны лад жыцця выклікаў канфлікты цыганоў з грамадствам і ўладамі еўрапейскіх краін. У ВКЛ рабіліся намаганні прымусіць іх да аселага ладу жыцця. Нават, пастанова сойма 1586 г. патрабавала выгнання з краіны

вандроўных цыганоў. Тым не менш, вандроўны лад жыцця захоўваўся, пры сялянскіх абшчынах яны жылі перыядычна. Цыганы спавядалі рэлігію мясцовага насельніцтва, сяліліся пераважна на ўскраінах мястэчак і гарадоў, дзе былі спрыяльныя ўмовы для заняцца промысламі. Цыганы ўтваралі свае абшчыны, выбіралі старэйшын – баронаў ці каралёў. Найбольш вядомая абшчына існавала ў Міры. Намаганні надаць цыганам аселы лад жыцця рабіла і савецкая ўлада. Так, у 1927 г. у Віцебскім раёне быў створаны першы цыганскі калгас “Новае жыццё”, аналагічны калгас існаваў у Жлобінскім раёне. У 1959 г. за вандроўны лад жыцця была ўведзена юрыдычная адказнасць, у выніку цыганы перайшлі да аселасці, але працягваюць сяліцца кампактнымі асяродкамі на ўскраінах гарадоў (Паўночны пасёлак ў Мінску, Калодзішчы). На сённяшні час у Беларусі жыве звыш 10 тыс. цыганоў.

**Літоўцы, латышы.** У другой палове XIX ст. адбывалася міграцыя латышоў і літоўцаў ва ўсходнія раёны Беларусі, дзе яны стваралі хутарскія гаспадаркі. У гады рэвалюцыйных і ваенных падзей 1917 – 1920 гг. латышы – “чырвоныя стралкі” – актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі савецкай улады ў Беларусі.

**Літоўская меншасць у Беларусі** афіцыйна налічвае 5087 прадстаўнікоў і складае дзявятую па колькасці нацыянальную меншасць у краіне. Толькі 1597 з іх (31,4 %) ў якасці роднай мовы ўважае выключна літоўскую мову; большасць — 1 999 (39,3 %) — падала рускую мову. Пераважная большасць літоўцаў пражывае ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці.

**Шатландцы.** У XVII ст. на тэрыторыі Беларусі з’явіліся шатландцы. Рэлігійны прыгнёт каталіцкай дынастыі Сцюартаў вымушай многіх шатландскіх пратэстантаў (прэсвітэрыян) эміграваць у іншыя краіны Еўропы, у тым ліку ў Вялікае княста Літоўскае, дзе магнаты Радзівілы спавядалі кальвінізм. Шатландцы (шоты, як іх называлі у ВКЛ) выступалі як дробныя гандляры і ваяры-наёмнікі. Дробныя купцы-карабейнікі хадзілі па вёсках, ствараючы моцную канкурэнцыю мясцовым гандлярам. Сейм Рэчы Паспалітай спрабаваў абмежаваць канкурэнцыю шатландцаў. Шэраг тавараў карабейнікаў нават абазначаўся ў справаводстве таго часу тэрмінам “рэчы шоцкія”. Шатландскія эмігранты прывезлі з сабой вялікую колькасць медных шатландскіх манет (двайныя пені ці торнеры з выявай сімвала Шатландыі чартапалоху), якія былі прыняты на мясцовым рынку і сталі першай меднай манетай у грашовым абарачэнні на тэрыторыі Беларусі. Пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гг. адзін з шатландскіх наёмнікаў Георг Лермонт трапіў у палон да расійскіх войскаў у крэпасці Белая; ад яго вёў свой радавод расійскі паэт Міхаіл Лермантаў. З цягам часу шатландцы асіміляваліся сярод карэннага насельніцтва.

**Кітайцы** пачынаюць сяліцца на тэрыторыі Беларусі пасля Першай сусветнай вайны і Кастрычніцкай рэвалюцыі. У міжваенны перыяд на Віцебшчыне існавала Кітайская камуна, кітайскія рабочыя працавалі ў гарадах Усходняй Беларусі. Пад час нацысцкай акупацыі ў Віцебску

дзейнічала шэраг кітайскіх гандляроў, якія манапалізавалі гандаль кандытарскімі вырабамі на рынках, існавала кітайская пральня.

**Іншыя этнасы.** Вынікам міграцыйных працэсаў у СССР у пасляваенныя дзесяцігоддзі (перамяшчэнне кадраў з рэспублікі ў рэспубліку, змешаныя шлюбы) стала наяўнасць у Беларусі прадстаўнікоў звыш 100 нацыянальнасцяў. Суіснаванне на працягу шматлікіх стагоддзяў тытульнай нацыі побач з прадстаўнікамі іншых этнасаў выпрацавала такую рысу нацыянальнага менталітэту беларусаў як талерантнасць. На нашай зямлі не адбывалася вострых міжэтнічных канфліктаў. Этнічныя меншасці аказалі ўплыў на культуру карэннай нацыі ў кулінарыі, лексіцы, музычнай культуры і інш.

## 3.3. Беларуская культура ў сусветным кантэксце

### 3.3.1. Беларускае замежжа

Пад тэрмінам **"беларускае замежжа"** маюцца на ўвазе наступныя катэгорыі асобаў беларускага паходжання альбо нацыянальнасці, якія пастаянна законна пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь:

– грамадзяне Рэспублікі Беларусь;

– грамадзяне замежных краін альбо асобы без грамадзянства, якія нарадзіліся на тэрыторыі БССР ці Рэспублікі Беларусь, з'яўляліся грамадзянамі былога СССР альбо Рэспублікі Беларусь;

– асобы, якія нарадзіліся на тэрыторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь да 1 студзеня 1919 г.;

– асобы, якія ніколі не пакідалі беларускай тэрыторыі, але з-за геапалітычных працэсаў у перыяд з 1918 па 1948 гг. апынуліся па-за межамі сучаснай тэрыторыі Рэспублікі Беларусь;

– асобы, якія лічаць сябе беларусамі, незалежна ад месца нараджэння і пражывання.

**З гэтым паняццем цесна звязаны наступныя тэрміны: «дыяспара», «эміграцыя», «іміграцыя», «рээміграцыя», «рэпатрыяцыя».**

**Дыяспара** — сталае, доўгатэрміновае ці часовае пражыванне значнай часткі народа (этнічнай супольнасці) па-за дзяржавай (гістарычнай тэрыторыяй) свайго паходжання. Фарміравалася ў выніку **эміграцыі** — выезду грамадзян са сваёй Бацькаўшчыны ў іншыя краіны на пастаяннае або доўгае пражыванне па палітычных, рэлігійных, эканамічных, этнічных ці іншых прычынах, а таксама ў выпадку сацыяльных (войны, рэвалюцыі) або прыродных катаклізмаў.

У пач. 1990-х г. за межамі Рэспублікі Беларусь пражывала 3—3,5 млн. беларусаў. Найбуйнейшыя і найбольш арганізаваныя беларускія дыяспары пражываюць у Расіі, Украіне, ЗША, Канадзе, Вялікабрытаніі, краінах Балтыі. Існуе тэндэнцыя да скарачэння колькасці людзей, якія ідэнтыфікуюць сябе як беларусы паводле афіцыйных перапісаў.

**Іміграцыя** (ад лац.: *immigrare* – усяляцца) — уезд іншаземцаў у якую-небудзь краіну на пастаяннае або працяглае жыхарства. У залежнасці ад прычын іміграцыю падзяляюць на *палітычную* і *эканамічную*, або *працоўную*. Іміграцыя характэрная для многіх гістарычных эпох, адыгрывала важную ролю ў фармаванні насельніцтва некаторых краін і нават засяленні асобных частак свету.

**Рээміграцыя** – вяртанне эмігранта ў краіну ранейшага пражывання.

**Рэпатрыяцыя** – вяртанне на радзіму бежанцаў, ваеннапалонных з краіны, у якой яны апынуліся прымусова.

Вызначаюцца наступныя этапы эміграцыі з Беларусі:

***Ранняя эміграцыя з беларускіх зямель.*** На працягу стагоддзяў Беларусь была крыніцай міграцыі насельніцтва ў суседнія краіны. Гэты працэс прасочваецца ўжо з часоў ВКЛ, калі назіраліся досыць значныя перасяленні беларусаў на чале з князямі і баярамі Вялікага княства Літоўскага на ўсход, у Маскоўскую дзяржаву. Прычынай былі дынастычныя або палітычныя сваркі, разлады паміж прадстаўнікамі найбуйнейшых княскіх дынастый — Рурыкавічаў і Гедымінавічаў (напрыклад, бунт Міхаіла Глінскага).

Колькасць бежанцаў на Ўсход павялічылася з распаўсюджваннем у Беларусі каталіцызму і прыняццем Брэсцкая царкоўнай уніі. Міжканфесіянальныя непаразуменні былі сур'ёзным аргументам для эміграцыі. У сувязі з гэтым у XVI – XVII стст. Беларусь пакінулі некалькі тысяч праваслаўных.

Маскоўская дзяржава на працягу некалькіх стагоддзяў пасля свайго ўзнікнення была вельмі зацікаўлена ў прытоку новага насельніцтва для засялення неабсяжных прастораў на Усходзе. Падчас войнаў з Вялікім княствам Літоўскім рускія ваяводы прымусова вывозілі жыхароў у Масковію на сталае жыхарства. Дзесяткі тысяч жыхароў сучаснай Беларусі захапіў у палон цар Іван Грозны пад час Лівонскай вайны. Калі ваяводы цара Аляксея Міхайлавіча ў 1654–1667 гг. акупавалі большую частку Беларусі, сотні тысяч беларускіх сялян аддавалі ў прыгон рускім памешчыкам, а мяшчан, рамеснікаў сялілі ў расійскіх гарадах дзеля ўздыму мясцовай эканомікі. Нашчадкі гэтых прымусовых мігрантаў у большасці асіміляваліся сярод мясцовага насельніцтва і рэдка хто з іх памятае пра свае беларускія карані.

Але не толькі на Ўсход мігрыравалі нашы продкі. Пасля таго, як вялікія князі Альгерд і Вітаўт вызвалілі Украіну з-пад татарскай няволі і далучылі яе землі да ВКЛ, пачалося паступовае засяленне ўкраінскіх стэпаў. Незадаволеныя сваім лёсам ішлі пешшу альбо плылі на чоўнах і плытах у нізоўе Дняпра, у Запарожскую Сеч, уліваліся ў казацкую вольніцу. Аб шырокай распаўсюджанасці вандровак «у казакі» сведчыць старадаўні беларускі фальклор, дзе казацкія матывы і сюжэты сустракаюцца даволі часта.

Эліта ж часцяком накіроўвалася на Захад, у Польшчу. Пасля Люблінскай уніі (1569 г.) працэс апалячвання ліцвінскай-беларускай шляхты набыў шырокія памеры. Магнаты Агінскія, Вішнявецкія, Радзівілы, Патоцкія

і іншыя прадстаўнікі ВКЛ неўзабаве стварылі найбольш уплывовыя кланы ў Рэчы Паспалітай. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай большасць з іх не захацела паддавацца русіфікацыі і абвясціла сябе палякамі. Тое ж учыніла і частка шляхты, але ў адрозненне ад магнатаў шляхта не выехала ў Польшчу, а засталася ў Беларусі і ўтварыла тут польскую нацыянальную меншасць.

***Палітычная эміграцыя з тэрыторыі Беларусіў канцы XVIII – пачатку XX ст.*** Гісторыю беларускай палітычнай эміграцыі можна пачаць з канца XVIII ст. пасля паўстанняў Т. Касцюшкі, 1830 – 1831 г., 1863 – 1964 гг., у якіх актыўны ўдзел бралі беларуская шляхта і інтэлегенцыя. Пасля паражэння гэтых паўстанняў значная частка іх удзельнікаў пакінула межы Расійскай імперыі. Сярод іх былі лепшыя сыны беларускага народа — М. Агінскі, А. Кастравіцкі, І. Дамейка, К. Ельскі, Б. Дыбоўскі, якія пазней сталі сусветна вядомымі музыкантамі, пісьменнікамі, навукоўцамі. Такім чынам вырываліся з асяроддзя беларускага народа інтэлегентныя, таленавітыя і патрыятычныя сілы, збядняліся творчыя магчымасці нацыі на Бацькаўшчыне.

Захаваліся звесткі аб гвалтоўнай палітычнай эміграцыі (ці міграцыі, бо дзяржава была адна — Расія) тых часоў на ўсход. Дзесяткі тысяч беларусаў, удзельнікаў антырасійскіх паўстанняў, былі сасланы тады на катаргу і пасяленне. Пасля падаўлення паўстання 1863 – 1864 гг. было адпраўлена на катаргу 853, у арыштанцкія роты 767, выслана за межы Беларусі 12 тыс., у тым ліку ў Сібір — 504 чал.

***Беларуская працоўная міграцыя ў канцы XIX ст. – п. XX ст.*** Першая хваля масавай працоўнай эміграцыі беларускага насельніцтва ў іншаэтнічныя рэгіёны Расійскай імперыі (усходняя) і за яе межы (заходняя) пракацілася на рубяжы XIX і XX стст. Яна ўзмацніла працэс фарміравання беларускай дыяспары за межамі Бацькаўшчыны.

Як сталая з'ява, працэс эміграцыі пачаўся з 1880-х гг., а масавасць набыў пасля рэвалюцыі 1905—1907 гг. і тых змен у грамадскім і сацыяльна-эканамічным развіцці, якія яна выклікала. Паскарэнне развіцця капіталістычных адносін, расслаенне і абеззямельванне сялянства, аграрная перанаселенасць, збядненне дробных вытворцаў абумовілі масавы выезд сялян у іншыя рэгіёны Расійскай імперыі ў пошуках вольнай або больш таннай зямлі. У 1896—1912 гг. з беларускіх губерняў у Сібір перасялілася каля 700—800 тыс. чал.

Па розных крыніцах, да Першай сусветнай вайны з Беларусі вехала ад 100 тыс. да 1 млн. чал., прычым значная частка іх вярнулася дамоў. Большасць даследчыкаў схіляюцца да лічбы ў 500—600 тыс. эмігрантаў.

***Першая сусветная вайна (1914 – 1918 гг.), Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі 1917 г., германская і польская акупацыі Беларусі.*** Падзеі Першай сусветнай вайны выклікалі значны адток беларускага насельніцтва ва ўсходнія раёны Расіі, абумовілі новую хвалю вымушаных выездаў у замежныя краіны. Са жніўня 1914 г. да вясны 1915 г. каля 318 тыс. жыхароў беларускіх губерняў трапілі ў палон або пра іх не было звестак. 3 акупіраванай тэрыторыі на работу ў Германію вывозіліся рабочыя і сяляне, а таксама ваеннапалонныя. У 1915 г. пры адступленні

рускай арміі праводзілася тактыка “выпаленай зямлі”, гвалтоўная эвакуацыя насельніцтва. Паводле акадэміка У. М. Ігнатоўскага, каля 2 млн. беларусаў добраахвотна ці прымусова перасяліліся ў цэнтральныя і ўсходнія рэгіёны Расіі (Калужская, Маскоўская, Пензенская, Разанская, Самарская, Тамбоўская, Тульская, Пскоўская, Петраградская і інш. губерні). Паводле даследаванняў беларускіх дэмографаў, 246 тыс. бежанцаў і эвакуіраваных не вярнуліся ў родныя мясціны, яшчэ 122 тыс. чал. выехалі за мяжу. Яны шукалі паратунку ад ваеннага ліхалецця ў Літве, Латвіі, Эстоніі, Чэхаславакіі, Фінляндыі, Турцыі, Германіі. Акрамя таго, у Германіі ў пач. 1919 г. знаходзілася 30—40 тыс. беларусаў-ваеннапалонных.

Самая масавая хваля палітычнай эміграцыі назіралася ў часы Кастрычніцкай рэвалюцыі і ваенных падзей 1918 – 1920 гг. Пэўную частку гэтай хвалі склала беларуская нацыянальная інтэлігенцыя, перш за ўсё, кіраўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі, якое вымушана было пакінуць Беларусь у 1919 г. Сярод іх П. Крачэўскі, А. Цвікевіч, Я. Варонка, В. Захарка, В. Ластоўкі, С. Некрашэвіч, А. Смоліч і іншыя. Яны выехалі на Захад — у Берлін, Прагу, а пазней многія з іх апынуліся ў ЗША. Разам з тым, трэба адзначыць, што пасля амністыі 1923 г. некаторыя з іх вярнуліся ў БССР, дзе ў 1930-я гг. сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій. Большасць жа засталася ў замежжы і працягвала там нацыянальна-культурную і палітычную дзейнасць. Рада і ўрад БНР знаходзіліся спачатку ў Коўна, потым — у Празе. Там дзейнічалі беларускія палітычныя партыі, маладзёжныя гурткі, працавалі паэты Уладзімір Жылка і Ларыса Геніюш, выдатны оперны спявак М. Забэйда-Суміцкі.

***Міжваенны перыяд (20-я – 30-я гг. XX ст.).*** У міжваенны перыяд асаблівасці ўнутранай і знешняй беларускай міграцыі, яе характар і памеры, стан нацыянальнай самасвядомасці ў многім вызначыла афіцыйнай палітыка савецкай улады. Яна абумовіла першую арганізаваную палітычную эміграцыю, ядро якой склалі ўрад і вайсковыя фарміраванні Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), кіраўніцтва партыі беларускіх эсэраў і інш. Гэта выклікала новую з'яву ў сацыяльным складзе эміграцыі — пэўную прысутнасць інтэлігенцыі. Другая плынь міжваеннай эміграцыі — працоўная, сялянская — звязана з выездам у Амерыку і Еўропу часткі насельніцтва Заходняй Беларусі. У пошуках працы і лепшых умоў жыцця з 1924 г. пачалася масавая эміграцыя. Яна абумоўлена шэрагам эканамічных, сацыяльных і палітычных абставін, у якіх апынуліся беларусы паводле ўмоў Рыжскага мірнага дагавора (1921 г.) паміж Савецкай Расіяй, Украінай і Польшчай. Нягледзячы на розныя меркаванні адносна колькасці эмігрантаў з Заходняй Беларусі, большасць айчынных і польскіх даследчыкаў схіляюцца да 180—250 тыс. чал.

У большасці сваёй эміграцыя была сялянскай і мела эканамічны характар. У невялікай колькасці эмігрыравалі інтэлігенцыя і ўдзельнікі рэвалюцыйнага руху — члены Беларускай сялянска-работніцкай грамады і КПЗБ, якія праследаваліся польскімі ўладамі.

Паміж рознымі палітычнымі плынямі беларускай эміграцыі існавалі разыходжанні па пытаннях барацьбы за незалежную дэмакратычную Беларусь, арыентацыі на тую ці іншую дзяржаву (Літву, Польшчу, краіны Антанты), адносін да Савецкай Беларусі. Палітыка савецкай улады і кіраўніцтва БССР у дачыненні да заходняй дыяспары вызначалася найперш ідэалагічнымі, палітычнымі матывамі — у першыя гады арыентаванасцю на сусветную рэвалюцыю, потым — на пашырэнне камуністычных ідэй, лаяльнасць да “сацыялістычнага”, савецкага ладу.

Адносна палітычнай эміграцыі вызначаліся меры па пашырэнні ў яе асяроддзі савецкага ўплыву, прыцягненні да супрацоўніцтва асобных груп і лідараў. Ставілася задача “працягваць работу па разлажэнню і драбленню беларускай эміграцыі, ні ў якім разе не дапускаць стварэння якіх бы там ні было беларускіх аб'яднанняў”, бо гэта, на думку афіцыйных улад, затармозіць развіццё беларускага руху савецкай арыентацыі.

Найбольш істотна на пазіцыі тагачаснай беларускай палітычнай эміграцыі паўплывалі працэсы беларусізацыі, поспехі ў адраджэнні нацыянальнай культуры, ажыццяўленні палітыкі НЭПа, 1-е ўзбуйненне БССР (1924 г.). Станоўчую ролю адыграла і прынятае ў ліпені 1923 г. рашэнне Прэзідыумаў ЦВК СССР і БССР аб амністыі, якая пашыралася на сялян і “выхадцаў з працоўнага асяроддзя” — удзельнікаў антысавецкіх фарміраванняў у 1918 – 1920 гг., а таксама на беларускіх палітычных і культурных дзеячаў, членаў урада БНР, розных палітычных партый. З улікам гэтых абставін некаторыя замежныя лідары палічылі савецкую ўладу здольнай ажыццявіць нацыянальна-культурнае адраджэнне і аб'яднанне Беларусі, пайшлі на кантакты з кіраўніцтвам БССР і КП(б)Б, якое згаджалася на супрацоўніцтва толькі пры ўмове ліквідацыі ўрада на эміграцыі. Частка яго членаў на чале з А. Цвікевічам пачала перамовы з адпаведнымі органамі Савецкай Беларусі пра роспуск урада БНР. ЦК КП(б)Б у пастанове ад 14.8.1925 г. прызнаў неабходным з гэтай мэтай правядзенне канферэнцыі ў Берліне пры выкананні шэрагу ўмоў: яшчэ да канферэнцыі перадача паўнамоцтваў БНР ураду БССР у форме дэкларацыі; прызнанне Мінска адзіным культурным і палітычным цэнтрам, на які павінен арыентавацца беларускі рух за мяжой; адмова ад арыентацыі на Лігу Нацый і інш. На канферэнцыі 15.10.1925 г. адна частка членаў урада БНР прыняла ўсе гэтыя ўмовы, другая палічыла іх “здрадай незалежнасці Беларусі” і працягвала дзейнасць за мяжой. Рада БНР працягвае сваю дзейнасць і сёння, пасля Другой сусветнай вайны яе лідэры перасяліліся ў ЗША. Раскол стаў адной з многіх прычын затухання дзейнасці беларускай эміграцыі, якая ў далейшым не змагла пераадолець рознагалоссі і супярэчнасці паміж рознымі плынямі.

У 1930-я гг. выезд з Савецкай Беларусі за мяжу быў практычна спынены, імкненне стала жыць у іншай дзяржаве ўспрымалася як варожасць да савецкай улады. Затое дзяржаўная палітыка садзейнічала рассяленню беларусаў па абшарах Савецкага Саюза. У 1926 – 1938 гг. з БССР, насельніцтва якой складала каля 5 млн. чал., у іншыя рэгіёны СССР выехала (дабраахотна ці прымусова) 617 тыс. (пераважна жыхары сельскай

мясцовасці). Гэта было вынікам планавага набору рабочай сілы ў аддаленыя і цяжкія для жыцця і працы рэгіёны, уцёкамі сялян у ходзе калектывізацыі, дэпартацыяй і палітычнымі рэспрэсіямі.

***Другая сусветная вайна***, у час якой тэрыторыя Беларусі стала арэнай жорсткіх баёў і працяглай акупацыі, абумовіла трэцюю масавую хвалю ўнутранай і знешняй міграцыі. На акупіраваных немцамі тэрыторыях апынуліся сталыя беларускія асяродкі з арганізаваным нацыянальным жыццём. Захоп Германіяй Польшчы і ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР выклікалі выезд на захад палітычных дзеячаў, якія не мелі даверу да палітыкі савецкай улады.

Перад вайной і ў яе пачатку павялічылася зацікаўленасць германскіх улад да беларускага пытання, рабіліся захады для выкарыстання ў сваіх мэтах рознагалоссяў, асабістых амбіцый, барацьбы за лідарства сярод беларускіх эмігрантаў, уцягвання іх у сферу ўплыву германскай палітыкі. У лістападзе 1939 г. пры Міністэрстве ўнутраных спраў створана Беларускае прадстаўніцтва ў Берліне. Арганізацыю матэрыяльнай падтрымкі і культурна-асветнай працы ажыццяўлялі і грамадскія арганізацыі Беларускага камітэта самапомачы (створаны летам 1940 г. у Берліне) і Беларускага камітэта (дзейнічаў са студзеня 1940 г. у Варшаве).

Ва ўмовах вайны выявілася палітычнае размежаванне эміграцыі, існаванне дзвюх арыентацый. Лідары створанай летам 1940 г. у Варшаве Партыі беларускіх нацыяналістаў наадварот, арыентаваліся на заходніх саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі.

У ліку савецкіх ваеннапалонных за мяжой апынуліся сотні тысяч беларусаў. Паводле афіцыйных даных, амаль 400 тыс. жыхароў рэспублікі былі вывезены акупантамі на працу ў Германію.

***Пасляваенны час.*** Нягледзячы на прымусовы характар рэпатрыяцыі, якога Савецкі Саюз дамагаўся да сярэдзіны 1950-х гг. ад саюзнікаў і міжнародных арганізацый, сотні тысяч беларусаў апынуліся на эміграцыі. Шукаць лепшай долі на чужыне многіх падштурхнула палітыка савецкай улады перад Другой сусветнай вайной, а таксама адносіны да ваеннапалонных, якія лічыліся здраднікамі. Рэпатрыянты-афіцэры, за рэдкім выключэннем, пасля фільтрацыйных лагераў траплялі ў сістэму ГУЛАГ або на спецпасяленне.

Пасля вайны на Захадзе склалася самая вялікая ў гісторыі беларуская эміграцыі палітычная плынь.

Працэс набыцця незалежнасці Рэспублікі Беларусь і распад савецкай палітычнай сістэмы выклікалі пачатак працэсу супрацоўніцтва паміж беларускай дзяржавай і беларускімі арганізацыямі за мяжой.

Прыняцце Дзяржаўнай праграмы “Беларусы ў свеце”, зацверджанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 31 мая 1993 г., дэманстравала гатоўнасць у пачатку 1990-х гг. у рамках міжнародна-прававых норм абараняць правы і інтарэсы сваіх суайчыннікаў, імкненне ўзмацніць сацыяльна-культурны кантакт з імі. Праграмай прадугледжвалася:

1. Садзейнічанне забеспячэнню нацыянальна-культурных патрэб замежных суайчыннікаў, асабліва патрэб, звязаных з захаваннем роднай мовы і нацыянальных традыцый: забяспечваць мастацкай, інфармацыйна-навуковай літаратурай, падручнікамі, дапаможнікаміііншымі сродкамі навучання беларускія школы і аматарскія калектывы, у тым ліку і калектывы мастацкай самадзейнасці.

2. Прымаць па рэкамендацыях кіраўніцтва беларускіх суполак з іншых краін маладых суайчыннікаў на вучобу ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Беларусі з выдзяленнем для іх пэўнай колькасці дзяржаўных стыпендый, забяспечваць стыпендыямі студэнтаў-грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія паступілі на вучобу ў іншыя краіны.

3. Сумесна з прадстаўнікамі беларускай дыяспары рэгулярна арганізоўваць навукова-практычныя курсы, семінары і творчыя нарады для настаўнікаў беларускай мовы, літаратуры і гісторыі з замежжа, а таксама аказваць замежным беларускім суполкам дапамогу ў падрыхтоўцы кіраўнікоў самадзейных калектываў.

4 Арганізоўваць курсы павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, а таксама гісторыі культуры Беларусі з замежжа ў інстытутах удасканалення кваліфікацыі настаўнікаў Рэспублікі Беларусь.

5. Накіроўваць высокакваліфікаваных выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў і навуковых супрацоўнікаў для чытання лекцый перш за ўсё па беларускай культуры, беларускай мове, літаратуры і гісторыі, для прадстаўнікоў беларускай дыяспары, (на аснове прамых сувязей паміж навучальныміі навуковымі ўстановамі Рэспублікі Беларусь і іх замежнымі партнёрамі).

6. Рэгулярна праводзіць сустрэчы дзеячаў навукі і культуры Рэспублікі Беларусь з прадстаўнікамі беларускага замежжа, у прыватнасці, з'езды беларусаў, Дні Рэспублікі Беларусь у замежных краінах, навуковыя канферэнцыі і інш.

7. Стварыць для знаёмства прадстаўнікоў беларускай дыяспары з гісторыяй, культурай Беларусі спецыяльныя турысцкія маршруты з наведваннем выдатных гістарычных і культурных мясцін Радзімы.

8. Праводзіць за мяжой выстаўкі прафесійнага і самадзейнага мастацтва, групавыя і персанальныя выстаўкі членаў Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь, народных промыслаў і рамёстваў, дзіцячага малюнка, навукова-тэхнічнай творчасці моладзі, а таксама гастролі лепшых дзіцячых і дарослых калектываў мастацкай самадзейнасці, прафесійных танцавальных, эстрадных, тэатральных ііншых калектываў.

9. Штогод арганізоўваць сумесны летні адпачынак для дзяцей беларускага замежжа і лепшых дзіцячых мастацкіх калектываў пазашкольных устаноў Рэспублікі Беларусь на базе дзіцячага лагера “Зубраня”.

10. Прадугледзець магчымасць атрымання нашымі суайчыннікамі за мяжой беларускіх кніжных і перыядычных выданняў, а таксама выданне

часопіса “Беларусь” на некалькіх замежных мовах (для тых суайчыннікаў, якія пакуль не валодаюць беларускай мовай).

11. Забяспечваць усебаковую падтрымку перыядычным выданням беларускіх суполак за мяжой, а таксама існуючым сродкам масавай інфармацыі, якія працуюць на патрэбы беларускай дыяспары, асабліва ў блізкім замежжы.

12. Азнаямленне грамадскасці Беларусі з культурна-мастацкай спадчынай яе суайчыннікаў за мяжой: выданне ў рэспубліцы мастацкіх і навуковых твораў прадстаўнікоў беларускага замежжа, энцыклапедычнага даведніка "Беларусь у свеце".

13. Вывучэнне культурнай спадчыны беларускай дыяспары, стварэнне банка інфармацыі пра беларускія выданні, мастацкія творы і іншыя матэрыялы, што знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

14. Увесці ў практыку сумесныя навукова-тэхнічныя даследаванні ў галіне эканомікі, навукі і культуры. Практыкаваць узаемныя абмены вучонымі як на кароткі, так і на працяглы тэрмін.

15. Заахвочваць удзел суайчыннікаў-бізнесменаў у распрацоўцы і рэалізацыі на ўзаемнавыгадных умовах эканамічных праграм, спрыяць больш актыўнаму ажыццяўленню інвестыцый у эканоміку Беларусі з боку суайчыннікаў-прадпрымальнікаў.

Дзяржаўная палітыка ў галіне адносін з беларусамі замежжа накіравана на: захаванне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці беларусаў замежжа; аказанне садзейнічання беларусам замежжа ў рэалізацыі імі нацыянальных, культурных і іншых правоў з улікам агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага заканадаўства; выпрацоўку дзейсных механізмаў падтрымкі беларусаў замежжа для задавальнення культурных, інфармацыйных, моўных і іншых патрэб беларусаў замежжа; умацаванне сувязей паміж беларусамі замежжа і Рэспублікай Беларусь; выкарыстанне патэнцыялу беларусаў замежжа для развіцця беларускай дзяржавы, у тым ліку для наладжвання featureрознабаковага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з замежнымі краінамі; садзейнічанне стварэнню ў Рэспубліцы Беларусь грамадскіх аб’яднанняў па сувязях з беларусамі замежжа; стварэнне спрыяльных умоў для беларусаў замежжа, якія прынялі рашэнне пераехаць у Рэспубліку Беларусь на часовае ці пастаяннае месца жыхарства.

Пашырэнню дыялога з беларускай дыяспарай , налажванню сувязей з беларусамі свету спрыяюць грамадскія арганізацыі Беларусі. Выключную ролю ў вырашэнні гэтых задач належыць грамадствам “Радзіма” і “Бацькаўшчына.”

Беларускае таварыства “Радзіма” (створана ў 1964 г.) – добраахвотная грамадская арганізацыя, якая падтрымлівае і пашырае культурныя сувязі з выхадцамі з Беларусі, якія жывуць за межамі былога СССР. Сярод заснавальнікаў былі Р. Шырма і М. Танк.

Асноўныя кірункі дзейнасці: культурныя і эканамічныя кантакты з аб’яднаннямі землякоў за мяжой і асобнымі суайчыннікамі, перасылка за мяжу літаратуры, падручнікаў, канафільмаў, фотавыставак і іншае,

арганізацыя курсаў па вывучэнні беларускай гісторыі, культуры і мовы, гуманітарнай дапамогі ад замежных суайчыннікаў жыхарам Беларусі, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай катастрофы 1986 г. і інш. Таварыства займаецца выданнем газеты “Голас Радзімы”.

Міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Згуртаванне беларусаў свету “Бацькаўшчына” дзейнічае з 1990 г., аб'ядноўвае арганізацыі беларускай дыяспары болей чым з 25 краін свету. Асноўныя мэты: адраджэнне Беларусі як суверэннай дзяржавы, краіны-маці для ўсіх беларусаў свету, кансалідацыя беларусаў як нацыі, роўнай сярод роўных у сусветнай супольнасці, выхаванне нацыянальнай свядомасці беларусаў, клопат пра духоўнае і фізічнае захаванне беларускай нацыі; спрыянне росту павагі беларусаў да сваёй гісторыі, культуры і мовы, любові да роднай зямлі; духоўнае, арганізацыйнае, эканамічнае яднанне ў адзіную супольнасць усіх беларусаў, што жывуць па-за межамі Беларусі і на Бацькаўшчыне, захаванне і паглыбленне іх беларускасці; умацаванне дружбы з іншымі народамі, узаемнай зацікаўленасці, пазнанне гісторыі, культуры краінаў, дзе жывуць беларусы, выхаванне павагі да людзей іншых нацыянальнасцяў, якія жывуць з беларусамі на іх Бацькаўшчыне.

Першым Прэзідэнтам ЗБС “Бацькаўшчына” ў 1990 быў абраны Васіль Быкаў, Старшынёй Рады — Яўген Лецка. ЗБС “Бацькаўшчына” аргнаізоўвае з'езды беларусаў свету раз на 4 гады, пачынаючы з 1993 г. Першы з'езд беларусаў свету адбыўся 8 – 10 ліпеня 1993 г. ў Мінску. Прэзідэнтам ЗБС “Бацькаўшчына” абраны акадэмік Радзім Гарэцкі, Старшынёй Рады — Ганна Сурмач.

На з’ездзе былі прыняты дэкларацыя аб прынцыпах нацыянальнага дзяржаўнага будаўніцтва, зварот да беларусаў замежжа, звароты да беларускага народа, да парламента і ўрада Рэспублікі Беларусь, рэзалюцыі ў падтрымку ЗБС “Бацькаўшчына”, пастанова аб Згуртаванні прадпрымальнікаў беларускай дыяспары, зварот аб устанаўленні мемарыяльнай дошкі на будынку, дзе была абвешчана БНР. З’езд выказаўся за тое, каб 25 сакавіка было абвешчана дзяржаўным святам у Беларусі.

Шосты з’езд адбыўся ў Мінску 25 ліпеня 2013 г. Першы дакумент, які быў зацверджаны агульным галасаваннем, тычыўся дачыненняў беларусаў замежжа з уладамі, найперш неабходнасці прыняць закон “Аб беларусах замежжа”. Пра яго неабходнасць гаварылася яшчэ на першым з’ездзе, але ён не быў прыняты. Адпаведна, не быў замацаваны юрыдычны статус “беларус замежжа”. У сваім звароце да дэпутатаў, ураду і кіраўніка дзяржавы ўдзельнікі з’езду падкрэслівалі, што не прынята дзяржаўная праграма “Беларусы ў свеце”, не створаны дзяржаўны камітэт па справах беларусаў замежжа, у парламенце няма камісіі па справах беларусаў замежжа, а ў Акадэміі навук навуковага цэнтра, які б вывучаў беларускую дыяспару. Усе дэлегаты з’езду пагадзіліся з рэзалюцыяй “Беларуская мова — галоўны фактар захавання беларускай нацыі”.

### 3.3.2. Уклад беларусаў у сусветную культуру

Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва (БІНіМ) у Нью-Ёрку — грамадская навукова-культурная арганізацыя беларускай эміграцыі ў ЗША. Заснаваны 16 снежня 1951 г., зарэгістраваны 13 жніўня 1953 г. як арганізацыя са штаб-кватэрай у г. Нью-Ёрк з правам дзейнасці на ўсёй тэрыторыі ЗША. Мае філіялы ў Германіі (Мюнхен, з 1955 г.) і Канадзе (Таронта, з 1967 г.). Друкаваны орган — навуковы штогоднік "Запісы". У 1954—1963 гг. выдаваў літаратурна-мастацкі часопіс "Конадні", у 1953—1969 гг. — інфармацыйны часопіс "Абежнік".

Інстытут падтрымлівае сувязі з многімі бібліятэкамі свету, асабліва з Публічнай бібліятэкай у Нью-Ёрку. З канца 1980-х гг. інстытут наладжвае кантакты з арганізацыямі Беларусі.

У розны час інстытут узначальвалі У. Тамашчык, Я. Ліманоўскі, В. Тумаш, А. Адамовіч, з 1982 — В. Кіпель.

Арганізацыя Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва ў ЗША ў 1951 г. была абумоўлена, па-першае, патрэбнасцю гуртаваць беларускія інтэлектуальныя кадры, а па-другое, знаёміць заходняе грамадства з нацыянальнаю Беларуссю, пра якую на Захадзе было амаль невядома: існаваў пагляд, што тагачасная БССР, член ААН, не дзяржава, а патрэбны Маскве (СССР) дадатковы голас у згаданай сусветнай арганізацыі.

Пасля свайго афармлення БІНіМ дапамог у друкаванні даведніка "Паказнік амерыканскіх арганізацй у выгнанні з СССР" (Directory of American Organizations of Exiles from the USSR, 1952 г.), падрыхтаваў некалькі мэмарандумаў аб стане беларускай групы ў ЗША для Бібліятэкі Кангрэсу ЗША і Інстытута Этнічных Даследаванняў у Вашынгтоне. Найбольш увагі прыцягнула канфэрэнцыя "Псыхалягічная стратэгія халоднае вайны", якая адбылася ў Вашынгтоне 22—23 лютага 1952 г. і дзе быў зачытаны беларускі даклад і пададзены ўдзельнікам канферэнцыі некалькі мэмарандумаў ад БІНіМ.

БІНіМ супрацоўнічаў таксама з Камісіяй Керстэна. Камісія была створаная Кангрэсам ЗША для аналіза ўздзеяння савецкай сістэмы на насельніцтва, культуру, эканамічны стан і г. д. Камісія Керстэна надавала вялікую ўвагу і нацыянальнаму пытаньню ў СССР. БІНіМ прадставіў даклад, у якім аналізавалася русіфікацыйная савецкая сістэма ў Беларусі.

У 1953 г. БІНіМ быў запрошаны кафедрай фізікі Калумбійскага ўніверсытэта на агляд і азнаямленне з найноўшым дзяржаўным камп'ютэрам.

Сувязь была наладжана з амерыканскімі ўніверсітэтамі. Піянерам супрацоўніцтва быў доктар Яўген Вярбіцкі. У апошнія гады свайго жыцця ён ўзначальваў дзяржаўную ваенную лабараторыю хімічнай апрацоўкі перахоўвання ежы. Доктар Яўген Вярбіцкі, напэўна, быў адзіным беларусам на зямлі, які меў у сябе крупінку Месяцу, уручаную яму і групе амерыканскіх хімікаў прэзідэнтам Рычардам Ніксанам у адзначэнне ўкладу ў падрыхтоўку палёту і высадкі амерыканскіх астранаўтаў на Месяцы ў 1969 г. У праграме

Apollo наш суайчыньнік быў адным з хімікаў, адказных за перахаванне мясных прадуктаў у “падарожжы” на месяц Apollo-13.

БІНіМ супрацоўнічаў з аддзеламі асветы, гістарычнымі таварыствамі, штатнымі грамадскімі коледжамі. Узаемадзеянне выяўлялася ва ўдзеле ў канферэнцыях, музейных выставах, семінарах настаўнікаў, дакладах у школах.

Удзел БІНіМ ў амерыканскіх і канадыйскіх канферэнцыях славістаў, бібліятэкараў, географаў, гісторыкаў і г.д. быў яшчэ адною галіною дзейнасці Інстытуту і сродкам пашырэння інфармацыі пра краіну. Сябры БІНІМ бралі ўдзел у некалькіх канфэрэнцыях у Белым Доме, якія прысвячаліся адукацыі ў ЗША і ролі нацыянальных груп у развіцці амерыканскай культуры.

Вельмі важным міжнародным кангрэсам быў кангрэс у Рыме ў красавіку 1990 г. Ён быў названы “Рым-I” і прысвечаны праблемам гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. На гэтую канфэрэнцыю былі запрошаныя навукоўцы з Беларусі: Адам Мальдзіс, Анатоль Грыцкевіч, а таксама пісьменьнік Васіль Быкаў. Беларуская дэлегацыя складалася з 10—12 асобаў. У наступных Кангрэсах прадстаўнікі БІНІМу былі гасцямі: “Рым-II” (Люблін, 1991), “Рым-III” (Камянец-Падольскі, 1992), “Рым-IV” (Гродна, 1993), “Рым-V” (Тракай, 1994).

Яшчэ адным накірункам дзейнасці Інстытутаз’яўляецца друкаваная прадукцыя БІНІМ. У 1970-х гг. БІНіМ распачаў выданне нумараванае серыі — “Беларускія пісьменнікі і паэты на эміграцыі”, прымаў удзел у англамоўным друку.

Ужо ў XXI ст. у выніку палітычнай эміграцыі з Беларусі ў замежжы сталі з’яўляцца і прынцыпова новыя арганізацыі. Важнай тэндэнцыяй апошніх гадоў стала імкненне да стварэння адзінай інфармацыйнай прасторы беларускага замежжа. Шмат беларускіх арганізацый замежжа сёння маюць свае інтэрнэт-сайты, выдаюць друкаваныя СМІ. Вялікую ролю адыгрывае і інфармацыйная дзейнасць ЗБС “Бацькаўшчына”, сайт якога, побач з бюлетэнем “Беларусы ў свеце”, ператвараецца ў каштоўны інфармацыйны рэсурс пра беларускае замежжа і для яго.

Знакамітым дзеячам беларусскага замежжа з’яўляецца Барыс Кіт (нар. у 1910 г.) – акадэмік міжнароднай Акадэміі астранаўтыкі, вучоны-фізік, аўтар даследванняў у сферы ракетнага паліва і касманаўтыкі. Б. Кіт актыўна займаецца дабрачыннай дзейнасцю, фінансуе беларускаемоўныя выданні за мяжой.

Духоўным лідарам беларусаў замежжа доўгі час быў Аляксандр Надсан (1926 – 2015). Акрамя святарскай дзейнасці айцец Аляксандр займаўся навукай – у 1971 г. заснаваў і быў нязменным кіраўніком беларускай бібліятэкі ім. Ф. Скарыны ў Лондане, займаўся даследваннямі кітабаў.

Да галоўных праблем беларускага замежжа можна аднесці згаданую вышэй змену пакаленняў і звязаны з ёй адыход у нябыт некаторых арганізацый на Захадзе. З аналагічнай праблемай праз некаторы час сутыкнуцца і беларускія асяродкі “новых” дыяспар. Ужо зараз шмат хто з іх удзельнікаў адзначае “паважны” ўзрост большасці сябраў і адсутнасць

цікавасці да грамадскага жыцця ў моладзі. У такіх умовах менавіта праца з моладдзю, пошук новых форм дзейнасці, развіццё нацыянальнай адукацыі могуць стаць дзейснымі сродкамі эфектыўнага пераадолення змены пакаленняў і захавання беларускіх арганізацый.

З адзначанай праблемай звязана праблема паступовага заняпаду беларускай адукацыі ў замежжы. Нешматлікія паўнавартасныя беларускія школы дзейнічаюць сёння ў Польшчы, Літве, Латвіі. У шэрагу асяродкаў іншых краін існуюць беларускія суботнія і нядзельныя школкі. Але агульную колькасць беларускіх навучальных устаноў у замежжы нельга назваць дастатковай, цягам апошніх дзесяцігоддзяў назіраецца устойлівая тэндэнцыя да іх заняпаду.

Сур’ёзнай праблемай з’яўляецца таксама адсутнасць спецыяльнай сістэмы вывучэння беларускага замежжа, яго гісторыі і сучаснасці. З гэтага вынікае немагчымасць эфектыўнага маніторынгу і прагназавання падзей і перспектываў развіцця беларускіх дыяспар, выкарыстання іх патэнцыялу для карысці беларускай нацыі.